ЗАСТАВАЙЦЕСЯ СА «ЗВЯЗДОЙ»!

Пачалася падпіска на II паўгоддзе 2009 года

Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)

Індэкс	на 1 месяц	на 3 месяцы	на 6 месяцаў
63850 (індывідуальны)	10600	31800	63600
63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	9990	29970	59940
63858 (ведамасны)	17050	51150	102300
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	15550	46650	93300

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

6 МАЯ 2009 г. СЕРАДА № 81 (26439)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

СМІ павінны весці канструктыўную інфармацыйную палітыку для кансалідацыі грамадства

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў прывітанне ўдзельнікам XIII Міжнароднай спецыялізаванай выставы «СМІ ў Беларусі» і IV Беларускага інфармацыйнага форуму.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ўдзельнікам трэба будзе абмеркаваць актуальныя пытанні развіцця сродкаў масавай інфармацыі ва ўмовах сусветнага эканамічнага крызісу. «Новыя выклікі часу вылучаюць на пярэдні план патрабаванні дакладна і аператыўна інфармаваць людзей аб змяненнях у эканамічнай сітуацыі, аб мерах, якія прымаюцца па пераадоленні цяжкасцяў. Задача ў тым, каб весці канструктыўную інфармацыйную палітыку, накіраваную на кансалідацыю грамадства, згуртаванне сілаў у мэтах аптымальнага вырашэння праблем», — гаворыцца ў прывітанні. Менавіта таму, лічыць Прэзідэнт, так неабходны сёння высокая сацыяльная адказнасць журналістаў за свае словы, узважаная грамадзянская пазіцыя і сапраўдны прафесіяналізм кожнага, хто вядзе размову з чытачом, слухачом, тэлегледачом.

На думку кіраўніка дзяржавы, у год 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў найважнейшы абавязак СМІ — данесці да шырокай аўдыторыі лёсаноснае значэнне гэтай даты, гістарычную праўду аб гераізме народа. «Разлічваю, што правядзенне выстаўкі і форуму будзе садзейнічаць пашырэнню медыйнай прасторы, стане чарговым этапам ва ўмацаванні ўзаемадзеяння Беларусі з замежнымі партнёрамі ў інфармацыйнай сферы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Фота БЕЛТА.

Учора ў Нацыянальным выставачным цэнтры «Белэкспа» пачала сваю работу XIII Міжнародная спецыялізаваная выстава «СМІ ў Беларусі». Сёлета яна прысвечаная 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, а таксама Году роднай зямлі, абвешчанаму ў нашай краіне. Таму інтэрнацыянальны журналісцкі форум аб'ядноўвае абедзве гэтыя тэмы — і ўсіх без выключэння экспанентаў — пад патрыятычным дэвізам «СМІ для роднай зямлі».

Выстава, дарэчы, прымае гэтымі днямі гасцей з дзесяці краін — свае экспазіцыі дэманструюць Расія, Украіна, Латвія, Азербайджан, Польшча, Францыя, Ізраіль, Кітай, Швейцарыя, Вялікабрытанія; акрамя таго, знайшлося асобнае месца і для мноства выданняў беларускай дыяспары.

БЕЗ МЕЖАЎ У ЧАСЕ І ПРАСТОРЫ

...Нягледзячы на інтэрнацыянальны склад удзельнікаў, ці не галоўная адметнасць сёлетняй выставы — сціранне звыклых межаў. Толькі тут, да прыкладу, Бранская вобласць арганічна суседнічае з Мінскай, Ніжагародская — з Чарнігаўскай, а Ізраіль — з Кітаем. Тут раўнапраўныя друкаваныя і электронныя СМІ, дзіцячыя і ваенныя выданні, рэгіянальныя і рэспубліканскія... Тут адмысловая выстава ў выставе — экспанаты стэнда «Беларуская журналістыка ваенных гадоў», прадстаўленага музеем Вялікай Айчыннай вайны — выклікае ў наведвальнікаў не меншую цікавасць, чым самыя сучасныя мультымедыйныя прэзентацыі тэлеканалаў і інтэрнэт-сайтаў. Тут студэнт журфака без усякіх папярэдніх дамоўленасцяў свабодна можа задаваць пытанні міністру інфармацыі, бо ўсе мы — калегі, што асабліва выразна адчувалася падчас адкрыцця форуму — у Дзень друку.

Пасланне кіраўніка беларускай дзяржавы ўдзельнікам XIII Міжнароднай спецыялізаванай выставы «СМІ ў Беларусі» і IV Беларускага інфармацыйнага форуму агучыла першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Наталля Пяткевіч. «На некалькі дзён у годзе канстытуцыйны прынцып падзелу ўладаў парушаецца, і ўладу ў свае рукі цалкам бярэ «чацвёртая галіна» — СМІ, наладжваючы ў сталіцы нашай радзімы разнастайныя мерапрыемствы — інтэлектуальныя, дыскусійныя альбо прэзентацыйныя, як сёння», — з гэтымі словамі Наталля Уладзіміраўна выказала місію па адкрыцці чарговага журналісцкага форуму, з задавальненнем пабыўшы на ім проста пачэсным госцем і не абышоўшы ўвагай іноўдны стэнд.

КАНКУРЭНТЫ? ПАРТНЁРЫ!

...З прафесійным святам павіншавалі калег міністр інфармацыі Беларусі Уладзімір Русакевіч і міністр па справах друку і інфармацыі ўрада Маскоўскай вобласці Сяргей Маісееў. Зрэшты, выстава СМІ — гэта заўжды не толькі свята, не толькі сустрэчы з калегамі і наладжванне новых дзелавых кантактаў, не толькі яскравыя прэзентацыі і прыемныя сюрпрызы для наведвальнікаў. Гэта яшчэ і своеасаблівы экзамен, справаздача, якую прадстаўнікі розных СМІ трымаюць штогод перад чытачамі, слухачамі, гледачамі, распавядаючы пра тое, што зроблена за год і што запланавана ў перспектыве. На думку Уладзіміра Русакевіча, сёлетні экзамен, хоць і адбываецца ён у «нешчаслівы» трынаццаты раз, беларускія СМІ здалі вельмі добра:

— Мне падабаецца, што ў гэты няпросты час сродкам масавай інфармацыі ўдаецца стварацъ і падтрымліваць атмасферу жыццярадаснасці, якая пануе ў тым ліку і на форуме.

Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Наталля Пяткевіч, са свайго боку, адзначыла іншы момант — спалучэнне на цяперашнім медыяфоруме добрага партнёрства і здаровай канкурэнцыі, ад чаго ў рэшце рэшт выйграе і якасць СМІ, і канчатковыя спажыўцы інфармацыі.

У якіх беларускіх сродкаў масавай інфармацыі гэта атрымліваецца лепш, сведчаць, напрыклад, вынікі Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара». Сёлета больш як два дзясяткі артыкулаў-«літарак», якія па традыцыі ўручаюцца ў першы дзень работы выставы, знайшлі сваіх гаспадароў ужо ў 5-ы раз. (На момант здачы нумара ў друк імёны пераможцаў яшчэ не былі вядомыя. — **Аўт.**)

Што да партнёрства — яго асабліваści ў сучасных умовах будуць абмяркоўваць удзельнікі Беларускага інфармацыйнага форуму «СМІ ў перыяд глабальнага эканамічнага крызісу. Фарміраванне сацыяльных установак насельніцтва». Форум, партнёрамі якога з'яўляюцца Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы, Выканаўчы камітэт СНД, Еўразійская акадэмія тэлебачання і радыё, Беларускі саюз журналістаў пры падтрымцы офіса АБСЕ ў Мінску, адкрыецца сёння і пройдзе цягам двух дзён у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

ДА ЧЫТАЧОЎ — З ЛЮБОЎЮ

Гэты прынцып, заяўлены нашай газетай даўным-даўно, цалкам выконваецца і падчас цяперашняй выставы, у чым ахвотныя маглі пераканацца яшчэ ўчора. Для сваіх падпісчыкаў, старых і новых сяброў, як і ўвогуле для ўсіх, хто зазірнуў 5 мая на медыяфорум, «Звязда» падрыхтавала музычную прэзентацыю з удзелам юных артыстаў з эстраднай студыі «Наталі». Што можа быць больш кранальным, чым дзіцячыя спевы — асабліва калі яны шчырыя, высокапрафесійныя і — звярніце ўвагу — на роднай мове?

Каму мала падалося ежы духоўнай, маглі пакаштаваць і зямной — на стэндзе «Звязды» ўсе дні працы выставы адбываецца дэгустацыя мёду. Ласуйцеся на здароўе! А каб паклапаціцца пра здароўе яшчэ лепш — зноў жа, не абмінайце стэнд «Звязды», дзе ў кожнага ахвотнага ёсць магчымасць памераць ціск, вагу і рост, а таксама атрымаць кансультацыі дактароў — учора, напрыклад, іх рабілі тэрапеўт, валеолаг, хірург, сёння, **6 МАЯ,** карысныя парады можна атрымаць у эндакрынолага (спецыяліст будзе працаваць у нас з 11 да 12 гадзін), дыетолага (12.00—13.00), сямейнага псіхолага (14.00—16.00), кардыёлага (16.00—17.00). Як не толькі захаваць, але і ўмацаваць здароўе, раскажуць і пакажуць фітнэс-інструктар Кірыл Дарафееў, прадстаўнікі Беларускай федэрацыі кёкусенкай будо каратэ, удзельнікі танцавальнага ансамбля «Глорыя». Не раскрываючы ўсіх сакрэтаў другога дня выставы, упэўнена абяцаем — будзе цікава. Прыходзьце! Выстава працягне сваю работу да 8 мая.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Юр'я ў Хільчыцах

«Карагод» — сімвал Юр'я, з ім дагэтуль сустракаюць вясновае свята на Палессі ў Жыткавіцкім раёне. Настаўнік гісторыі, жыхар вёскі Хільчыцы і даўні падпісчык «Звязды» Васіль Ануфрыевіч ШРУБ захоўвае традыцыю продкаў і штогод з гонарам нясе па вуліцах свайго населенага пункта сімвал роду, зямлі і жыцця.

(Працяг тэмы на 8-й стар.)

Актуальна

Розныя СМІ для роднай зямлі

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Ва Урадзе

«Хваробы» страхавой галіны — Br695 млн за... прыбіральню

Прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі лічыць неабходным максімальна задзейнічаць патэнцыял страхавой галіны рэспублікі з тым, каб гэтая сфера была не толькі дзейсным інструментам па абароне інтарэсаў насельніцтва краіны, але стала і найважнейшай крыніцай росту ўнутранага даходу краіны. Цяперашняя ж дзейнасць страхавых кампаній кіраўніка Урада не задавальняе. Больш за тое, Сяргей Сідорскі на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі, на якім ішла гаворка аб выніках выканання рэспубліканскай праграмы развіцця страхавой дзейнасці на 2006—2010 гады, выступіў з жорсткай крытыкай, адрасаванай у бок страхаўшчыкоў.

Узгадаўшы пра тое, што дзяржава істотна падтрымала гэтыя кампаніі, у статутны фонд якіх было накіравана больш за трыльён рублёў, Сяргей Сідорскі запытаўся, а дзе ж адпаведная аддача ад укладзеных грошай. Так, нягледзячы на ўсе зробленыя захады, летась доля страхавання ў валавым унутраным прадукце Беларусі склала ўсяго 0,73 працэнта ад запланаваных 1,09. Сёлета таксама невядома, ці будзе выкананы гэты паказчык. Звярнуўшы ўвагу прысутных на тое, што па выніках леташняга года збор страхавых прэмій на душу насельніцтва ў Казахстане і Расіі склаў адпаведна 71 і 227 долараў, а ва Усходняй Еўропе 229 долараў, Сяргей Сідорскі зазначыў, што Беларусь адстае ў разы ад гэтых краін. Між іншым, па выніках 2008 года ў рэспубліцы гэты паказчык складаў усяго 44 долары. Атрымліваецца, што на страхавым рынку нашай рэспублікі яшчэ шмат чаго не зроблена. «Вы працуеце горш за ўсіх на постсавецкай прасторы, не кажучы аб развітых краінах, дзе на душу насельніцтва збор страхавых прэмій — 600 долараў», — адрасаваў крытыку страхаўшчыкам прэм'ер.

Адзначаючы, што ў беларускіх страхаўшчыкоў ёсць значныя рэзервы па развіцці асобных відаў страхавання, Сяргей Сідорскі зазначыў, што найбольш трэба дадаць, напрыклад, у накапляльным страхаванні, ва ўмовах фінансава-эканамічнага крызісу ў страхаванні экспартных рызык.

На думку прэм'ера, асобная гутарка — наколькі адказна падыходзяць да сваёй працы кіраўнікі некаторых страхавых кампаній. Сяргей Сідорскі лічыць, што былі б зусім іншыя вынікі рэалізацыі праграмы, «калі б усе працавалі напружана і думалі як выконваць планы». «А так, — заўважыў прэм'ер, — некаторыя з іх жывуць у сваё задавальненне, збіраюцца і з сем'ямі ездзяць на адпачынак на службовых машынах, арганізоўваюць рэстаранныя вечарынкі за дзяржаўны кошт. Вось і дасягаюць такіх вынікаў». Прычым падобныя факты не з разраду выключэнняў — яны не адзінкавыя. Паводле слоў кіраўніка Урада, Камітэт дзяржкантролю прадставіў шмат фактаў працы кіраўнікоў асобных страхавых кампаній менавіта на сябе. Сяргей Сідорскі таму не выключае і таго, што, магчыма, на чале гэтых арганізацый трэба паставіць іншых людзей. «Грошай мора, і яны безспраздачныя, — падкрэсліў ён. — Кіраўнікі накіроўваюць іх куды хочуць — на офісы, машыны...» А старшыня Камітэта дзяржкантролю Зянон Ломаць услед за прэм'ерам праінфармаваў, куды, да прыкладу, яшчэ часам ідуць дзяржаўныя грошы ў асобных страхаўшчыкоў. Так, адна дзяржаўная страхавая кампанія на сваёй базе адпачынку пабудавала прыбіральню за... 695 мільёнаў рублёў, тэнісны корт за 295 мільёнаў. Прэм'ер-міністр паведаміў, што на падставе такіх матэрыялаў, якія сведчаць аб розных фактах працы «на сябе», Камітэту дзяржкантролю даручана Прэзідэнтам правесці праверкі на шэрагу страхавых арганізацый.

Між іншым, звяртаючыся да першага намесніка міністра фінансаў Уладзіміра Амарына, які курыруе страхавую галіну, Сяргей Сідорскі прапанаваў: «пасадзіце кіраўнікоў страхавых кампаній, калі яны нічога не зрабілі, на хлеб і ваду, на бюджэтныя расходы і прымусьце іх працаваць. Тады яны зразумеюць, што трэба працаваць на дзяржаву». Падчас пасяджэння, дарэчы, Сяргей Сідорскі адзначыў, што ў генеральнага дырэктара адной з дзяржаўных страхавых кампаній зарплата вышэйшая, чым у прэм'ер-міністра: паводле слоў самога кіраўніка кампаніі, за студзень гэтага года яму было налічана зарплаты 4,5 мільёна рублёў.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Мікалай ЗАЙЧАНКА:

«Не бачу ніякіх падстаў для правядзення разавай дэвальвацыі рубля»

Міністр эканомікі Беларусі Мікалай Зайчанка, адказваючы на пытанне карэспандэнта «Звязды», не выключыў, што тарыфная стаўка I разраду ў рэспубліцы будзе павышана ў другім квартале, «але не раней за 1 чэрвеня». На сустрэчы з журналістамі кіраўнік міністэрства заўважыў, што пытанне аб павышэнні зарплаты цяпер разглядаецца. Ён паведаміў, што за першы квартал рэальная зарплата ў параўнанні з адпаведным леташнім перыядам павялічылася на 3,6 працэнта. У бюджэтнай сферы паказчык крыху меншы, таму пытанне аб павышэнні тарыфнай стаўкі I разраду з'яўляецца актуальным і разглядаецца сур'ёзна.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

У. Сямашка ўзначаліць беларускую дэлегацыю на саміце «Усходняга партнёрства»

Першы намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Уладзімір Сямашка ўзначаліць беларускую дэлегацыю на саміце ініцыятывы «Усходняе партнёрства» ЕС у Празе. Аб гэтым паведаміла, адказваючы на пытанні прадстаўнікоў СМІ, намеснік начальніка ўпраўлення інфармацыі МЗС Беларусі Марыя Ваньшына.

«Як і планавалася, кіраўнік дзяржавы прыняў рашэнне аб складзе дэлегацыі на саміце. Паколькі змест «Усходняга партнёрства» прыкладны і ахоплівае сацыяльна і эканамічна значныя напрамкі супрацоўніцтва (гандаль, энергетыка, транспарт, міграцыя і г.д.), яго курыраванне аднесена да кампетэнцыі ўрада. Адпаведна, афіцыйная беларуская дэлегацыя была сфарміравана ў складзе першага намесніка прэм'ер-міністра Уладзіміра Сямашкі і міністра замежных спраў Сяргея Мартынава», — паведаміла Марыя Ваньшына.

Яна адзначыла, што Беларусь зыходзіць з неабходнасці «роўнага і недыскрымінацыйнага ўдзелу ва «Усходнім партнёрстве» ўсіх шасці адпаведных краін рэгіёна». Рэалізацыя ініцыятывы павінна служыць умацаванню адзінства еўрапейскага кантынента без утварэння новых раздзяляльных ліній і сфер уплыву, дадала Марыя Ваньшына.

Запрашэнне на саміт ініцыятывы «Усходняга партнёрства» ЕС было перададзена міністрам замежных спраў Чэхіі, якая старшынстве ў ЕС, асабіста Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку.

БЕЛТА.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 6.05.2009 г. (для б/н разлікаў)

▼ 1 долар ЗША	2 804,00
▼ 1 еўра	3 739,98
1 латвійскі лат	5 286,08
1 літоўскі літ	1 085,56
1 чэшская крона	141,18
1 польскі злоты	859,87
▲ 1 расійскі рубель	85,45
1 украінская грыўня	351,38

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	32,8146
10 UAH	41,1211
1000 BYR	11,6736
EUR	43,8501

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

НЯБЕСНЫЯ ПАТРУЛІ

Жывая зямля

фотарэпартаж

амаль з гарачага пункта

Вясновa-летняя небяспека лясных пажараў і ўзгаранняў на балотах і тарфяніках прывычыла паветраную ахову лясоў краіны заўсёды знаходзіцца ў рэжыме чакання і поўнай гатоўнасці. Сёлетняя працяглая адсутнасць дажджоў ужо стала падставай для шматлікіх пажарышчаў літаральна па ўсёй тэрыторыі краіны. Нябесныя патрулі штодня дасылаюць на зямлю дзясяткі, а то і сотні паведамленняў пра ўзгаранні, яны першымі апынаюцца над небяспечнымі пунктамі. Сёння цяжка ўявіць ахову лесу без паветранай аховы, хоць праца спецыялістаў Беллесавія з зямлі амаль нябачная. Назіраць яе ўвачавідкі можна толькі на тактыка-спецыяльных вучэннях, якія нядаўна прайшлі на базе мазырскага авіяаддзялення перад удзельнікамі рэспубліканскага семінара Міністэрства лясной гаспадаркі. Па сталай традыцыі спецыялісты МНС Беллесавія прадэманстравалі ўзаемадзеянне наземных і паветраных сілаў пажаратушэння з выкарыстаннем авіятэхнікі і пажарных-дэсантнікаў.

Лётнае поле пад Мазыром ператварылася ў вялікую дэманстрацыйную пляцоўку сучаснай супрацьпажарнай тэхнікі, сродкаў тушэння, аснашчэння і экіпіроўкі пажарных. І яшчэ яно стала месцам незвычайнай паветранай баталіі. У неба ўзняліся патрульныя самалёты Іл-104 і Ан-2, якімі сёння забяспечаны падраздзяленні Беллесавія. На поўным лёце «кукурузнікі» скідвалі на агромністае вогнішча тоны вады. З борта верталёта Мі-2 дэманстравалі спуск дэсантнікі, якімі кіруе старшы інструктар Мікалай Ціханаў. Калі разгараецца лясны пажар і наземная пажарная служба не паспявае своечасова ўтаймаваць стыхію, першымі супраць агню ідуць адважныя спецыялісты гэтага падраздзялення.

Пажарна-дэсантная група «Белавія», якую трэніруе і ўзначальвае старшы інструктар Мікалай ЦІХАНАЎ (другі справа).

Дырэктар дзяржаўнага прадпрыемства МНС «Беллесавія» Аляксей Пшонка паведаміў, што на вучэннях важна было прадэманстраваць зладжанасць усіх груп удзельніц ліквідацыі небяспекі — лётчыкаў, лётчыкаў-назіральнікаў, дэсантнікаў і наземнай тэхнічнай авіяслужбы.

«Не зважаючы на эканамічны крызіс, тэхнічнае забеспячэнне — самалёты, верталёты, экіпіроўка і інструмент дэсанта — на добрым узроўні, — кажа кіраўнік Беллесавія. — Мы выконваем усе пастаўленыя перад намі МНС задачы і дамовы, заключаныя з лясной гаспадаркай. Спадзяюся, прадстаўнікі лясной гаспадаркі пераканаліся, што сярод першых памочнікаў у захаванні лясных багаццяў краіны — Беллесавія».

Ледзь завяршыліся паказальныя вучэнні і яшчэ не паспелі астыць рухавікі, як самалёты зноў узняліся ў паветра — па штодзённых маршрутах-назіраннях і на... «баявыя» заданні. Бо цяпер вельмі небяспечны стан у сувязі з працяглай гарачынёй і несанкцыянаванымі падпаламі сухой травы. Прырода просіць абароны, дапамогі. «Беллесавія» першай адгукаецца на гэты покліч.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

Мазырскі раён.

(Заканчэнне на 8-й стар.)

Беларусі і Азербайджану неабходна шукаць новыя сферы для пашырэння супрацоўніцтва

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 5 мая на сустрэчы з першым намеснікам прэм'ер-міністра Азербайджана Ягубам Абдулой аглы Эюбавым.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў Беларусі і Азербайджана «няма закрытых тэм». У краін ёсць добрыя планы, рэалізуюцца пэўныя праекты, у прыватнасці, па стварэнні зборачных вытворчасцяў беларускай тэхнікі ў Азербайджане. «Нам ёсць аб чым пагаварыць, улічваючы, што тавараабарот $120 млн — гэта мізэр, калі мець на ўвазе існуючы патэнцыял. Сёння мы абмяркуем на прамежкавым этапе стан нашых гандлёва-эканамічных адносінаў», — сказаў кіраўнік дзяржавы. У Азербайджане створаны зборачныя вытворчасці трактароў і грузавых аўтамабіляў, па беларускай тэхналогіі адноўлены оптыка-механічны завод. Цяпер прапрацоўваецца магчымасць арганізацыі зборкі беларускіх аўтакранаў, ліфтаў, вытворчасць лякарстваў, люстранога палатна і аконных блокаў. Аляксандр Лукашэнка павіншаваў кіраўніцтва Азербайджана з поспехам на рэферэндуме. Паводле слоў першага віцэ-прэм'ера, апошні візіт Прэзідэнта Беларусі ў Азербайджан садзейнічаў паглыбленню супрацоўніцтва паміж краінамі. Ягуб Эюбаў запэўніў, што азербайджанскі бок будзе імкнуцца да выканання таго, што было намечана прэзідэнтамі. Ён таксама перадаў добрыя і цёплыя пажаданні беларускаму народу і Аляксандру Лукашэнку ад Прэзідэнта Азербайджана Ільхама Аліева.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ЗНАМЕНКОВСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ЛОГОЙСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельных участков для строительства и обслуживания жилого дома

Лот № 1 — земельный участок **№ 1** площадью 0,1994 га, расположенный по адресу: **д. Знаменка**, стартовая цена **2230100** белорусских рублей;

Лот № 2 — земельный участок **№ 5** площадью 0,2500 га, расположенный по адресу: **д. Знаменка,** стартовая цена **2796000** белорусских рублей;

Лот № 3 — земельный участок площадью 0,1500 га, расположенный по адресу: **д. Карцовщина**, стартовая цена **1340630** белорусских рублей;

Лот № 4 — земельный участок **№ 3** площадью 0,1913 га, расположенный по адресу: **д. Пархово**, стартовая цена **1817530** белорусских рублей.

Размер задатка — **10 %** стартовой цены участка проплатить на р/счет Знаменковского сельисполкома № 3600619050053 ф-л 611 АСБ «Беларусбанк», 518, г. Логойск, УНП 600181564, код платежа 04901.

Порядок проведения аукциона оговорен в Положении о его проведении.

Аукцион состоится **5 июня 2009 года в 10.00** по адресу: д. Знаменка Логойского района Минской области. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **до 4 июня 2009 г. до 13.00** по вышеуказанному адресу.

Телефоны: 8 017 74 59335, 59336, 143 5553.

УНП 600181564.

ВЫХАД З КРЫЗІСУ ДЛЯ БЕЛАРУСІ — У ДЫВЕРСІФІКАЦЫІ ЗНЕШНЯГА ГАНДЛЮ

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 4 мая ў інтэрв'ю інфармацыйнаму агенцтву «Рэйтэр», паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

Паводле слоў Прэзідэнта, высокі эканамічны рост у Беларусі быў у мінулым і пазамінулым гадах. «Мы вельмі добра і дынамічна развіваліся: 10-11 працэнтаў ВУП да таго, ужо высокага ўзроўню. І калі гаварыць аб прыросце эканомікі ў гэтым годзе да ўзроўню мінулага, добрага года, то за першы квартал ён склаўся 1,5 працэнта. Але гэта не той рост ВУП, які мы планавалі. Гэта амаль ніякі рост. Калі мы прыраставалі да 5-6 працэнтаў за квартал, а да канца года нарошчваліся да 10 працэнтаў, то, вядома, гэта не рост», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, што «чорнае крыло» крызісу сур'ёзна зачапіла і Беларусь. «У нас няма праблем з вытворчасцю. Мы не гаворым аб тым, што ў нас не хапае рэсурсаў, абаротных сродкаў для вытворчасці. Нас ударыў балюча экспартны складальнік. Гэта значыць, тавары, якія мы вырабляем, сталі менш купляцца, таксама, як і вашы, таксама, як ва ўсім свеце ў сувязі са скарачэннем попыту», — сказаў ён і падкрэсліў, што паколькі беларуская эканоміка экспартаарыентаваная, тут узніклі пэўныя праблемы.

«Але я лічу, што выхад з гэтага ў нас па-ранейшаму ляжыць у дыверсіфікацыі знешняга гандлю. Бо мы практычна палавіну прадаём вам, Еўрапейскаму саюзу, палавіну прадаём Расіі. Ну, а што астатнія рынкі? На іх прыпадае менш як 10 працэнтаў нашага тавараабароту. Ці ж гэта нармальна? Ненармальна», — лічыць Прэзідэнт. «Таму мы пачалі выходзіць на іншыя рынкі. І не без поспеху. Наша прадукцыя якасная, а па цане вы нам не канкурэнты — заходняя прадукцыя ў 2, 3, а то і ў 5 разоў даражэйшая, чым беларуская. Гэта наша перавага, і мы спрабуем выкарыстоўваць гэты фактар. Мы ідзём у Лацінскую Амерыку (у разы павялічылі тавараабарот не толькі з Венесуэлай, але і з Бразіліяй, Уругваем, іншымі дзяржавамі. Мы ідзём у Паўночную Амерыку, у тым ліку ў ЗША (актыўна спрабуем супрацоўнічаць з імі ў сферы эканомікі), не кажучы ўжо аб Азіі і, асабліва, аб Афрыцы», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Паводле яго слоў, таму Беларусі ўдаецца неяк трымацца на плаву, хоць гэта вельмі-вельмі складана. «Ёсць праблемы, звязаныя з няпоўным рабочым днём, на некаторых прадпрыемствах. У нас не так дынамічна расце зарплата, як гэтага хацелася б, і іншыя сацыяльныя дапамогі. Увогуле, мы пачалі эканоміць, і вельмі сур'ёзна. Праблем хапае, але пакуль яшчэ мы трымаемся на плаву і вельмі акуратна адсочваем сітуацыю ў свеце», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Гаворачы пра беспрацоўе, Прэзідэнт падкрэсліў, што пакуль яно ў Беларусі прыкладна на ўзроўні мінулых гадоў.

Беларусь бачыць саюз з Расіяй толькі як саюз раўнапраўных дзяржаў.

«Мы бачым гэты саюз толькі як саюз раўнапраўных дзяржаў. Калі гаварыць аб асноўных прынцыпах любога саюзнага ўтварэння, то без раўнапраўнага фундаменту ніякага саюза быць не можа. Калі гэты прынцып будзе пакладзены ў аснову, тады гэты саюз будзе развівацца, і, магчыма, ён атрымае развіццё настолькі, наколькі гэтага хочуць народы, і перш за ўсё народ Расійскай Федэрацыі. Сказаць, што мы атрымалі такі раўнапраўны саюз, я не сказаў бы. Нам яшчэ доўга ісці да гэтага і расці, калі мы будзем у гэтым напрамку рухацца», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым ён адзначыў, што бакі ўжо многага дасягнулі. Фактычна рускія і беларусы не адчуваюць, што жывуць у розных дзяржавах. Створана нарматыўная база ў адукацыі, ахове здароўя, эканоміцы і іншых сферах. Разам з тым ёсць пэўныя праблемы. «Расійская Федэрацыя залішне займаецца пратэкцыянісцкімі мерамі, фактычна блакіруючы пастаўку тавараў з рэспублік былога Савецкага Саюза, у тым ліку з Беларусі, на расійскі рынак па розных прычынах», — растлумачыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка таксама сказаў: «Мы ў вельмі цесных дружалюбных і дагаворна-прававых адносінах з Расійскай Федэрацыяй. Мы падпісалі з Расіяй дагавор аб саюзным будаўніцтве і ні на ёту не адыдзем ад гэтага дагавора, нават калі ў Расіі захоўваюцца некаторыя тэндэнцыі адыходу ад тых пагадненняў, якія мы падпісалі».

Напрыклад, Расія выйшла з дагавора аб роўных умовах гаспадарання для суб'ектаў краін. «Калі мы будуем Саюзную дзяржаву, то якая розніца паміж прадпрыемствамі Расіі і Беларусі? Не павінна быць ніякай. Тут павінна быць свабоднае перамяшчэнне тавараў, паслуг, капіталу. І цэны павінны фарміравацца ў залежнасці ад попыту і прапанавання. Расія выйшла з гэтага дагавора, адышла ад прынцыпаў роўнавялікіх цэнаў для нашых прадпрыемстваў. Гэта падрывае асновы саюзнага будаўніцтва. У нас бязмытная прастора, а Расія ўвяла на нафту мытную пошліну. Гэта, зразумела, не садзейнічае нашаму большаму адзінству», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт заявіў: «Я думаю, што Расійскай Федэрацыі трэба было займацца больш уважаную і акуратную пазіцыю ў адносінах да эканомікі Беларусі. Калі ў нас дрэнныя адносіны ў эканоміцы, то не трэба разлічваць, што ў палітыцы, абароне і іншых пытаннях у нас будуць адносіны лепшыя».

Але калі гаварыць аб дыялогу прэзідэнтаў Беларусі і Расіі, эфектыўнасці вырашаемых пытанняў, прымаемых рашэнняў, метадалогіі іх прыняцця, хуткасці, то прагрэс тут відавочны. «Але вось рэалізацыя вымушае жадаць лепшага», — сказаў Прэзідэнт. «На міжасобасным узроўні ў нас няма ніякіх праблем з кіраўніцтвам Расійскай Федэрацыі», — адзначыў ён.

Што датычыцца еўрапейскага вектара, то тут Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Мы такімі катэгорыямі цяпер нават на мыслім, можа калі-небудзь Беларусь і стане членам Еўрапейскага саюза. Мы пра гэта не думалі, але нам і не прапаноўвалі гэтыя варыянты. Таму і абмяркоўваць пытанне неяк нават няёмка», — адзначыў ён.

Удзел у ініцыятыве «Усходняе партнёрства» дасць Беларусі магчымасць збалансаваць сваю знешнюю палітыку.

Прэзідэнт канстатаваў, што ў апошнія гады Беларусь больш «пайшла» на Усход, у разы павялічыўшы тавараабарот з Расіяй, Кітаем, В'етнамам, іншымі дзяржавамі. «Для нас вельмі важна, што мы нарэшце маем магчымасць збалансаваць нашу знешнюю палітыку», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

У той жа час Аляксандр Лукашэнка заявіў, што ўдзел Беларусі ў гэтай еўрапейскай ініцыятыве не трэба звязваць з нейкім разваротам або паваротам у чыйсьці бок. «Тут няма ніякіх выпадаў супраць каго б там ні было, — сказаў беларускі лідар. — Мы не збіраемся ўдзельнічаць у «партнёрстве», адварочваючыся або паварочваючыся спінай да Расіі». Больш таго, паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, Беларусь прапанавала ў некаторыя праекты «Усходняга партнёрства», якія распрацоўваюцца, уключыць Расійскую Федэрацыю. Прэзідэнт адзначыў, што «калі нехта задумае зрабіць «Усходняе партнёрства» антырасійскім, той абавязкова прайграе, мэтаў сваіх не даб'ецца», і дадаў, што «калі там будуць сустракацца ворагі Расіі, то Беларусі там рабіць няма чаго».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь ва «Усходнім партнёрстве» цікавіць перш за ўсё «прагматычная, практычная частка». На думку Прэзідэнта, і для Еўропы вельмі важна, што ва «Усходнім партнёрстве» будзе ўдзельнічаць Беларусь, паколькі «мы вельмі многае можам прапанаваць еўрапейцам», пачынаючы ад пытанняў міграцыі да паставак, транзіту энергарэсурсаў з Расійскай Федэрацыі.

Пры гэтым Прэзідэнт лічыць, што запрашэнне ўдзельнічаць у дыялогу з Еўропай не менш важна, чым сам змест «Усходняга партнёрства». «Што датычыцца нашых прапаноў, яны будуць агучаны кіраўніком дэлегацыі на саміце па «Усходнім партнёрстве». Гэта першая сустрэча еўрапейцаў у рамках «Усходняга партнёрства», і прапановы ўжо знаходзяцца ў самім змесце гэтай ініцыятывы. Таму трэба не столькі нешта новае прапанаўваць, колькі абмеркаваць саму ідэю «Усходняга партнёрства», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка не схільны лічыць запрашэнне да ўдзелу ва «Усходнім партнёрстве» прарывам у Еўропу, паколькі «Еўропа даўно павярнулася да Беларусі ў плане эканомікі».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Беларусь праводзіць шматвектарную знешнюю палітыку. «Што датычыцца, па-першае, балансавання Беларусі паміж Захадам і Усходам. Хочаце вы гэта называць «балансаваннем» Беларусі паміж Захадам і Усходам, калі ласка, я не супраць. Хачу задаць рытарычнае пытанне: калі мы знаходзімся паміж Усходам і Захадам, на скрыжаванні гэтых шляхоў, вы на маім месцы якую б палітыку праводзілі? Мы вымушаны праводзіць шматвектарную знешнюю палітыку», — сказаў Прэзідэнт. Паводле яго слоў, Беларусі ёсць чаму навучыцца і ў краін Блізкага Усходу, скандынаўскіх краін, краін Міжземнамор'я і іншых. «Калі гэта балансаванне, то гэта таксама не зусім дрэнна. Калі гэтага балансу няма, то ні ў эканоміцы, ні ў палітыцы, ні ў грамадскім жыцці толку не будзе. Таму наўрад ці варта мяне папракаць у тым, што я спрабую збалансаваць вектары знешняй палітыкі дзеля таго, каб нармальна складвалася ўнутраная сітуацыя ўнутры нашай дзяржавы, каб яна захоўвалася такой, якая яна ёсць», падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

БЕЛТА.

Калектыў фонду «Мінскаблмаёмасць» выказвае спачуванне родным і блізкім ПАДСТРЫКАЧ Наталлі Іванаўны, начальніка фінансава-эканамічнага ўпраўлення Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь, у сувязі з яе смерцю.

Калектыў фонду «Гроднааблмаёмасць» смуткуе ў сувязі са смерцю ПАДСТРЫКАЧ Наталлі Іванаўны, начальніка фінансава-эканамічнага ўпраўлення Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь, і выказвае глыбокае спачуванне родным і блізкім нябожчыцы.

А. Лукашэнка і В. Юшчанка сустрэнуцца 6 мая ў Гомелі

6 мая ў Гомелі адбудзецца сустрэча прэзідэнтаў Беларусі і Украіны Аляксандра Лукашэнкі і Віктара Юшчанкі, у ходзе якой будуць абмеркаваны актуальныя пытанні двухбаковага супрацоўніцтва, а таксама міжнародны парадак дня. Кіраўнікі дзяржаў прадоўжаць дыялог, пачаты ў студзені гэтага года ў Чарнігаве.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

«Не бачу ніякіх падстаў для правядзення разавай дэвальвацыі рубля»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Характарызуючы вынікі развіцця эканомікі краіны за першы квартал, міністр падкрэсліў, што хоць сітуацыя і застаецца складанай, тым не менш, яна падкантрольная і кіраваная. Мікалай Зайчанка нагадаў, што прырост валавога ўнутранага прадукту ў першым квартале склаў 1,1 працэнта. «Мы застаёмся адной з нямногіх краін, у тым ліку на постсавецкай прасторы, — заўважыў ён, — дзе захоўваецца станоўчая дынаміка росту эканомікі». Паводле яго слоў, сусветны крызіс па-рознаму паўплываў на галіны айчыннай эканомікі. А найбольш уразлівая да яго прамысловасць, хоць і тут сітуацыя неадназначная. Ёсць такія галіны, у прыватнасці, паліўная, якія захоўваюць станоўчую дынаміку, а вось найбольш моцны ўплыў крызіс аказаў на машынабудаванне — аўтамабілебудаванне, трактара- і сельгасмашынабудаванне. У апошніх назіраецца найбольш істотны спад — каля 30 працэнтаў, паколькі гэтыя галіны на 70 працэнтаў арыентаваныя на знешні рынак. Гаворачы ж пра тое, за кошт якіх галін ёсць магчымасці падтрымання станоўчай дынамікі эканамічнага развіцця краіны, Мікалай Зайчанка, перш за ўсё, прыгадаў сельскую гаспадарку. Ён заўважыў, што станоўчая дынаміка ВУП дасягнутая і дзякуючы таму, што ў сельскай гаспадарцы аб'ём вытворчасці прадукцыі павялічыўся на 6,3 працэнта, а за першае паўгоддзе чакаецца, што рост складзе 106,5-107 працэнтаў. Важнае значэнне надаецца і будаўніцтву, жыллёваму будаўніцтву. У першым квартале было пабудавана 1 мільён 327 тысяч квадратных метраў жылля — 22 працэнты да гадавога задання пры прагнозе 15. Такое апераджэнне, упэўнены Мікалай Зайчанка, будзе захоўвацца, каб па выніках 9 месяцаў пабудаваць 90 працэнтаў ад гадавога плана. Таму ён назваў будаўніцтва другім важным кампенсатарам. Нарэшце, згадаў міністр, гандаль і грамадскае харчаванне (рост 5,9 працэнта), дзе, паводле яго слоў, ёсць рэзервы, каб падтрымліваць унутраны попыт на дасягнутым узроўні як мінімум, а, магчыма, і дадаць 2-3 працэнтныя пункты.

Адказваючы на пытанне наконт магчымага правядзення чарговай разавай дэвальвацыі беларускага рубля, Мікалай Зайчанка заявіў, што не бачыць ніякіх падстаў для яе правядзення. Ён патлумачыў, што дэвальвацыя ў студзені была прадвызначаная вялікім накопленым недэвальваваным навесам, і гэта трэба было зрабіць. Паводле яго слоў, студзеньская дэвальвацыя ў многім стабілізавала сітуацыю на ўнутраным валютным рынку. Міністэрства таксама падкрэсліў, што яго ведамства ніколі не было прыхільнікам правядзення разавай дэвальвацыі, і міністэрства выступае за гнуткую курсавую палітыку. Ён таксама лічыць абсалютна правільнай тую курсавую палітыку, якую праводзіць Нацыянальны банк Беларусі.

Закранаючы пытанне аб інфляцыі, Мікалай Зайчанка, у прыватнасці, паведаміў, што ў красавіку яна не перавысіць 0,6 працэнта. І спаслаўшыся назаваў, што ў першым паўгоддзі ўзровень інфляцыі ў Беларусі не павінен перавысіць мяжу ў 8 працэнтаў. Ён таксама заўважыў, што па выніках года інфляцыя не павінна перавысіць 11 працэнтаў. На думку міністра, зрабіць гэта будзе складана, але рэальна. Ён таксама патлумачыў, што больш спрыяльныя ўмовы па ўзроўні інфляцыі ў другім паўгоддзі можна прагназаваць з улікам уваходжання ў летні перыяд, які традыцыйна менш інфлятагенны. «Сёлета мы стартавалі з вельмі вялікай інфляцыяй, — сказаў Мікалай Зайчанка, каментуючы ўзровень інфляцыі ў студзені—сакавіку, — што было вызначана студзеньскай дэвальвацыяй і ростам тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі».

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Абзац

■ У Беларусі сярэдняя пенсія ўсіх відаў склала ў красавіку гэтага года Br390 тыс. 613, паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны. Памер сярэдняй працоўнай пенсіі ў красавіку гэтага года быў Br395,2 тыс. Сярэдняя пенсія па ўзросце склала Br408,9 тыс., мінімальная па ўзросту (з улікам даплаты да яе) — Br230,2 тыс. Сярэдняя пенсія па інваліднасці была роўная Br361,4 тыс. (без уліку пенсій з прычыны працоўнага калецтва і прафзахворвання), па прычыне страты карміцеля — Br241 тыс., за выслугу гадоў — Br537,8 тыс., за асаблівыя заслугі перад рэспублікай — Br604,6 тыс. Сярэдні памер сацыяльнай пенсіі склаў у красавіку 2009 года Br176,1 тыс.

■ **У Беларусі плануецца адмяніць ліцэнзаванне 14 відаў дзейнасці, паведаміў намеснік міністра эканомікі Андрэй Тур. Змяненні закрануць у першую чаргу сферу паслуг: рознічны гандаль, адукацыю, транспарт, турызм, страхавыя, натарыяльныя і рыэлтарскія паслугі.**

Поўны абзац

■ На вяселлі ў Турцыі забілі 45 чалавек. Напад адбыўся ў паселішчы Більге-Кою, што на паўднёвым усходзе краіны. Некалькі чалавек у масках уварваліся ў памяшканне, дзе праходзіла ўрачыстасць, і адкрылі агонь з аўтаматаў, а потым закідалі гасцей гранатамі. Сярод забітых не менш за шасцёра дзяцей. Міністэрства ўнутраных спраў Турцыі заяўляе, што гэта прычына варожасці паміж сем'ямі.

■ **49-гадовая брытанка Размары Беці не магла выбрацца з уласнай ванны на працягу 5 гадзін, пакуль яе не вызвалілі пажарныя. Справа ў тым, што вага жанчыны складае 140 кілаграмаў, і калі яна ў час мыцця паслізнулася і ўпала ў ванну, дык апынулася безнадзейна заціснутай паміж яе сценкамі. Сын выклікаў пажарных, якія вызвалілі Размары, распілаваўшы ванну.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

г. ВИТЕБСК 09.06.2009

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

по продаже объектов государственной собственности с одновременной продажей права заключения договоров аренды земельных участков

№ лота	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена, руб.	Сумма задатка, руб.
		Место нахождения объектов: Витебская область, г. Барань, ул. Набережная, 1		
		ЦЕНА СНИЖЕНА НА 20 %		
1.	Капитальное строение (здание лесопильного цеха) инв. № 240/С-21774 с асфальтобетонной площадкой и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объектов недвижимости: одноэтажное кирпичное здание, перекрытия металлические фермы, ж/б плиты, крыша шиферная, объем 5811 куб. м, общая площадь 1061,39 кв.м; Асфальтобетонная площадка 1460 кв.м. Земельный участок: площадью 0,2311 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 242450200002000356, срок аренды земельного участка — 20 лет, ограничения в использовании земельного участка в водоохранной зоне водного объекта вне прибрежной полосы реки Адров.	**224307940**	**22430794**
2.	Капитальное строение (здание склада ОКС) инв. № 240/С-21876 и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: одноэтажное кирпичное здание, перекрытия железобетонные, крыша рулонная, объем 2398,46 куб. м, общая площадь 427,87 кв.м. Земельный участок: площадью 0,1037 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 242450200002000352, срок аренды земельного участка — 20 лет, ограничения в использовании земельного участка в водоохранной зоне водного объекта вне прибрежной полосы реки Адров.	**92498696**	**9249869**
3.	Капитальное строение (здание склада металлов) инв. № 240/С-21877 и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: трехэтажное кирпичное здание, перекрытия железобетонные плиты, крыша совмещенная рулонная, объем 2089,13 куб. м, общая площадь 536,27 кв.м. Земельный участок: площадью 0,0701 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 242450200002000353, срок аренды земельного участка — 20 лет, ограничения в использовании земельного участка в водоохранной зоне водного объекта вне прибрежной полосы реки Адров.	**89421204**	**8942120**
4.	Капитальное строение (здание молокоприемного пункта) инв. № 240/С-21879 с асфальтобетонным покрытием и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объектов недвижимости: двухэтажное кирпичное здание, перекрытия — железобетонные плиты, крыша рулонная, жесть, объем 838,86 куб. м, общая площадь 171,22 кв.м; асфальтобетонное покрытие 607 кв.м. Земельный участок: площадью 0,1699 га для обслуживания здания общественного назначения (объекты торговли и оказания услуг), кадастровый номер 242450200002000354, срок аренды земельного участка — 20 лет, ограничения в использовании земельного участка в водоохранной зоне водного объекта вне прибрежной полосы реки Адров.	**87681892**	**8768189**
5.	Капитальное строение (здание склада материалов СПХ) с инвентарным номером 240/С-21773 и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: одноэтажное кирпичное здание, перекрытия железобетонные, крыша рулонная, жесть, объем 8383,39 куб. м, общая площадь 989,20 кв.м. Земельный участок: площадью 0,2956 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 242450200002000355, срок аренды земельного участка — 20 лет, ограничения в использовании земельного участка в водоохранной зоне водного объекта вне прибрежной полосы реки Адров.	**226484490**	**22648449**
		С УСТАНОВЛЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ, РАВНОЙ ОДНОЙ БАЗОВОЙ ВЕЛИЧИНЕ		
6.	Не завершенное строительством не законсервированное капитальное строение – станция очистки сточных вод и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта: дата начала строительства: 10.1986; площадь застройки: 1458 кв.м, общая площадь – 364,75 кв.м, общая степень готовности: 59,95 %; в т.ч. фундаменты — 100 %, стены – 85 %, перекрытия – 95 %, кровля — 90 %, полы — 20 %, проемы — 20 %. Земельный участок с кадастровым номером 242450200002000451, площадью 0,4766 га, срок аренды 50 лет. Использование земельного участка для обслуживания здания производственно-складского назначения. Ограничения в пользовании земельным участком в связи с его расположением в водоохранной зоне вне прибрежной полосы реки Адров и в охранной зоне линий электропередачи напряжением свыше 1000 В.	**12378280**	**1237828**

ОРГАНИЗАТОР – Фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. Правды, 38, контактный телефон-факс в г. Витебске: (0212) 476096, сайты: www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, E-mail:votfondgi@tut.by.

ПРОДАВЕЦ – Республиканское производственное унитарное предприятие «Лёс», г. Барань, ул. Набережная, 1, контактный телефон в г. Барань (0216) 253839.

АРЕНДОДАТЕЛЬ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА – Оршанский городской исполнительный комитет.

Условия продажи объекта недвижимости (лот № 6):

- осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данном объекте, создание им дополнительных рабочих мест;

- запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объектов до выполнения им условий договора купли-продажи.

Условия пользования земельным участком (лот № 6):

- заключение победителем аукциона с горисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения горисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок.

1. Аукцион состоится 9 июня 2009 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38.

2. Для участия в аукционе приглашаются: по лотам № 1-5 — граждане, юридические лица, индивидуальные предприниматели Республики Беларусь и иностранные инвесторы; по лоту № 6 — негосударственные юридические лица и индивидуальные предприниматели. Участнику необходимо подать заявление и подписать Соглашение установленной формы с фондом «Витебскоблимущество».

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также представляются: индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица, руководителю – удостоверение руководителя, либо иной документ, подтверждающий полномочия, нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (подготовлена не позднее 6 месяцев до даты подачи заявления) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на русский (белорусский) язык; представителем иностранного юридического лица или иностранного гражданина легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов на участие в аукционе уполномоченные лица предоставляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

3. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, последний день приема документов 08.06.2009 г. по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38, кабинет 308. Заключительная регистрация участников 09.06.2009 с 14.00 до 14.55. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

4. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Победитель аукциона — участник, предложивший наибольшую цену.

5. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты его проведения.

6. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет № 3642903000021, в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель — фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

7. Победитель аукциона — участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

8. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: **подписать протокол аукциона; не позднее 10 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка и затраты на подготовку и проведение аукциона; внести в бюджет города Орша плату за право заключения договора аренды земельного участка не позднее 10 дней; не позднее 12 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка заключить с Республиканским производственным унитарным предприятием «Лёс» договор купли-продажи недвижимости, а с Оршанским горисполкомом — договор аренды земельного участка.**

9. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

г. ВИТЕБСК 29.05.2009

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

по продаже объектов государственной собственности с одновременной продажей права заключения договоров аренды земельных участков

№ лота	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей	Сумма задатка, рублей
1.	Капитальное строение с инв. № 201/С-8433 (здание пожарного депо на один выезд), расположенное по адресу: Витебская область, Городокский район, Вайханский с/с, д. Большие Стайки, и право заключения договора аренды земельного участка.	Характеристика объекта недвижимости: одноэтажное кирпичное здание, общая площадь 195,1 кв.м, объем 1127 куб.м, 1993 г. постройки, фундамент — ж/б блоки, перекрытия — ж/б плиты, крыша совмещенная рулонная, полы бетонные, электроосвещение — скрытая проводка. Земельный участок с кадастровым номером 221882201801000080, площадью 0,4222 га для содержания и обслуживания объекта недвижимости, сроком аренды 99 лет.	**142 166 581**	**14 216 658**
2.	Капитальное строение – здание административное (инв. № 200/С-51180), расположенное по адресу: г. Витебск, Бешенковическое шоссе, 1, и право заключения договора аренды земельного участка.	Характеристика объекта недвижимости: двухэтажное кирпичное здание, общая площадь 305 кв.м, объем 1303 куб.м, 1982 г. постройки, фундамент — ж/б блоки, перекрытия — ж/б плиты, крыша совмещенная. Забор (металлический) – 42,2 м. Покрытие (асфальтобетонное) – 138,17 кв.м. Цементобетонные откосы – 72,6 кв.м. Деревья: тополь, береза 2 шт., липа. Земельный участок с кадастровым номером 240100000003000685, площадью 0,0768 га для содержания и обслуживания находящегося в государственной собственности имущества, сроком аренды 99 лет. Ограничение: зона санитарной охраны полезных источников водоснабжения хозяйственно-питьевого назначения 0,0048 га.	**135 970 159**	**13 597 015**
3.	Капитальное строение с инвентарным номером 201/С-11334, расположенное по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, г. Городок, ул. Вокзальная, 40а, и право заключения договора аренды земельного участка.	Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 201/С-11334 – здание специализированное розничной торговли (магазин) — одноэтажное кирпичное здание 1974 г. постройки, общей площадью 457,2 кв.м, фундамент бетонный, перекрытия — ж/б плиты; крыша рулонная, с кирпичным тамбуром, двумя кирпичными сходами в подвал, железобетонным подвалом и асфальтобетонным покрытием. Земельный участок: площадью 0,0625 га, сроком аренды 99 лет, кадастровый номер 221850100001003220, для размещения объектов розничной торговли. Ограничение в использовании всего участка в связи с нахождением в водоохранной зоне реки, а также охранная зона линии электропередач напряжением до 1000 В на площади – 0,0026 га.	**84 444 456**	**8 444 445**
4.	Капитальное строение с инвентарным номером 201/С-11373, расположенное по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, г. Городок, ул. Вокзальная, д. 53, и право заключения договора аренды земельного участка.	Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 201/С-11373 – здание специализированное здравоохранения и предоставления социальных услуг (здание фельдшерско-акушерского пункта) — одноэтажное бревенчатое здание 1949 г. постройки, общей площадью 105,4 кв. м, фундамент бутобетонный, перекрытия деревянные, крыша шиферная, с двумя холодными кирпичными пристройками, дощатым сараем, забором деревянным, двумя калитками, уборной. Земельный участок: площадью 0,1126 га, кадастровый номер 221850100001003221, срок аренды участка – 99 лет, для размещения объектов здравоохранения и предоставления социальных услуг. Охранная зона линии электропередач напряжением до 1000 В на площади 0,0204 га.	**45 585 320**	**4 558 532**

ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. Правды, 38, контактный телефон в Витебске: (0212) 47 60 96, сайты: www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, E-mail:votfondgi@tut.by.

1. Аукцион состоится 29 мая 2009 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38.

2. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, **последний день приема документов 28.05.2009 до 17.00 по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38, кабинет 308. Заключительная регистрация участников 29.05.2009 с 14.00 до 14.45.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

3. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет № 3642903000021, в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витеб

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

6 мая 2009 г. № 16 (168)

ПОСЛЕ ВЫСТУПЛЕНИЯ «МС»

665 РУБЛЕЙ — ПЛАТИМ

В № 10 «Местного самоуправления» (18.03.09) была опубликована статья «600 рублёў плацім, 665 — у галаве?». В ней шла речь о том, что некоторые перерабатывающие предприятия республики поторопились снизить цены на молоко 1-го сорта, закупаемое у личных подсобных хозяйств, с 665 до 600 рублей за литр.

В редакцию продолжают поступать реагирования на статью (см. № 14 за 15.04.09, № 15 за 22.04.09).

«Министерство сельского хозяйства и продовольствия рассмотрело статью «600 рублёў плацім, 665 — у галаве?» и сообщает следующее.

В соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 5 июня 2008 г. № 812 «О закупочных ценах на продукцию животноводства, реализуемую для республиканских государственных нужд», молоко, закупаемое у населения, оплачивается по договорным ценам, но не ниже закупочной цены молока 1-го сорта (665 рублей за 1 килограмм молока базисной жирности).

Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 9 февраля 2009 г. № 164 внесены изменения в постановление Совета Министров Республики Беларусь от 5 июня 2008 г. № 812, согласно которому закупочная цена молока 1-го сорта базисной жирности составляет 600 рублей.

В целях недопущения снижения объемов молока, реализуемого населением, и уменьшения доходов сдатчиков письмом Минсельхозпрода, согласованным с Министерством экономики от 11 февраля 2009 г. № 03-4-8/1378, направленным в адрес комитетов по сельскому хозяйству и продовольствию облисполкомов, областных организаций мясо-молочной промышленности, рекомендовано молоко, закупаемое у населения перерабатывающими организациями, оплачивать по закупочным ценам не ниже цен, действующих до 9 февраля 2009 г. (665 рублей).

Могилевская область — единственный регион республики, который проигнорировал выполнение рекомендаций Минсельхозпрода и Минэкономики об оплате закупаемого у населения молока перерабатывающими организациями по таким закупочным ценам.

Минсельхозпродом в адрес председателя Могилевского облисполкома 03.04.2009 направлено письмо об устранении указанных недостатков в работе с личными подсобными хозяйствами граждан.

М.Г. САВЕЛЬЕВ,
заместитель министра сельского хозяйства и продовольствия».

Ці якасныя чаравічкі?

Характэрнае парушэнне індывідуальных прадпрымальнікаў пры гандлі на рынках — гэта рэалізацыя тавараў без дакументаў, што пацвярджаюць іх якасць і бяспечнасць.

Да такіх сумных высноў прыйшлі супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнага кантролю па Віцебскай вобласці. Напрыклад, на вельмі папулярным у абласным цэнтры «Полацкім калгасным рынку» адна прадпрымальніца рэалізоўвала дзіцячыя чаравічкі, выраблены расійскай фірмай з Кастрамской вобласці (што ў прынцыпе не забараняецца), ды не было на гэты тавар айчыннага пасведчання аб дзяржаўнай гігіенічнай рэгістрацыі.

Яшчэ адна прадпрымальніца ў палатцы прапанавала купіць камплект жаночай бялізны вытворчасці Латвіі. І ў гэтым выпадку ніякіх дакументаў, якія б гарантавалі бяспечнасць тавару, не было.

Затое параўнальна танней, чым у крамах. Вы купіце?

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

СЕЛЬСАВЕТ ЧАКАЕ АДКАЗУ...

Старшыня Прылепскага сельскага Савета Смалявіцкага раёна Святлана Максіменка, падводзячы мяне да свайго «офіса» (адміністрацыйны будынак знаходзіцца не ў Прылепах, а ў вёсцы Усяжа), адначасова робіць аглядную экскурсію. І дзеліцца набалелым.



Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

«Часам з-за кавалачка зямлі разгараюцца сапраўдныя баі, людзі праходзяць праз суды, страчваюць здароўе».

Спецыфіка Прылепскага сельсавета — вялікая колькасць дачных участкаў і адсутнасць цэнтральных сядзібаў сельгаспрадпрыемстваў. На думку Святланы Аляксандраўны, гэта два вялікія «мінусы».

— Калі няма «свайго» сельгаспрадпрыемства, сельсавету вельмі цяжка выжыць. На нашай тэрыторыі пасля рэарганізацыі засталіся толькі аддзяленні гаспадарак. Што гэта такое? Напрыклад, існаваў у нас раней калгас імя Леніна, потым яго аб'ядналі з дзвюма іншымі гаспадаркамі, і ў выніку ўтварылася новае прадпрыемства «Азярыцкі-Агра». Але яго адміністрацыя цяпер знаходзіцца на тэрыторыі Азярыцка-Слабадскога сельсавета, у нас жа застаўся толькі ўчастак. Як думаеце, каму прадпрыемства будзе аказваць дапамогу ў першую чаргу? Зразумела, не нам...

Увогуле, сёння старшыня сельскага Савета павінен валодаць такім спектрам пытанняў, што навічку на гэтай пасадзе не пазайздросціш. Святлана Максіменка не навічок. Перад тым як узначаліць сельскі Савет, працавала сакратаром сельвыканкама і свой вопыт лічыць самай лепшай «школай».

Аднак адзін старшыня, які б энергічны і падкаваны ні быў, сам усе праблемы не вырашыць. У склад Прылепскага сельскага Савета ўваходзіць 11 дэпутатаў. Наколькі адчувальная іх дапамога?

— Ёсць такія дэпутаты, на якіх, як кажуць, дзе



Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Старшыня Прылепскага сельскага Савета Святлана МАКСІМЕНКА.

сядзеш, там і злезеш... Яны паабяцаюць — і ніколі не зробяць.

— Вы ж самі іх выбіралі, аказалі давер...

— Мы выбіралі аўтарытэтных людзей з пэўнымі магчымасцямі. І спачатку многія з іх дапамагалі вырашаць нашы агульныя праблемы. Потым гэта жаданне ў некаторых прайшло. Дзякуй Богу, не ва ўсіх. Бо адна я нічога не здолела б зрабіць. Нават каб проста аб'ездзіць усе 14 населеных пунктаў, не адзін дзень спатрэбіўся б.

Самы вялікі «блок» пытанняў так ці інакш датычыцца зямлі. Раней (да 2004 года), калі ў сельвыканкаме быў «свой» землеўпарадчык, зямельныя праблемы вырашаліся больш хутка, ды і больш якасна. У кабінеце землеўпарадчык практычна не сядзеў — працоўны дзень у яго пачынаўся і заканчваўся непасрэдна на ўчастках, там жа адбывалася і «папяровая» работы, складаліся заявы, схемы...

— Сёння заявак ад людзей процьма. Землеўпарадчык прыязджае раз на тыдзень, да абеду паспявае абслужыць 3—4 чалавекі, пасля абеду едзе на ўчастак... У маім кабінеце назапашваюцца стосы нявырашаных землеўпарадкавальных спраў. Я, напрыклад, не павінна абмяраць участкі замест землеўпарадкавальнай службы, але раблю гэта, таму што людзі чакаць не могуць, — кажа Святлана Аляксандраўна. — Гэта вельмі балючае пытанне, прычым не толькі для нашага сельсавета.

Сёння многія грамадзяне хочуць узаконіць «зямельныя адносіны». Тут дзейнічае простае правіла: не аформіш зямельны ўчастак — не атрымаеш тэхнічны пашпарт на дом. А без тэхнічнага пашпарта на тваю жылплошчу ніводнага сваяка не прапішуць (не кажучы ўжо пра больш складаныя юрыдычныя аперацыі).

— Шмат пытанняў датычыцца перадачы участкаў у спадчыну. Людзі кінуліся займацца іх пераафармленнем, заявак столькі, што да іх разгляду падключаюцца прыватныя агенцтвы. І ўсё адно не паспяваем укладвацца ў вызначаныя заканадаўствам тэрміны....

Практычна ўсе пытанні, якія выносяцца на пасяджэнне сельвыканкама (звычайна іх разглядаецца ад 50 да 70), датычацца зямельных участкаў.. Часам з-за кавалачка зямлі, з-за лішняга метра разгараюцца сапраўдныя баі, людзі праходзяць праз суды, страчваюць нервы, здароўе...

— Многія заявы даводзіцца разглядаць тэрмінова, у «рабочым парадку», хоць яны маюць самае непасрэднае дачыненне да кампетэнцыі землеўпарадчыка. Але я не магу сказаць чалавеку: «Пачакайце да наступнага тыдня!».

Праязджаем са Святланай Аляксандраўнай каля прыпынку, дзе спыняюцца рэйсавыя аўтобусы — урна да краёў запоўнена «гарадскім» смеццем: пэт-бутэлькі, поліэтыленавыя пакеты... Тое ж самае, толькі ў яшчэ большай колькасці, валяецца побач.

— Вось бачыце, — уздыхае старшыня сельвыканкама, — яшчэ і тыдня не мінула пасля суботніка. Гэта ў нас частая з'ява — дачнікі-мінчане, каб не цягнуць смецце ў горад, пакідаюць яго на аўтобусных прыпынках або вывозяць у лес. І гэта ў лепшым выпадку. У горшым — пакеты са смеццем выкідваюцца з вокнаў аўто літаральна на дарогу.

З кожным годам гараджан, якія хочуць набыць участак пад «загарадны домік» менавіта ў Прылепскім сельсавеце, становіцца ўсё больш. Яно і не дзіўна, калі мець на ўвазе не толькі набліжанасць тэрыторыі да сталіцы, але і маляўнічасць мясцовых краявідаў. Яшчэ тры гады таму раённае кіраўніцтва прыйшло да высновы, што сілами адной толькі ЖКГ праблемы з вывазам смецця не вырашыць. У выніку тэрыторыю раёна падзялілі, умоўна кажучы, на ўчасткі, кожны з якіх замацавалі за пэўным прадпрыемствам... Сёння тэрыторыя Прылепскага сельсавета (у тым ліку ўзбярэжжа Дуброўскага вадасховішча) замацавана не толькі за ЖКГ, але і за меліярацыйнай станцыяй, унітарным прадпрыемствам «Азярыцкі» і лясгасам.

— Не магу сказаць, што яны не прыбіраюць «свае» ўчасткі, — гаворыць Святлана Максіменка. — Але гэтага мала. Да таго ж, у ЖКГ хапае іншых праблем: яны павінны сачыць за падачай вады, ліквідаваць прарывы, утрымліваць «на ўзроўні» жылфонд. Улічыце, што вадаправоды на тэрыторыі раёна не новыя, ім па 30—40 гадоў... У выніку работнікі ЖКГ проста фізічна не паспяваюць прыбіраць смецце на адведзеным ім участку — у вёсках Прылепы і Ляды.

Усталяванне кантэйнераў не вырашае пытання са смеццем. Паставіць кантэйнеры — не праблема, праблема іх вывезці: у ЖКГ элементарна не хапае тэхнікі. Не так даўно на раённым узроўні было прынята рашэнне папрасіць дапамогі з тэхнікай у сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. Цяпер ЖКГ павінна заключыць дагаворы і з прадпрыемствамі (на прадастаўленне тэхнікі), і з жыхарамі сельсавета (на вываз смецця). На сельвыканкаме ж «ляжыць» інфармацыйная работа з насельніцтвам.

— Тое, што мы знаходзімся на адлегласці 20 кіламетраў ад сталіцы, не вызваляе ад праблем, а толькі дадае іх, — расказвае Святлана Аляксандраўна. — На тэрыторыі сельсавета маюць катэджы многія высокапастаўленыя асобы. Яны патрабуюць ад мясцовых уладаў ледзь ці не сталічных умоў пражывання, не разумеючы, што мы не чараўнікі. А самі — чаго граху таіць — нават за ўласнай агароджай прыбіраць не хочуць: маўляў, не наша справа.

Аднак у кожнага медаля, як кажуць, два бакі. Грамадзяне, якія набываюць зямлю ў прыватную ўласнасць (а гэта не толькі гараджане, але і вяскоўцы), значна папаўняюць сельсаветскі бюджэт. А калі ў сельскага Савета ёсць грошы, стаўленне да яго (у арганізацый і службаў рознага кшталту) зусім іншае. З ім лічацца, да яго хочуць мець дачыненне... За кошт сродкаў, атрыманых ад продажу ўчасткаў у прыватную ўласнасць, у Прылепскім сельсавеце спілоўваюць аварыйныя дрэвы, добраўпарадкоўваюць могілкі, ліквідуюць несанкцыянаваныя звалкі, рамантуюць вуліцы...

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

МАЛЫЯ ГАРАДЫ

ХТО І ШТО Ў ДЭФІЦЫЦЕ?

Доўгі час сам тэрмін «глыбінка» меў не зусім прывабны сэнс. Вёскі, пасёлкі і невялікія гарадкі атаясамліваліся з напружанай сітуацыяй на рынку працы, недастаткова развітой сацыяльнай інфраструктурай, «умоўнымі» заробкамі і г.д. Тузін праблем неабходна было вырашаць комплексна, прычым рабіць гэта трэба было неадкладна, інакш працэс мог прыняць незваротны характар. Нездарма мерапрыемствы па развіцці (чытай: па адраджэнні) малых гарадоў, зацверджаныя некалькі гадоў таму, набылі статус дзяржаўнай праграмы.

Вытворчасць для «сацыялкі»

У Любані цяпер каля 12 тысяч жыхароў — тыповы райцэнтр, які, тым не менш, мае свае адметнасці. У горадзе працуюць шэсць прамысловых прадпрыемстваў. Гэта швейная фабрыка, камбінат будаўнічых матэрыялаў, завод сценавых блокаў, ільнозавод, а таксама крухмальны і сыраробны заводы. Апошняе прадпрыемства адносіцца да горадаўтваральных, паколькі на яго долю прыпадае каля паловы агульнага аб'ёму прамысловай вытворчасці ўсёй Любаншчыны. Апошнім часам на сыраробным актыўна разгарнулася тэхнічная мадэрнізацыя. Пераўзбраенне вытворчасці — патрэба часу для перапрацоўчай галіны. Тут нельга адставаць, інакш можна даволі хутка згубіць сваю рынкавую нішу, аднаўляць якую будзе надзвычай складана.

— На сыраробным заводзе закупілі замежную лінію па вытворчасці цвёрдых сыроў, — адзначае **намеснік старшыні Любанскага райвыканкама Аляксандр БОЙКА**. — Увядзенне ў эксплуатацыю гэтага сучаснага абсталявання дазволіць павялічыць вытворчасць сыроў у 1,5 раза. Трэба ўлічваць тое, што значная частка адпаведнай прадукцыі пастаўляецца на экспарт. Яшчэ ў лістападзе 2007 года ў Маскве быў створаны гандлёвы дом «Любанскі», неабходна было нарошчваць аб'ёмы вытворчасці, каб задаволіць вялікі попыт. Інвестыцыі ў тэхнічнае пераўзбраенне сырзавода склалі 14 мільярдаў рублёў. Вялікія сродкі, аднак гэта апраўданыя, перспектыўныя ўкладанні.

Мадэрнізацыя сыраробнага завода — самы буйны інвестыцыйны праект мінулага года на Любаншчыне ў межах рэалізацыі праграмы развіцця малых гарадоў. Таксама летась пачалася рэканструкцыя цэха перапрацоўкі рыбы — магутнасцю паўтысячы тон у год. Праведзены работы па рэканструкцыі і на Любанскім хлебазаводзе. А на крухмальным заводзе была газіфікавана кацельня. Прамысловасць на Любаншчыне развіваецца досыць інтэнсіўна: за мінулы год аб'ёмы вытворчасці таварнай прадукцыі павялічыліся больш чым на 18 працэнтаў. Выпуск спажывецкіх тавараў — больш чым на 13 працэнтаў.

Пазітыўныя зрухі ў рэальным сектары эканомікі дазволілі актывізаваць развіццё сацыяльнай сферы. У снежні ў эксплуатацыю была ўведзена станцыя абезжалезвання. Такім чынам удалося вырашыць актуальнае пытанне па забеспячэнні жыхароў райцэнтра пітной вадой належнай якасці. Летась у райцэнтры пачалося будаўніцтва адразу двух важных сацыяльных аб'ектаў — фізкультурна-аздараўленчага комплексу і школы мастацтваў. Як заўважыў Аляксандр Бойка, нягледзячы на пэўныя фінансавыя цяжкасці, сёлета іх узвядзенне павінна быць завершана.

Сам сабе наймальнік

Для людзей у працаздольным узросце галоўнае пытанне — як знайсці вартае месца працы. Звычайна ў глыбінцы такія пошукі абмежаваныя нешматлікімі варыянтамі. І далёка не заўсёды яны маюць станоўчы вынік. Не сказаць, што на Любаншчыне становішча адрозніваецца ў лепшы бок. На пачатак сакавіка на ўліку знаходзілася 115 беспрацоўных: 75 — з горада і 40 — з раёна. Узровень беспрацоўя — 0,76 працэнта эканамічна актыўнага насельніцтва.

— Гэта добры вынік, якога ўдалося дасягнуць дзякуючы ўвасабленню комплексу мераў — перанавучанню, стварэнню новых працоўных месцаў, другаснай занятасці і шэрагу іншых, — кажа намеснік начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Любанскага райвыканкама Надзея Акуліч. — За даволі непрацяглы час людзі, якія звярнуліся ў службу занятасці, могуць працаўладкавацца.

Было б жаданне: прапаноўваецца 247 вакансій — больш чым па два варыянты на кожнага беспрацоўнага. Прычым гэта не толькі традыцыйна запатрабаваныя рабочыя спецыяльнасці (вялікі попыт на спецыялістаў-будаўнікоў), але і спецыяльнасці работнікаў з вышэйшай адукацыяй. Да прыкладу, урачоў, якія на Любаншчыне ў вялікім дэфіцыце. Даводзіцца ісці на сумяшчэнне, накіроўваць пацыентаў у іншыя рэгіёны. Аднак гэта зусім не вырашэнне вострай праблемы. Для таго, каб прывабіць маладога спецыяліста, неабходна забяспечыць дзве галоўныя ўмовы — прыстойны заробак і жыллё. Наконт апошняга былі цяжкасці, мабыць таму і ўтварыўся дэфіцыт кадраў. Праўда, заўважыла Надзея Акуліч, цяпер адпрацоўваецца некалькі варыянтаў забеспячэння медыкаў жыллём. Калі пытанне будзе вырашана, то і недахоп урачоў, напэўна ж, значна зменшыцца.

Нярэдка здараецца, што наймальнік прапануе пэўную вакансію, а чалавек не мае адпаведнай адукацыі. У такім разе варта прайсці перанавучанне — ёсць такая магчымасць. З Любані беспрацоўныя едуць у Слуцк, Барысаў, Мінск. У асноўным праходзяць перанавучанне па будаўнічых спецыяльнасцях, а таксама на цырульніка, прадаўца. Можна скончыць двухтыднёвыя курсы «Асновы прадпрымальніцкай дзейнасці». Пасля можна і ўласную справу пачаць — у гэтым выпадку выдзяляецца фінансавая дапамога. Летась сваім правам скарысталіся два прадпрымальнікі. Прыватнікі асвойваюць розныя сферы дзейнасці — апроч «традыцыйнага» гандлю, займаюцца таксама аказаннем паслуг, рамонтам кватэр і нават вырошчваннем сельскагаспадарчай прадукцыі.

Найбольш высокая зарплата на Любаншчыне ў работнікаў органаў страхавання, банкаўскіх устаноў — 1,2 млн рублёў, у прамысловасці — 928 тыс., а таксама ва ўрачоў — 1,3 млн рублёў. Настаўнікі летась у сярэднім атрымлівалі 879 тыс. рублёў, работнікі ўстаноў культуры — 561 тыс. рублёў (у тым ліку бібліятэкары — 515,3 тыс.). Нізкай заставалася аплата працы ў грамадскім харчаванні — 437,4 тыс. рублёў, швейнай прамысловасці — 446,7 тыс.

Як зарабіць больш?

На Любаншчыне пастаянна з'яўляюцца новыя магчымасці для працаўладкавання. Не стаў выключэннем і мінулы год. Летась раённы камбінат бытавога абслугоўвання адкрыў цэх па вытворчасці вокнаў і дзвярэй з ПВХ. Была праведзена рэканструкцыя аддзела кулінарыі, пасля чаго тут створаны 14 новых працоўных месцаў.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

УСЁ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД СУМЛЕННАСЦІ

або Страсці па малацэ

На старонках нашай газеты мы неаднаразова звярталіся да тэмы здачы малака насельніцтвам. Апошнім часам асабліва шмат пытанняў узнікала па закупачных цэнах, аднак толькі гэтым аспектам, як паказала практыка, «малочная» праблематыка не абмяжоўваецца.

Днямі ў рэдакцыю патэлефанавала жыхарка вёскі Сталіца Германовіцкага сельсавета Шаркоўшчынскага раёна. Жанчына паскардзілася на перыядычныя вяртанні здадзенага ёю і яе аднавяскоўцамі малака.

На тэрыторыі Германовіцкага сельсавета месяцца тры сельскагаспадарчыя прадпрыемствы — СВК «Княж», СВК «Ельня» і падсобная гаспадарка ААТ «Агратэхсэрвіс». Яны і займаюцца зборам «белага золата» ад насельніцтва. У кожнай гаспадаркі свае малаказборшчыкі, якія штодзень (а летам двойчы на дзень) аб'язджаюць замацаваныя за імі населеныя пункты і збіраюць малако, якое потым цэнтралізавана вывозіцца на Шаркоўшчынскі вытворчы ўчастак Глыбоцкага МКЗ. Паводле слоў скаржніцы, пытанні па якасці ўзнікаюць толькі там, дзе малако збіраюць малаказборшчыкі СВК «Княж».

— Нам вярталі малако тры дні запар у канцы сакавіка, а потым яшчэ два дні ў красавіку, — расказала жыхарка Сталіцы. — Калі мы пыталіся, у чым прычына, нам тлумачылі, што ў малацэ знойдзены інгібіруючыя рэчывы — маўляў, нехта лечыць карову антыбіётыкамі, якія і праяўляюцца. Аднак, што ж, у іншых вёсках кароў не лечаць? Чаму толькі ў нас раз за разам узнікае такая праблема? Людзі мяркуюць, што гэта робіцца спецыяльна, каб адбіць ахвоту трымаць на падворках кароў, бо малочна-кансервавамму заводу падчас крызісу столькі сыравіны не патрэбна.

Усяго на падворках Германовіцкага сельсавета жыхары трымаюць 627 кароў, з іх найбольшая колькасць (327 кароў) — у населеных пунктах, размешчаных на «падшэфнай» тэрыторыі СВК «Княж». Малако ад іх збірае 10 малаказборшчыкаў.

— Пасля таго, як у сакавіку ў асобных населеных пунктах людзям тройчы вярталі малако (з-за ўтрымання ў ім інгібіруючых рэчываў), мы правялі тэматычныя сходы ва ўсіх вёсках, расказалі мясцовым жыхарам, што нельга здаваць малако ад каровы, калі лечыш яе антыбіётыкамі, — тлумачыць сітуацыю **старшыня Германовіцкага сельвыканкама Крысціна ЯСЮКЕВІЧ**. — Людзі часам займаюцца «самалячэннем» — самастойна прызначаюць сваёй жывёліне моцныя прэпараты, колюць імі карову і пры гэтым здаюць яе малако. А потым здзіўляюцца, чаму гэтае малако вяртаюць ім назад.

Яшчэ адной верагоднай прычынай дрэннай якасці малака можа быць мастыт, на які хварэюць каровы (асабліва зараз, у час масавых расцёлаў). Калі ў каровы мастыт, ад такой каровы малако здаваць нельга. Паводле слоў Крысціны Станіславаўны, сапсаваць малако можа і малозіва. «Калі карова расцеліцца, — тлумачыць Ясюкевіч, — першыя 10 дзён яе малако ўтрымлівае малозіва, што дрэнна адбіваецца на якасці. Такое малако таксама нельга здаваць. Тое ж датычыцца і «застойнага» малака (калі карова «запускаецца»). А некаторыя людзі як думаюць: самі мы такое малако ўжываць не станем, а ў калгас здадзім, калгас прыме. У красавіку зноў былі два выпадкі, калі вярталі малако. Прычым пытанні ўзнікаюць толькі з тымі населенымі пунктамі, якія размешчаны на тэрыторыі СВК «Княж». Халадзільнік у іх нармальны. Кантроль якасці вядзецца на належным узроўні».

Самі сельскагаспадарчыя прадпрыемствы з'яўляюцца толькі прамежкавым звяном, пасярэднікамі паміж насельніцтвам і заводам. Раз у 10 дзён малаказборшчыкі бяруць пробу малака ад кожнай каровы для праверкі на тлустасць. Гэты аналіз праводзіцца лабарантам пры СВК. Іншых тэстаў і аналізаў гаспадаркі не робяць. Неабходнае абсталяванне для вызначэння якасці малака, яго шчыльнасці, наяўнасці антыбіётыкаў і іншых дамешкаў знаходзіцца на Шаркоўшчынскім вытворчым участку і на самім заводзе.

— Проста нашы людзі, нягледзячы на тое, што цяпер яны добра ведаюць, у якіх выпадках нельга здаваць малако, усё ж працягваюць яго здаваць, — выказала сваё меркаванне старшыня сельвыканкама. — Што тычыцца нежаданняперапрацоўчых прадпрыемстваў прымаць малако ад насельніцтва, магу сказаць, што ў некаторых іншых раёнах, сапраўды, такое ёсць. Дзесьці заводы ўвогуле не бяруць малако, бо ў іх узніклі вялікія праблемы са збытам. Расія адмаўляецца ад беларускага малака. Прадпрыемствы вымушаны перапрацоўваць яго ў згушчанае, сухое малако, вырабляць масла, сыры, якія потым залежваюцца на складах. Аднак на Глыбоцкім МКК ніякіх абмежаванняў па закупцы малака няма.

— Выпадкі вяртання малака былі абумоўлены ўтрыманнем інгібіруючых рэчываў, — працягвае тэму **галоўны інспектар па закупцы ўпраўлення сельскай гаспадаркі Шаркоўшчынскага райвыканкама Таццяна АЛЬШЭЎСКАЯ**. — У кожным выпадку мы выязджалі на месца і там разбіраліся з сітуацыяй. Насамрэч, усё залежыць ад сумленнасці людзей. Яны выдатна разумеюць, што калі колеш карове антыбіётыкі, на працягу пэўнага тэрміну — ад 3 дзён да 3 тыдняў (у залежнасці ад таго, якія прымяняліся прэпараты) — малако здаваць нельга. А нехта адзін усё ж здаў малако ад хворай каровы і сапсаваў усю партыю. У выніку пацярпелі многія здатчыкі.

На Шаркоўшчынскім вытворчым участку кожная машына правяраецца на ўтрыманне інгібіруючых рэчываў. Калі малако няякаснае, яго вяртаюць здатчыкам. Малако Глыбоцкаму малочна-кансервавамму камбінату патрэбна — і ад насельніцтва, і ад гаспадарак. Але ёсць канкрэтныя патрабаванні да яго якасці.

З гэтым пагадзілася і **начальнік Шаркоўшчынскага вытворчага ўчастка Людміла ЛАТЫШОНАК**:

— Наяўным ГОСТам не прадугледжана ўтрыманне ў малацэ антыбіётыкаў. У нас ёсць апарат, які дазваляе іх выявіць. Аналізы праводзім для ўсяго сабранага малака па ўсіх гаспадарках. Калі нехта ўкалоў карову прэпаратам, дзе ўтрымліваюцца антыбіётыкі, то малако не будзе адпавядаць дзяржаўнаму стандарту. Людзі гэта ведаюць. Ніякай неаб'ектыўнасці тут няма і быць не можа. Мы клапоцімся аб тым, каб малако было чыстае, бо зараз вельмі жорсткімі сталі патрабаванні да якасці. Пытанне аб тым, што малако перапрацоўшчыкам не патрэбна, увогуле не існуе. Ніхто ў здачы малака людзей не абмяжоўвае. Галоўнае — якасць. У іншых населеных пунктах, дзе не бывае вяртанняў малака, гаспадары таксама лечаць кароў, аднак падыходзяць да здачы малака больш свядома, больш адказна (не здаюць у перыяд лячэння, перастрахоўваюцца, лішні дзень перачакаюць).

Палітыку прадпрыемства наконт закупкі малака ў насельніцтва нам агучыла **намеснік генеральнага дырэктара па якасці і сертыфікацыі ААТ «Глыбоцкі малочна-кансервавы камбінат» Лідзія СЕНІЧАВА**:

— Сыравіна нам патрэбная. Аднак патрабаванняў па якасці ніхто не адмяняў. Раней у нас проста не было такой выпрабавальнай базы, якая б дазваляла хутка праверыць якасць малака, у тым ліку і на наяўнасць антыбіётыкаў. Цяпер вельмі жорсткія патрабаванні да якасці пры адгрузцы ў Расію. Ва ўсіх нашых кантрактах дакладна агаворваецца адсутнасць антыбіётыкаў. Дасканалая праверка ідзе і на мяжы. У выпадку выяўлення малака з антыбіётыкамі, яно вернецца назад, а нам забароняць рэалізоўваць сваю прадукцыю ў Расіі, што для прадпрыемства смяротна (столькі прадукцыі, колькі вырабляе наш камбінат, у межах рэспублікі не рэалізаваць).

Неаб'ектыўнасці тут няма. Беспрычынна мы ніколі не будзем адмаўляцца ад закупкі малака ў насельніцтва. Мы абавязаны яго перапрацаваць, і мы перапрацоўваем. Мы зацікаўлены ў якасці малака і, калі ў насельніцтва ўзнікае канфліктная сітуацыя, рады дапамагчы. Малаказборшчыкам раім апытваць людзей, выяўляць, дзе ў каго хворыя каровы. Калі ў малаказборшчыка ёсць падазрэнні, мы ідзём на тое, каб індывідуальна праверыць малако ад некаторых асобных здатчыкаў. Вы разумееце, тэсты вельмі дарагія, рабіць іх усім не атрымаецца (мы разарымся), аднак каб выявіць нядобрасумленнага гаспадара, які ведае, што карова пралечаная, і ўсё адно здае малако, мы можам правесці персанальныя тэсты. Калі да нас звяртаюцца з такой просьбай (малаказборшчык ці сельвыканкам), мы ніколі не адмаўляем.

Інга МІНДАЛЁВА.

ВАШ ДЭПУТАТ У ПАЛАЦЕ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ЧАЦВЁРТАГА СКЛІКАННЯ

ГОМЕЛЬСКАЯ ВОБЛАСЦЬ

Гомельская-Юбілейная выбарчая акруга № 31

ЧЫКІЛЁЎ

Аляксандр Сцяпанавіч

Член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па жыллёвай палітыцы, будаўніцтве, гандлі і прыватызацыі.

Нарадзіўся 2 жніўня 1949 года ў горадзе Жлобіне Гомельскай вобласці.

Закончыў Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту. Заслужаны будаўнік Рэспублікі Беларусь.

Працаваў намеснікам начальніка ПМК-111 аб'яднання «Гомельпрамбуд», начальнікам упраўлення вытворча-тэхналагічнай камплектацыі будаўніча-мантажнага трэста № 27 горада Гомеля, галоўным інжынерам будаўніча-мантажнага трэста № 40 горада Жлобіна, генеральным дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Гомельпрамбуд».

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», юбілейным медалём «60 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.», знакам «Ганаровы будаўнік».

Гомельская-Сельмашаўская выбарчая акруга № 32

БЕЛЯЕЎ

Аляксандр Арсенавіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па жыллёвай палітыцы, будаўніцтве, гандлі і прыватызацыі.

Нарадзіўся 12 красавіка 1947 года ў горадзе Ленінградзе РСФСР.

Закончыў Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт. Заслужаны будаўнік Рэспублікі Беларусь.

Працаваў начальнікам Гомельскага мантажнага ўпраўлення № 1 трэста «Тэхмантаж», начальнікам будаўнічага ўпраўлення № 45, галоўным інжынерам — першым намеснікам генеральнага дырэктара вытворчага будаўніча-мантажнага аб'яднання «Гомельпрамбуд», першым намеснікам старшыні Гомельскага аблвыканкама, старшынёй Гомельскага гарвыканкама.

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», юбілейным медалём «60 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.».

Гомельская-Цэнтральная выбарчая акруга № 33

ШАЎКО

Аляксандр Аляксандравіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па грашова-крэдытнай палітыцы і банкаўскай дзейнасці.

Нарадзіўся 15 чэрвеня 1950 года ў вёсцы Бяседкі Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці.

Закончыў Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут. Заслужаны работнік прамысловасці Рэспублікі Беларусь.

Працаваў галоўным тэхнолагам Гомельскага станкабудаўнічага завода імя С.М. Кірава, намеснікам генеральнага дырэктара па вытворчасці, галоўным інжынерам Гомельскага станкабудаўнічага вытворчага аб'яднання імя С.М. Кірава. Займаў пасаду генеральнага дырэктара рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Гомельскі станкабудаўнічы завод імя С.М. Кірава».

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання — намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце, сувязі і прадпрымальніцтве.

Узнагароджаны юбілейным медалём «90 гадоў Узброеных Сілаў Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва.

Гомельская-Савецкая выбарчая акруга № 34

КУЗНЯЦОВА

Ларыса Фёдараўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце.

Нарадзілася 27 красавіка 1958 года ў горадзе Гомелі.

Закончыла Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт.

Працавала дырэктарам па вучэбна-выхаваўчай рабоце Урыцкай сярэдняй школы, дырэктарам Красненскай сярэдняй школы Гомельскага раёна, дырэктарам сярэдняй школы № 33 горада Гомеля. Займала пасады намесніка кіраўніка адміністрацыі Савецкага раёна горада Гомеля, начальніка аддзела адукацыі Гомельскага гарвыканкама.

Выбіралася дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання — намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе.

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Гомельская-Прамысловая выбарчая акруга № 35

ФІЛІМОНЧЫК

Таццяна Сцяпанаўна

Член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па жыллёвай палітыцы, будаўніцтве, гандлі і прыватызацыі.

Нарадзілася 3 снежня 1949 года ў горадзе Жлобіне Гомельскай вобласці.

Закончыла Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту, Акадэмію кіравання пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Працавала інжынерам-тэхнолагам вагоназборачнага цэха Гомельскага вагонарамонтнага завода, старшым інжынерам-тэхнолагам гомельскай люстраной фабрыкі «Чырвоны Кастрычнік», сакратаром партбюро Гомельскага вагонарамонтнага завода. Займала пасады сакратара выканкама, старшыні Савецкага раённага Савета народных дэпутатаў горада Гомеля, кіраўніка адміністрацыі Савецкага раёна горада Гомеля.

Узнагароджана медалём «За працоўныя заслугі», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Гомельская-Навабеліцкая выбарчая акруга № 36

ШАЦЬКО

Аляксандр Віктаравіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе.

Нарадзіўся 3 верасня 1963 года ў горадзе Магдэбургу Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі.

Закончыў Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт, Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Працаваў настаўнікам, намеснікам дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце сярэдніх школ № 19 і № 56 горада Гомеля, дырэктарам Гомельскай Ірынінскай гімназіі.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

Узнагароджаны медалямі «За адзнаку ў воінскай службе», «70 гадоў Узброеных Сілаў СССР», «90 гадоў Узброеных Сілаў Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

Гомельская сельская выбарчая акруга № 37

МАЁРАЎ

Уладзімір Сяргеевіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па аграрных пытаннях.

Нарадзіўся 6 лістапада 1952 года ў горадзе Горкі Магілёўскай вобласці.

Закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію.

Працаваў старшым заатэхнікам Гомельскага міжгаспадарчага аб'яднання па вытворчасці свініны, інструктарам арганізацыйна-інструктарскага аддзела Гомельскага аблвыканкама, арганізацыйнага аддзела Гомельскага райкама КПБ, аддзела арганізацыйна-партыйнай работы Гомельскага абкама КПБ, старшынёй калектыўна-долевай гаспадаркі «Бабовіцкая», першым намеснікам старшыні камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама, старшынёй Гомельскага райвыканкама.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Буда-Кашалёўская выбарчая акруга № 38

КУЖАНАЎ

Уладзімір Іванавіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і сувязях з СНД.

Нарадзіўся 27 чэрвеня 1952 года ў пасёлку Чырвоны Сцяг Буда-Кашалёўскага раёна Гомельскай вобласці.

Закончыў Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту, Мінскую вышэйшую партыйную школу.

Працаваў у Мінскім лакаматыўным дэпо, служыў у органах Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, Службе бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, быў афіцыйным прадстаўніком Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ва Украіне.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

Узнагароджаны сямю медалямі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Жыткавіцкая выбарчая акруга № 39

РУСЫ

Міхаіл Іванавіч

Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанні.

Нарадзіўся 23 лістапада 1954 года ў вёсцы Вароніна Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці.

Закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію, Мінскую вышэйшую партыйную школу.

Працаваў у партыйных і гаспадарчых органах Жыткавіцкага, Кармянскага і Стаўбцоўскага раёнаў. Быў старшынёй Камітэта па зямельнай рэформе і землеўпарадкаванні пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь. Займаў пасады Міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь, Міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь, кіраўніка аддзялення Пасольства Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі ў горадзе Санкт-Пецярбургу.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання — старшынёй Пастаяннай камісіі па аграрных пытаннях.

Узнагароджаны ордэнам «Садружнасць» (Міжпарламенцкая Асамблея дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў), юбілейным медалём «90 гадоў Узброеных Сілаў Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

Жлобінская выбарчая акруга № 40

БАТАН

Уладзімір Іванавіч

Член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце, сувязі і прадпрымальніцтве.

Нарадзіўся 28 студзеня 1961 года ў вёсцы Мардзвін Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці.

Закончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі.

Працаваў начальнікам змены, майстрам па рамонце кранавага абсталявання і металаканструкцый, старшым майстрам, начальнікам цэха рамонту металургічнага абсталявання рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Беларускі металургічны завод» у горадзе Жлобіне.



Калінкавіцкая выбарчая акруга № 41

ЦІХАНСКАЯ

Раіса Аляксандраўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і сувязях з СНД.

Нарадзілася 2 студзеня 1951 года ў вёсцы Малоткавічы Жабчыцкага раёна Пінскай вобласці.

Закончыла Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт.

Працавала загадчыкам арганізацыйна-інструктарскага аддзела Гомельскага гарвыканкама, інструктарам арганізацыйнага аддзела Цэнтральнага райкама КПБ горада Гомеля. Была намеснікам загадчыка аддзела арганізацыйнай і кадравай работы Гомельскага абласнога Савета народных дэпутатаў, намеснікам начальніка ўпраўлення, начальнікам упраўлення арганізацыйна-кадравай работы Гомельскага аблвыканкама. Займала пасаду намесніка старшыні Гомельскага аблвыканкама.

Выбіралася дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, дзвюма ганаровымі граматамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.



Мазырская выбарчая акруга № 42

АРЦЮШЭНКА

Яўген Антонавіч

Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па грашова-крэдытнай палітыцы і банкаўскай дзейнасці.

Нарадзіўся 2 жніўня 1974 года ў горадзе Мазыры Гомельскай вобласці.

Закончыў Гомельскі кааператыўны інстытут.

Працаваў эканамістам, намеснікам начальніка кантрольна-аналітычнага аддзела, начальнікам аддзела эканамічнага аналізу, намеснікам генеральнага дырэктара па эканоміцы і фінансах адкрытага акцыянернага таварыства «Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод».



Палеская выбарчая акруга № 43

КАНОПЛІЧ

Сяргей Міхайлавіч

Член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанні.

Нарадзіўся 28 сакавіка 1957 года ў вёсцы Дзярбінкі Мазырскага раёна Гомельскай вобласці.

Закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію.

Працаваў галоўным аграномам, намеснікам старшыні, старшынёй калгаса «Рэвалюцыя» Ельскага раёна, першым намеснікам старшыні — начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання, старшынёй Ельскага райвыканкама.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



Рэчыцкая выбарчая акруга № 44

ІСАЧЭНКА

Ала Іванаўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па бюджэце, фінансах і падатковай палітыцы.

Нарадзілася 21 снежня 1957 года ў вёсцы Левашы Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці.

Закончыла Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі, Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Працавала інспектарам па бюджэце фінансавага аддзела Брагінскага райвыканкама, эканамістам, старшым эканамістам па бюджэце, намеснікам загадчыка — начальнікам бюджэтнай інспекцыі, начальнікам фінансавага аддзела Рэчыцкага райвыканкама.

Рагачоўская выбарчая акруга № 45

МІХАСЁЎ

Уладзімір Ільіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па жыллёвай палітыцы, будаўніцтве, гандлі і прыватызацыі.

Нарадзіўся 14 кастрычніка 1949 года ў вёсцы Сасноўка Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці.

Закончыў Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту, Мінскую вышэйшую партыйную школу. Заслужаны работнік сферы абслугоўвання Рэспублікі Беларусь.

Працаваў старшым прарабам БУ-61 будаўнічага трэста № 10 горада Гомеля, старшым прарабам упраўлення вытворча-тэхналагічнай камплектацыі вытворчага будаўніча-мантажнага аб'яднання «Гомельпрамбуд», загадчыкам аддзела камунальнай гаспадаркі Гомельскага гарвыканкама, галоўным інжынерам упраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі Гомельскага аблвыканкама, намеснікам начальніка вытворчага ўпраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі Гомельскай вобласці, намеснікам старшыні Гомельскага гарвыканкама, начальнікам упраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі Гомельскага аблвыканкама.

Узнагароджаны Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Светлагорская выбарчая акруга № 46

КАВАЛЁВА

Валянціна Іванаўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і сувязях з СНД.

Нарадзілася 27 красавіка 1957 года ў вёсцы Мірончанкі Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці.

Закончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Акадэмію кіравання пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Працавала намеснікам дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце сярэдняй школы № 7 горада Светлагорска, інструктарам ідэалагічнага аддзела Светлагорскага гаркама КПБ Гомельскай вобласці, намеснікам загадчыка аддзела адукацыі, намеснікам старшыні Светлагорскага гарвыканкама, намеснікам старшыні Светлагорскага райвыканкама.

Выбіралася дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

Узнагароджана медалямі «За працоўную доблесць», «За працоўныя заслугі», «За вернасць абавязку і Айчыне» (Расійская Федэрацыя), Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Хойніцкая выбарчая акруга № 47

ДАШКЕВІЧ

Георгій Віктаравіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанні.

Нарадзіўся 1 студзеня 1946 года ў горадзе Ельску Гомельскай вобласці.

Закончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі, Акадэмію кіравання пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Працаваў начальнікам Ельскага раёна электрычных сетак, намеснікам старшыні, старшынёй Ельскага райвыканкама, намеснікам старшыні, першым намеснікам старшыні Гомельскага аблвыканкама, галоўным саветнікам старшыні Гомельскага аблвыканкама.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны ордэнам Пашаны, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

СЕЛЬСАВЕТ ЧАКАЕ АДКАЗУ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

У мінулым годзе 6 зямельных участкаў Прылепскага сельсавета былі прададзены з аўкцыёну пад будаўніцтва жылых дамоў. Першы вопыт аказаўся ўдалым — ён прынёс мясцоваму бюджэту 300 мільёнаў рублёў. Тады ж натхнёны поспехам сельскі Савет падрыхтаваў да продажу з аўкцыёну яшчэ 40 участкаў. Але...

— Сёння, у адпаведнасці з рашэннем Саўміна, мы ўжо не можам выстаўляць на аўкцыён участкі, не забяспечаныя інфраструктурай. Інакш кажучы, спачатку сельскі Савет павінен пабудаваць там дарогі, пракласці трубы, правесці электрычнасць, а потым прадаваць зямлю, — тлумачыць Святлана Максіменка. — Але як гэта рэальна адолець? Адна толькі праектная дакументацыя абыдзецца нам больш чым у 100 мільёнаў рублёў! А дарогі? 1 км асфальтабетону каштуе 150 мільёнаў. А падвядзенне камунікацый, лініі электраперадачы?

Пакуль што пытанне з правядзеннем чарговага аўкцыёну застаецца адкрытым. У маі ўвайшоў у сілу Указ Прэзідэнта № 64, у адпаведнасці з якім сельскі Савет можа даваць участкі пад будаўніцтва **кожнаму жыхару Рэспублікі Беларусь, які мае патрэбу ў паляпшэнні ўмоў жылля, без правядзення аўкцыёну.**

У тым, што такіх ахвотных будзе шмат, Святлана Максіменка ўпэўнена — яны ўжо сёння «абрываюць» тэлефоны сельвыканкама. Але старшыня Савета не спяшаецца «раздаваць» зямлю (ці прадаваць па кадастравым кошце). Яна спадзяецца, што аўкцыён усё ж дазволяць правесці. Праўда, лёс 40 участкаў цяпер будзе вырашацца не мясцовымі ўладамі, а абласнымі.

— Мы ўжо напісалі хадайніцтва на вобласць пра тое, каб зямельныя ўчасткі, якія выклікаюць павышаную зацікаўленасць, усё ж дазволілі выстаўляць на аўкцыён. Таму што аўкцыён па продажы зямельных участкаў з'яўляецца адной з найбуйнейшых крыніц папаўнення даходнай часткі сельскага бюджэту, — лічыць Святлана Максіменка.

Наталля КАРПЕНКА.

Смалявіцкі раён.

ХТО І ШТО Ў ДЭФІЦЫЦЕ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Гэта вельмі важна, адзначае Надзея Мікуліч, паколькі сюды ўладкаваліся жанчыны, якія традыцыйна складаюць больш чым палову беспрацоўных. У мінулым годзе ў раённым цэнтры планавалі стварыць 130 новых працоўных месцаў, а стварылі 225 (усяго па раёне — 348). Сёлета, як спадзяюцца, паказчык будзе яшчэ большы. Прычым працоўныя месцы мяркуецца стварыць як на дзяржаўных прадпрыемствах, так і ў прыватным сектары.

Нават у тым выпадку, калі чалавек стаў беспрацоўным, можна зарабіць грошы. Сярод магчымых варыянтаў — грамадскія работы, якія, дарэчы, даволі нядрэнна аплачваюцца. Летась многія беспрацоўныя былі занятыя на добраўпарадкаванні райцэнтра. У сярэднім атрымлівалі па 500 тысяч рублёў у месяц, а асобныя і па мільёну зарабілі. Так што сёлета ад ахвотных трапіць на грамадскія работы адбою няма. Акрамя добраўпарадкавання беспрацоўныя таксама занятыя на пасадцы лесу, праполцы, перабіранні бульбы і г.д. Практыкуецца і перасяленне — летась на новае месца жыхарства пераехалі 6 чалавек. У вёсцы заўсёдны недахоп кадраў: цяпер патрабуюцца даяркі, трактарысты, жывёлаводы.

Праўда, заробкі ў АПК пакуль не надта высокія — па выніках мінулага года ў вяскоўцаў сярэднямесячная аплата працы склала 512 тысяч рублёў. А ў сярэднім па раёне яна складае 665 тысяч рулёў (дарэчы, гэта больш чым на чвэрць перавышае паказчык 2007 года).

Сёлета адзначаюцца даволі трывожныя тэндэнцыі — на некалькіх прадпрыемствах узраслі запасы гатовай прадукцыі. Праблемы ўзніклі на заводзе сценавых блокаў і камбінаце будаўнічых матэрыялаў. Прычына тут адна — калі летась будматэрыялы разыходзіліся як гарачыя піражкі (нават чарга была), то сёлета попыт зменшыўся. Магчыма, становішча зменіцца да лепшага, калі пачнецца будаўнічы сезон.

— Варта больш актыўна адпрацоўваць рынкі збыту, пашыраць геаграфію паставак, — адзначае Аляксандр Бойка. — Нельга сядзець і чакаць, што на прадукцыю «знойдзецца» пакупнік.

На Любаншчыне спадзяюцца прыцягнуць буйнога інвестара, магчыма нават замежнага. Сярод праектаў у межах сумеснага прадпрыемства можа стаць перапрацоўка грыбоў і ягад, а таксама агратурызм. Дарэчы, арганізацыяй адпачынку мяркуе заняцца адзін з мясцовых прадпрымальнікаў, які выкупіў некалькі закінутых будынкаў.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Любанскі раён.

СВІНОМУ ГРЫПУ — ЗАСЛОНУ НА МЯЖЫ

Пазачарговае пасяджэнне камісіі па надзвычайных сітуацыях Брэсцкага аблвыканкама было прысвечана пытанням профілактыкі новай сусветнай навалы, якую цяпер часцей, чым свіны грып, называюць нейтральна H1N1. Сайты інфармагенцтваў штодня прыносяць новыя звесткі пра хворых на небяспечную інфекцыю. А нашы людзі, паводле слоў галоўнага санітарнага ўрача вобласці Алега Арнаутава, актыўна ездзяць па свеце. Таму ў памежнай Брэсцкай вобласці пэўная рызыка завозу віруса заўсёды прысутнічае.

У сувязі з гэтым уведзены ў дзеянне план, так бы мовіць, асаблівай пільнасці і ўважлівасці работнікаў пагранічнай, мытнай і іншых службаў, якія першымі сустракаюць людзей на памежных пераходах. У пунктах пропуску Макраны, Казловічы, на чыгуначнай станцыі Брэст санітарна-каранцінныя пасты дзейнічаюць на пастаяннай аснове. Там ёсць медыцынскія работнікі. А на пераходах, дзе такіх пастоў няма, памежнікі і мытнікі павінны асабліва ўважліва прыглядацца да людзей, каб вызначаць тых, у каго дрэннае самаадчуванне. Далей службовыя асобы дзейнічаюць па інструкцыі. Чалавека з сімптомамі прастуды і грыпу патрэбна ізаляваць да высвятлення характару хваробы і вызначыць яго кола кантактаў.

Начальнік Брэсцкай пагранічнай групы Сяргей Брытаў расказаў, што пагранічныя нарады прайшлі адпаведны інструктаж. У выпадку выяўлення хворага транспартны сродак, на якім гэты чалавек прыбыў, неадкладна будзе адагнаны на спецыяльную пляцоўку, дзе да работы прыступіць медыцынскі персанал. А работнікі пагранатрада складуць спіс пасажыраў, якія маглі кантактаваць з хворым. Яшчэ палкоўнік Брытаў праінфармаваў прысутных аб тым, што брэсцкія памежнікі дамовіліся з польскімі калегамі аб поўным абмене інфармацыяй на выпадак выяўлення хворых на небяспечную інфекцыю.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Абітурыент-2009

ЗАРЭГІСТРАВАЦЦА НА ЦТ
МОЖНА І ПА СУБОТАХ...

У краіне распачалася рэгістрацыя абітурыентаў для ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні, якое пройдзе з 15 чэрвеня па 1 ліпеня. Адрасы пунктаў рэгістрацыі абітурыенты могуць знайсці на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў (www.rikz.unibel.by) або ў нумары «Звязды» за 17 красавіка.

Нагадаем, што ў гэтым годзе пры паступленні амаль што на ўсе спецыяльнасці (за выключэннем спецыяльнасцяў творчага, спартыўнага профіляў, журналістыкі і філалогіі) і на ўсе формы навучання (вячэрнюю, завочную і дыстанцыйную) уступныя іспыты будуць праводзіцца толькі ў форме цэнтралізаванага тэсціравання. Але прайсці цэнтралізаванае тэсціраванне можна не больш чым па трох прадметах, адзін з іх — абавязковы для ўсіх абітурыентаў экзамен па адной з дзяржаўных моў. Здаваць адначасова і беларускую, і рускую мову на ЦТ забараняецца. У тым выпадку, калі абітурыент зарэгіструецца для праходжання ЦТ больш чым па трох прадметах, ён будзе дапушчаны да здачы тэсціравання толькі па першых трох, якія стаяць у графіку правядзення тэсціравання.

Пункты рэгістрацыі будуць працаваць з 4 мая да 1 чэрвеня ўключна з 8 гадзін раніцы да 20 гадзін.

— Для таго, каб зарэгістравацца на ЦТ, зусім неабавязкова прапускаць школьныя заняткі, — падкрэсліў у гутарцы з журналістам «Звязды» **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ**. — Пункты рэгістрацыі будуць працаваць не толькі па працоўных днях тыдня, але і па суботах 16, 23 і 30 мая, а таксама ў нядзелю 31 мая. Да таго ж на нашым сайце абітурыенты змогуць знайсці інфармацыю аб колькасці свабодных месцаў у пунктах правядзення цэнтралізаванага тэсціравання па ўсёй краіне, якая будзе абнаўляцца адзін раз у суткі. Для больш рацыянальнага выкарыстання зарэзерваванага аўдыторнага фонду я папрасіў бы абітурыентаў рэгістравацца на ўсе дысцыпліны ў адным пункце рэгістрацыі — бліжэй да іх месца жыхарства ці цяперашняй вучобы. Не варта ствараць ажыятаж у першыя дні рэгістрацыі — пасадачных месцаў хопіць на ўсіх, яшчэ ніхто з абітурыентаў не быў пазбаўлены магчымасці здаць цэнтралізаванае тэсціраванне. Але я б усё ж такі не раіў адкладваць гэту важную справу на апошні момант і «штурмаваць» пункты рэгістрацыі 1 чэрвеня. Хоць, як сведчыць вопыт папярэдніх гадоў, заўсёды знойдзецца з дзясятак маладых людзей, якія прыйдуць у пункты рэгістрацыі ў першыя чэрвеньскія дні і будуць даказваць, што яны нічога не чулі пра тэрміны рэгістрацыі...

Для рэгістрацыі на цэнтралізаванае тэсціраванне абітурыент асабіста падае заяву на адной з дзвюх дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь (на свой выбар), дакумент аб унясенні платы за прыём і афармленне дакументаў для ўдзелу ў ЦТ і паказвае дакумент, які сведчыць яго асобу (пашпарт, від на жыхарства, пасведчанне бежанца ці афіцыйную даведку, якая выдаецца органамі ўнутраных спраў у выпадку страты ці крадзяжу дакумента, які сведчыць асобу). *Вадзіцельскае пасведчанне для рэгістрацыі не падыходзіць.* Абітурыенты, якія маюць права на вызваленне ад платы за прыём дакументаў і афармленне дакументаў для ўдзелу ў ЦТ, павінны дакументальна пацвердзіць сваё права на льготу: гэта можа быць пасведчанне інваліда, выпіска з медыцынскіх дакументаў, даведка аб месцы жыхарства і складзе сям'і (калі ў сям'і выхоўваюцца трое і больш дзяцей), дакументы, якія пацвярджаюць наяўнасць статусу ў дзяцей-сірот, дзяцей, якія засталіся без бацькоўскай апекі, пасведчанне аб праве на льготы асобаў з сем'яў вайскоўцаў, работнікаў органаў МУС і г.д., якія загінулі ці сталі інвалідамі пры выкананні воінскіх і службовых абавязкаў.

Прыём плацяжоў за рэгістрацыю на тэст-экзамены ажыццяўляецца ў любой ўстанове «Беларусбанка». Сума платы за прыём і афармленне дакументаў складае 10 тысяч рублёў за адзін вучобны прадмет. Пры ўнясенні платы абітурыентам трэба быць максімальна ўважлівымі: *грошы павінны паралічвацца на рахунак той навучальнай установы, на базе якой абітурыент будзе праходзіць цэнтралізаванае тэсціраванне.* Трэба мець на ўвазе, што пунктаў рэгістрацыі (асабліва ў сталіцы) значна менш, чым пунктаў правядзення ЦТ. *Таму навучальная ўстанова, на базе якой працуе пункт рэгістрацыі, і месца праходжання абітурыентам ЦТ могуць не супадаць!!!*

Замежныя грамадзяне і грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць за мяжой, маюць права накіраваць у пункт рэгістрацыі па пошце ксеракопію дакумента, які сведчыць іх асобу, і заяву, запоўненую па пэўнай форме (яе ўзор можна скачаць на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў). А квітанцыю аб унясенні платы за афармленне дакументаў і арыгінал дакумента, які сведчыць асобу, яны павінны паказаць ужо пры атрыманні пропуска.

Як зазначыў Мікалай Фяскоў, да заканчэння тэрміну рэгістрацыі абітурыент мае права здаць пропуск ці абмяняць яго на пропуск па іншай дысцыпліне. Пропуск лічыцца зарэгістраваным, калі на ім ёсць пячатка ўстановы, вызначанай пунктам правядзення тэсціравання, подпіс упаўнаважанага прадстаўніка пункта рэгістрацыі і ўказаны рэгістрацыйны нумар. У выпадку страты пропуска абітурыенту выдаецца яго дублікат.

Тыя абітурыенты, якія па ўважлівай прычыне прапусцяць цэнтралізаваны тэст-экзамен у асноўны дзень, змогуць прайсці ЦТ у рэзервовы дзень — 6 ліпеня. Перарэгістрацыя на рэзервовы дзень будзе весціся з 25 чэрвеня па 2 ліпеня ў Брэсцкім дзяржаўным тэхнічным універсітэце, Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце, Гомельскім дзяржаўным тэхнічным універсітэце, Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я.Купалы, Беларуска-Расійскім універсітэце і ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Цэнтралізаванае тэсціраванне ў рэзервовы дзень будзе праходзіць для абітурыентаў з усёй краіны ў сталіцы, на базе БДУ, і здаць 6 ліпеня можна будзе толькі адну дысцыпліну. Прычым сваё права скарыстацца рэзервовым днём давядзецца даказваць дакументальна...

Надзея НІКАЛАЕВА.

Аляксандр СУРЫКАЎ: **Рэгіёны Расіі — у Беларусі**

«Сярэднія і малыя кампаніі — гэта той рэзерв, які можа дадаць дынамікі ў нашых гандлёва-эканамічных адносінах»

Фота БЕЛТА.

Эканамічнае супрацоўніцтва з Расіяй, як вядома, з'яўляецца адным з найважнейшых вектараў знешнегандлёвай дзейнасці Беларусі. Летась таваразварот паміж дзвюма краінамі склаў 35 мільярдаў долараў — амаль палову ўсяго беларускага аб'ёму знешняга гандлю. Сёлета бакі маюць намер узаемадзейнічаць не менш паспяхова. Але фінансавы і эканамічны крызіс, безумоўна, не можа не адбіцца на рэалізацыі намечаных планаў гандлёва-эканамічнага і навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва. Якія захады неабходна рабіць сёння з абодвух бакоў, каб мінімізаваць наступствы крызісу? З гэтым і шэрагам іншых пытанняў наш карэспандэнт звярнуўся да Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Аляксандра СУРЫКАВА.

— Калі ў першую частку пытання закладваецца сэнс паслаблення такога ўзаемадзеяння пад уплывам сусветнага крызісу, то я адназначна заявіў бы, што праблемы, звязаныя з гэтым прыроўненым звонку ў нашы эканомікі «вірусам» нестабільнасці, толькі падштурхоўваюць нас да больш цеснага супрацоўніцтва і не толькі на ўзроўні выканаўчай улады, але найперш у фармаце гаспадарчых суб'ектаў і ў фінансавым сектары. Тое, што яшчэ ўчора можна было зрабіць кожнаму самастойна, сёння — і гэта відавочна — больш эфектыўна рабіць сумесна. Менавіта па гэтым шляху ідуць урады нашых краін, якія прыкметна актывізавалі каардынацыю антыкрызісных мераў, у тым ліку і на міжведамасным узроўні, і ў рамках спецыяльна створаных рабочых груп пад старшынствам намеснікаў кіраўнікоў урадаў Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь. Зразумела, што цяпер адпрацоўваюцца механізмы ўзгодненых дзеянняў, таму, магчыма, не ўсё атрымліваецца рабіць у першапачаткова закладзеныя часавыя рамкі. Аднак радуе тое, што бакі нацэлены на аператыўнае дасягненне ўзаемапрымальных рашэнняў.

Асобна хацеў бы спыніцца на міжрэгіянальных сувязях. Шчыльная тканіна гэтага ўзроўню ўзаемадзеяння, якая фарміравалася ў апошнія гады намаганнямі беларускага і расійскага бакоў, сталася вельмі да месца ў няпростых умовах сусветных эканамічных узрушэнняў. Гэта наш дадатковы рэсурс, які дазваляе мінімізаваць крызісныя выдаткі і выпрацоўваць сумесныя механізмы ўзаемавыгаднай падтрымкі.

— Якія карэктывы, на ваш погляд, неабходна цяпер унесці ў арганізацыю планавання і рэалізацыю сумесных беларуска-расійскіх праектаў?

— Тут, відаць, можна казаць аб розным узроўні сумесных праектаў — у рамках Саюзнай дзяржавы і адпаведнага бюджэту, а таксама аб праектах капераційнага і партнёрскага ўзаемадзеяння паміж гаспадарчымі суб'ектамі. Што да саюзных праграм, то іх рэалізацыя можа быць падкарэктавана ў бок большай аддачы ва ўмовах крызісу. Дарэчы, гаворка пра гэта ішла і на нядаўняй сумеснай калегіі міністэрстваў фінансаў нашых бакоў. Думаю, адпаведныя рэкамендацыі будуць прадстаўлены фінансавымі ведамствамі на бліжэйшае пасяджэнне Саюзнага ўрада.

Што да суб'ектаў гаспадарання, то на гэтым узроўні, як гэта і падказвае сусветная практыка, відаць, больш пільная ўвага павінна надавацца працэсам узбуйнення і зліцця як унутры нашых краін, так і на двухбаковым узроўні. У многіх выпадках гэта дапаможа выжыць нашым вытворцам ва ўмовах больш жорсткай сусветнай канкурэнцыі і зніжэння плацежаздольнага попыту. Праца ў гэтым кірунку вядзецца.

— Лічыцца, што развіццё вытворчай капераціі ў выглядзе стварэння сумесных прадпрыемстваў і вытворчасцяў у розных сферах у кантэксце развіцця рэальнага сектара эканомікі Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь можа ў немалой ступені змякчыць уздзеянне крызісу. Якія перспектывы бачацца ў гэтай сувязі ў плане ўмацавання беларуска-расійскіх рэгіянальных інтэграцыйных сувязяў?

— Я ўжо закрануў гэтую тэму ў частцы ўзаемадзеяння гаспадарчых суб'ектаў. Безумоўна ж, гаворка тут ідзе і пра падтрымку з боку ўрадаў нашых краін, а таксама і пра дапамогу на ўзроўні рэгіянальных уладаў. Другое, напэўна, асабліва важна, бо «знізу» больш бачна, што канкрэтна можна і трэба было б зрабіць з улікам спецыфікі вытворчага і навуковага патэнцыялу кожнага рэгіёна. Невыпадкова вынікам гэтых намаганняў сталі вытворчасці па зборцы трактароў, велікагрузных аўтамабіляў, тралейбусаў і ліфтаў, намечаны планы па электратранспарце, пагрузчыках, дарожнай тэхніцы, камерцыйных аўтамабілях і спецтранспарце для патрэбаў чыгункі.

— Ва ўмовах крызісу і ў Рэспубліцы Беларусь, і ў Расійскай Федэрацыі істотным чынам мяняецца роля малога і сярэдняга бізнэсу, які павінен стаць своеасаблівай «падушкай бяспекі» для простых грамадзян нашых краін. Якія сумесныя праграмы супрацоўніцтва і па якіх напрамках у гэтай сувязі маглі б прапанаваць прадстаўнікам беларускага прадпрымальніцтва малыя і сярэднія прадпрыемствы і індывідуальныя прадпрымальнікі расійскіх рэгіёнаў?

— Вы закранулі цікавую і патрэбную тэму. Апошнім часам прыкметна, што ў Беларусі ўсё больш увагі надаецца гэтаму сектару эканомікі. Гэтае разуменне асабліва павялічылася ва ўмовах крызісных праяўленняў. Малыя суб'екты гаспадарання ўсё ж больш «гнуткія» структуры, здольныя хутчэй пераналаджвацца і прыстасоўвацца да зменлівых умоў працы. У Расіі ўрад таксама значную дапамогу аказвае гэтаму сектару эканомікі, які ва ўмовах крызісу падтрымлівае стабільнасць і дзесьці замяняе тыя страты, якія непазбежныя ў буйных вытворчых структурах.

Што да ўзаемнай дапамогі на гэтым узроўні паміж нашымі краінамі, то, мабыць, фармат індывідуальных прадпрымальнікаў усё ж найперш арыентаваны на лакальныя рынкі ўнутры кожнай з нашых краін. Наўрад ці яго можна разглядаць у якасці лакаматыву двухбаковых адносінаў. А вось сярэднія і малыя кампаніі — гэта той рэзерв, які можа дадаць дынамікі ў нашых гандлёва-эканамічных адносінах. Праўда, працаваць гэтым прадпрыемствам на «іншай» тэрыторыі з-за найперш абмежаванасці рэсурсаў даволі складана. Пакуль праца ў асноўным засяроджана ў сферы паслуг, інфармацыйных тэхналогій і прымяненні новых распрацовак. Гэта правільны напрамак, але спектр прапаноў можа быць шырэйшым і ў большай ступені арыентавацца на патрэбы рэальнага сектара. Таму наша задача — усяляк дапамагаць развіццю сувязяў на гэтым узроўні.

Гутарку вёў Барыс ЗАЛЕСКІ.

САЧЫЦЕ ЗА РАСКЛАДАМ РУХУ

У сувязі з правядзеннем пуцавых работ 6 і 7 мая электрацягнік Брэст — Мінск-Пасажырскі адпраўленнем на 6.44, адпраўленнем з Баранавічаў на 10.52 будзе прыбываць на прыпыначны пункт Інстытут культуры.

6 мая электрычка Мінск, Інстытут культуры — Барысаў адпраўленнем на 8.38 будзе ісці да станцыі Жодзіна, а электрацягнік Барысаў — Мінск, Інстытут культуры адпраўленнем на 13.24 адмяняецца на ўчастку Барысаў — Жодзіна.

7 мая электрычка Мінск — Асіповічы адпраўленнем на 13.17 будзе ісці толькі да станцыі Талька, а Асіповічы — Мінск адпраўленнем на 15.59 адмяняецца на ўчастку Асіповічы — Талька. Электрацягнікі Асіповічы — Мінск адпраўленнем на 10.31 і Талька — Мінск адпраўленнем на 10.34 будуць прыбываць на прыпыначны пункт Інстытут культуры. Электрычка Мінск — Брэст адпраўленнем на 9.51 будзе ісці без заходу на станцыю Баранавічы-Пол.

7 і 8 мая электрацягнік Мінск, Інстытут культуры — Орша адпраўленнем на 10.42 будзе ісці да станцыі Крупкі, а Орша — Мінск адпраўленнем на 11.38 адмяняецца на ўчастку Орша — Крупкі.

Дадаткова прызначаецца пасажырскі цягнік 551/412 Масква — Мінск — Масква адпраўленнем з Масквы 9 мая ў 0.37, прыбыццём у Мінск у гэты ж дзень у 10.24, адпраўленнем у 12.50, прыбыццём у Маскву 10 мая ў 1.09.

Паводле інфармацыі Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі, на ўчастках Мінск — Маладзечна, Мінск — Асіповічы, Мінск — Баранавічы, Мінск — Орша рух прыгарадных цягнікоў будзе арганізаваны: 9 мая — па раскладзе суботы, 10 мая — па раскладзе нядзелі.

У Маладзечанскім вузле і на ўчастку Орша — Лепель 9 і 10 мая электрычкі будуць хадзіць як па выхадных днях.

Пакуль рамантуюць пуці на тракце

На перыяд рэканструкцыі трамвайнага пуці па сталічным Лагойскім тракце, якая будзе доўжыцца з 4 мая па 2 ліпеня, на ўчастку ад разваротнага кола па вуліцы Валгаградскай да разваротнага кола па вуліцы Сядых у работу гарадскога пасажырскага транспарту ўносяцца змяненні.

У прыватнасці, рух трамваяў маршрутаў №1, 5 з боку плошчы Мяснікова і ДС «Возера» адпаведна арганізуецца да разваротнага кола па вуліцы Валгаградскай. Работа трамваяў маршрутаў № 6, 11 не плануецца.

З мэтай кампенсацыі знятага трамвайнага руху будзе арганізаваны часовы аўтобусны маршрут № 141В «ДС «Карбышава» — вул. Чайкоўскага» з рухам па вуліцы Карбышава, Лагойскім тракце, вуліцах Валгаградскай, Кнорына ў абодвух напрамках з выкананнем усіх прыпыначных пунктаў па трасе.

Сяргей РАСОЛЬКА.

А на мой погляд...

«Адносна будучыні прагнозы даволі спакойныя: простае насельніцтва крызіс моцна не закране»

Якія «ахоўныя механізмы» вы задзейнічалі (або не) у сваім жыцці ў сувязі з фінансавым крызісам: пераглядзелі сямейны бюджэт, часова адмовіліся ад нейкіх буйных пакупак, знайшлі падпрацоўку і г.д.?

Людміла КЛІМОВІЧ, начальнік планавага аддзела РУП «Валожынскі жылкамунгас»:

— Так ужо востра крызіс мы, на шчасце, пакуль не адчулі. Калі глядзіш навіны па тэлебачанні пра масавыя звальненні ў іншых краінах свету, тады сапраўды робіцца страшна. У нас, вядома, нашмат спакайней. Хоць праявы крызісу назіраюцца і тут. Напрыклад, апошнія тры гады запар летам мы ад нашай арганізацыі ездзілі адпачываць у Адэсу. Сёлета, гэта ўжо канчаткова вырашана, такой вандроўкі не будзе. Адчуваецца, што падаражэлі прадукты харчавання, квартплата. А заробкі ў доларавым эквіваленце знізіліся, ды і ў рублёвым у камунальнай гаспадарцы яны былі не самымі вялікімі. Ну, ды не ўсё так сумна (смяецца), жыццё, як кажуць, працягваецца!

Яўген КРАМКО, начальнік жыллёвага аддзела Стаўбцоўскага райвыканкама:

— У нашай сям'і гэта слова — крызіс — практычна ніхто не ўжывае. Мы звыклыя да працы на зямлі, маем сваю гаспадарку. Як працавалі, так і працягваем працаваць. Натуральна, зараз асноўны ўпор зрабілі на спажыванне прадукцыі, вырашчанай і нарыхтаванай уласнымі рукамі. У крамах набываем толькі тавары першай неабходнасці, нейкіх харчовых далікатэсаў ужо менш купляем. Балазе, буйныя пакупкі — тую ж пральную машыну — паспелі зрабіць раней. У сына ёсць машына, дык без асаблівай патрэбы імкнёмся ёй не карыстацца, трэба ў Мінск ці ў Нясвіж, дык можна і грамадскім транспартам даехаць. На поўдзень адпачываць сёлета ехаць не плануем, увогуле вырашылі, што цудоўна адпачыць можна і ў Беларусі, вунь колькі прыгожых мясцін у нас ёсць. Дарэчы, раней мы часцей на прыроду з сябрамі выязджалі нейкія святы адзначаць, цяпер жа больш часу бавім у коле сям'і, дзяцей. Якія яшчэ рэцэпты? Жонка, магчыма, лішнюю сукенку зараз не купіць, каб павесіць у шафу (*смяецца*). У люстры раней гарэла пяць лямпачак, зараз — дзве. А ўвогуле, скажу вам шчыра, не так ужо моцна мы пакуль адчулі той крызіс. У бядоце не жывём!

Алена БУРУНДУКОВА, інжынер-гідролаг Гомельскага аблгідрамета:

— Першыя два варыянты з названых вамі: пераглядзелі сямейны бюджэт і часова — на гэты момант — адмовіліся ад буйных пакупак, былі ў нас тут пэўныя планы. Калі гаварыць пра магчымасць падпрацоўкі, дык асабіста для мяне такі варыянт не падыходзіць, бо я амаль увесь дзень праводжу на працы. А вось з боку мужа ён задзейнічаны: падпрацоўкі знаходзіць і працуе. На дачы мы і дагэтуль увесь час і працавалі, і адпачывалі, тут нічога не змянілася. Павялічваць пасяўныя плошчы?! Барані Божа (*смяецца*).Трэба ж нешта і для прыгажосці рабіць, каб вока цешыла! Праблемы былі заўсёды, і да крызісу ў тым ліку. Ён нас пакуль не вельмі моцна закрануў.

Аляксандр МЕЛІХАВЕЦ, начальнік філіяла «Ганцавіцкі райпалівазбыт»:

— Мы хоць і гарадскія жыхары, але маем свой дамок, участак. Сёлета з жонкай ужо паспелі набыць трох парсючкоў, каб самім вырошчваць. Куры-нясушкі ў нас і летась былі, але цяпер мы яшчэ іх прыкупілі. Плануем, калі атрымаецца, завесці трусоў пароды «Велікан» — няшмат, але каб былі на мяса свае. Карову пакуль, вырашылі, не «пацягнем», бо трэба ж і на працу хадзіць. Можа, калі пазней. Я, дарэчы, мару і парсючкоў самастойна разводзіць, гэта ж выгадна. Але гэта ўжо як атрымаецца, як Бог дасць. Літаральна за два дні да Вялікадня пасадзілі на ўчастку соткі чатыры бульбы — каб маладую рана мець. Але ж хочам яшчэ колькі бульбы пасадзіць, у нас даюць ахвотным соткі. Зразумела, будзем вырошчваць і памідоры з агуркамі, і буракі з морквай, і цыбулю з часнаком. Папрацаваць, безумоўна, давядзецца, але ж, паглядзіце, практычна ўсё можна мець сваё, у краме трэба будзе набываць мінімум з неабходнага.

Ларыса ЗАХАРАВА, пенсіянерка, г. Маладзечна:

— Гэтае пытанне — як крызіс адбіўся на нас — я ўжо абмяркоўвала сама з роднымі, знаёмымі. Прыйшлі да высновы, што нас ён не вельмі зачапіў. Сястра з Мурманска пераехала сюды жыць, яна гэтак жа лічыць. У нас усё як было, так, па вялікім рахунку, і засталося. У сямейны бюджэт па-ранейшаму ўкладваемся, хоць памер тых жа пенсій не павялічыўся. Магчыма, усё з-за таго, што выдаткі ў пенсіянераў і да таго былі сціплымі, грошы ішлі на самае неабходнае? У нас жа ўжо і патрабаванні не тыя, што ў моладзі. Мяркую нават па сваіх дзецях, якім часам і павесяліцца хочацца, на прыроду з'ездзіць адпачыць, а гэта ж усё патрабуе пэўных сродкаў. Здаецца, нядаўна ў нашым Палацы культуры выступаў Вінакур, самыя танныя білеты каштавалі больш за 50 тысяч рублёў. Напрыклад, мая дачка жыве ў Гомелі, дык любіць хадзіць у тэатр, у музеі, у іх цырк там ёсць. Хоць часу асабліва, шчыра скажу, на такое бяўленне часу ў іх няма: працуюць без выхадных. Зразумела, выручае нас і дача: бульбу не купляем, свая гародніна, хатнія нарыхтоўкі ёсць. Адносна будучыні ў мяне прагнозы даволі спакойныя. Я думаю, што большасць простага насельніцтва, невялікія прадпрыемствы крызіс моцна не закране. Мой муж — пенсіянер, але падпрацоўвае, у іх на фірме каля 300 работнікаў. Дык паколькі яны звязаны з Расіяй, гэта прадпрыемства негатыўныя з'явы крыху зачапілі. Але ў цэлым, паўтаруся, сітуацыя даволі спакойная ў нас, у адрозненне ад іншых краін.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

Чаму б і не

Бог дапаможа, але...

У Баранавічах ёсць шэраг перакрыжаванняў вуліц, на якіх здараюцца аўтааварыі.

Мясцовыя супрацоўнікі ДАІ вырашылі змяніць сітуацыю да лепшага і папрасілі настаяцеля храма Святых Жонак-Міраносіц асвяціць самыя небяспечныя для аўтатранспарту перакрыжаванні горада.

З малітвай святар акрапіў святой вадой не толькі перакрыжаванні, але і супрацоўнікаў ДАІ, якія прысутнічалі на гэтым мерапрыемстве.

Па першым часе пасвянцілі толькі пяць перакрыжаванняў, а яшчэ некалькі будуць пасвенчаны пазней.

Са студзеня па сакавік гэтага года ў горадзе здарылася 186 аўтааварый, і хочацца верыць, што пасля царкоўнага абраду дарожна-транспартныя здарэнні пойдуць на спад.

Бог дапаможа, але Усявышні не будзе наносіць разметку на тых жа перакрыжаваннях — знайсці ў горадзе пераход, на якім была б добра бачная «зебра» — няпроста.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА

МАСАВЫ КОНКУРС РАШЭННЯЎ

Заданне № 11

Белыя: Крe5, Фb8, Са2, Кс4, Кd3 (5). Чорныя: Крa1, Кс3, Кd1, пп. с6, е4 (5).

Мат за 4 хады (3 ачкі).

Заданне № 12



Белыя: Крf4, Ла7, Ле5, Сf5, Сf6, Кb6, Кh4, пп. с4, е2 (9). Чорныя: Крd6, Ле8, Сd7, пп. с5, с6, с7, d4, e6, f7, g4, h5 (11).

Мат за 4 хады (3 ачкі).

КАЗАЧНЫЯ ШАХМАТЫ

Шахматная кампазіцыя падзяляецца на дзве вялікія і самастойныя галіны развіцця — артадаксальную (задачы на прамы мат і эцюды) і казачную (задачы са змененым заданнем, формай дошкі, новымі фігурамі і г.д.). У нас у краіне папулярныя толькі задачы на кааператыўны і на зваротны мат. Што сабой уяўляюць такія віды задач?

Звернемся да прыкладаў. У. Сычоў 2008 г. **Белыя:** Крa3, Ла6, Са8, п. d7 (4). **Чорныя:** Крd8, Фе2, Ле7, Ла7, Сg6, Кс7, пп. с6, d6, f5, h5 (10). Кааператыўны мат за 2 хады.

а) дыяграма, b) без Са8, с) у пазіцыі «b» пешку d6 паставіць на поле с7, d) у пазіцыі «с» памяняць месцамі Ла6 і п. h5.

У такіх задачах першыя ход робяць чорныя. Іх мэта — дапамагчы белым аб'явіць мат беламу каралю; г.зн. разам, агульнымі намаганнямі выканаць умовы.

У прапанаваных задачы гэтая мэта дасягаецца наступным чынам: а) 1. Ле8 деЛ 2 . Крd7 С:е6х; b) 1. Ке8 деК 2. Лd7 Ла8х; с) Се8 деС 2. Ла8 Л:а8х; d) Лf7, Лh8+ 2. Фе8 деФх.

Ва ўсіх гэтых задачах-блізнятах — правільныя маты.

Задачы на кааператыўны мат вядомыя з даўніх часоў. Першая кніга са зборам падобных кампазіцый М. Ланга датуецца 1854 годам.

У задачах на адваротны мат пачынаюць белыя і прымушаюць чорных аб'явіць мат беламу каралю.

Прыклад. Z. Sibinovic, 2008 г. **Белыя:** Крe1, Лс6, Лf4, Ке6, пп. b7, f5 (6). **Чорныя:** Крe3, пп. d3, d7, e2 (4). Адваротны мат за 2 хады.

1. b8С! dc 2. 2. Кс5 d2х; 1. ... de 2. fe 1. ... d5 Кd4, 1. ... d6 2. С:d6! Нельга 1. b8Ф? з-за 1. ... d6!

Да казачных шахмат адносяцца таксама задачы на пат, максімумеры, задачы на рэфлексны мат, т.зв. «цвыркуны», мадрасі і іншыя.

Для шахматыстаў-практыкаў свет казачных шахмат — звычайная простая забава, а калі ўнікнуць глыбей, то таксама будзе цікава ведаць іх і рашаць кампазіцыі.

700 П'ЯНЫХ ВАДЗІЦЕЛЯЎ

За мінулыя выхадныя супрацоўнікі ДАІ выявілі звыш 700 выпадкаў кіравання транспартнымі сродкамі ў стане алкагольнага ап'янення. У рэспубліцы зафіксавана 47 дарожна-транспартных здарэнняў, у якіх загінулі 11 чалавек і паранены 49.

1 мая жыхар вёскі Кушляны Смаргонскага раёна рухаўся на трактары (дарэчы, без пасведчання трактарыста-машыніста). Пры выкананні павароту налева вадзіцель не саступіў дарогу і наехаў на веласіпедыстку, якая рухалася насустрач па краі праезнай часткі. У выніку веласіпедыстка загінула на месцы здарэння.

3 мая каля 4.30 студэнт, жыхар Мінска, кіруючы аўтамабілем «Аўдзі-80» у вёсцы Кузьмічы Любанскага раёна, выехаў на паласу сустрэчнага руху і наехаў на пешахода, які загінуў на месцы здарэння. Вадзіцель з месца здарэння ўцёк, аднак у хуткім часе быў знойдзены і затрыманы.

Святлана БАРЫСЕНКА.

У аснове арнаменту беларускага сцяга — бівень маманта

Рамбічны арнамент, які прысутнічае на дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь, існаваў яшчэ 12 тысяч гадоў таму, калі на зямлі жылі маманты. Пра гэта на прэс-канферэнцыі «Развіццё беларускай геральдыкі ў Рэспубліцы Беларусь. Вытокі беларускай сімволікі» журналістам паведаміў **доктар гістарычных навук, член Геральдычнага савета пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Сяргей РАСАДЗІН**. Паводле яго слоў, арнамент яскрава бачны пры зрэзе біўня маманта Mammutus primi genius.

«Арнамент мае глыбокую гісторыю, яго элементы прасочваюцца нават у культуры цывілізацыі Цэнтральнай Азіі і Кітая (яго выкарыстоўвалі земляробы. — **І.Л.**) Некаторыя кажуць пра ісламскае прачытанне нашага сцяга, але гэта не так. У сваёй новай кнізе «Гістарычныя вытокі і лёсы дзяржаўных сімвалаў Беларусі» я прыводжу шэраг аргументаў на карысць хрысціянскага бачання сцяга. Чырвоны колер — гэта колер пакутніцтва, вечнага жыцця; зялёны — гэта сімвал вечнасці (колер пальмы, якая асвячаецца ў Пальмовую нядзелю — **І.Л.**)». Герб Радашковічаў, на выяве якога ёсць абодва хрысціянскія элементы, Сяргей Расадзін прыводзіць у якасці пацвярджэння сваім здагадкам. Мы павінны належным чынам ставіцца да сваёй гісторыі, — падкрэсліў навуковец.

«Усе гербы і сцягі нашай краіны ўваходзяць у дзяржаўны геральдычны рэестр, за які адказвае Дэпартамент па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі, — кажа **сакратар Геральдычнага савета пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Марына ЕЛІНСКАЯ**. — І перш чым дакументы па той ці іншай геральдычнай сімволіцы паступяць на разгляд Геральдычнага савета, яны вывяраюцца і ўзгадняюцца з мясцовымі жыхарамі тых канкрэтных населеных пунктаў».

Пачынаючы з 1998 года, паводле слоў Марыны Елінскай, была распачата праца па стварэнні дзяржаўных гербаў і сцягоў тэрытарыяльных адзінак, перш за ўсё гарадоў і гарадскіх пасёлкаў. Сёння ў краіне па тэрытарыяльным падзеле сваю сімволіку мае наступная колькасць населеных пунктаў:

Брэсцкая вобласць — 31,
Віцебская вобласць — 49,
Гомельская вобласць — 38,
Гродзенская вобласць — 25,
Магілёўская вобласць — 31.
Мінская вобласць — 32.

Сёлета Дзень Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга будзе адзначацца 11 мая.

Ілья ЛАПАТО.

Купі-прадай

НА АЎТАРЫНКУ ЗАЦІШША

Аўтамашын прадаецца вельмі многа і для гэтага не абавязкова ехаць на рынак — шмат гаспадароў вывешваюць аб'явы на сваіх «Аўдзі», «Опелях»... аб іх продажы і раз'язджаюць з гэтымі наклейкамі. Раней такое назіралася, але не так масава.

Калі рынак перанасычаны аўтамашынамі, то і цана на іх павінна ўпасці, але аказалася не зусім так.

Наведаў аўтарынак «Зорны» на ўскраіне Баранавічаў і адзначыў, што аўтамашын коштам да 4 тыс. долараў амаль няма. У асноўным цана хістаецца ў межах 4,5-7 тыс. долараў. Пагаварыў з маладымі хлопцамі з Нясвіжа, якія выставілі свой «Сітраен». Сказалі, што прыязджаюць на рынак ужо чатыры разы запар, але ніхто за гэты час нават не пацікавіўся іх аўтамабілем.

Мужчына з Карэлічаў прадаваў «Форд-Мандэо», а да гэтага спрабаваў яго збыць на аўтарынку ў Ждановічах. Машына, нягледзячы на 1997 год выпуску, у добрым стане, і гаспадар гатовы нават прадаць яе менш чым за чатыры тысячы «баксаў», але пакупнікоў няма.

Прадаўцы сядзяць за рулём ці тусуюцца перад аўтамашынамі па 2-4 чалавекі і з надзеяй пазіраюць на кожнага, хто зверне ўвагу на аўтамашыну.

Было каля 12 гадзін і, здавалася б, наступіў самы разгар гандлю, а людзей на рынку вельмі мала, я не кажу ўжо пра пакупнікоў, нават цікаўных адзінкі. Пройдзе невялічкая групка паміж радоў і хоць бы затрымалася каля нейкай машыны.

А калі тую машыну купляць, калі не ў апошні месяц вясны?!

Відаць, многія, хто хацеў бы набыць сабе аўтамабіль, вырашылі перачакаць. Такім жа чынам дзейнічаюць і тыя, хто хацеў бы памяняць сваю старую аўтамашыну на больш новую. Сярод апошніх апынуўся і я.

У кожнага свой бізнэс.

12 гадзін — зацішша.

Мой «Форд» пакуль што без вялікіх праблем, а каб яго прадаць ды купіць аўтамашыну маладзейшую, напрыклад, дзевяцігадовую, то трэба будзе даплаціць 1,5-2 тыс. долараў. А якая тут выгада? Бегае, то і добра. Неабходна перажыць гэты крызісны перыяд, ды і фінансавая будучыня неакрэсленая. А там відаць будзе.

І так думаю не толькі я.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.
Фота аўтара.

ЗВЯЗДА 6 мая 2009 г.

УЗВЯДЗЕННЕ БЕЛАРУСКАЙ АТАМНАЙ СТАНЦЫІ МОЖА СТАЦЬ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭЯЙ

Трэст, які пабудаваў гіганты нафтахіміі ААТ «Гродна-Азот» і ААТ «Хімвалакно» ў Гродне, тонкасуконны камбінат там жа і заводы такарных патронаў, аўтаагрэгатаў і гармалзавод, Скідальскую птушкафабрыку, а таксама шматлікія іншыя важныя народнагаспадарчыя аб'екты, гатовы падставіць плячо для выканання новай дзяржаўнай задачы.

Спецыяльны карэспандэнт «Звязды» гутарыць з генеральным дырэктарам ААТ «Гроднапрамбуд» заслужаным будаўніком Рэспублікі Беларусь Абдулвагабам Ісакавічам ВАГАБАВЫМ

— Як вы ацэньваеце мінулы год і пачатак гэтага года, Абдулвагаб Ісакавіч?

— Мінулы год завяршылі паспяхова, перавыканалі ўсе даведзеныя паказчыкі. Яшчэ раз пацвердзілі тую стабільнасць, якая характэрна для дзейнасці калектыву на працягу многіх гадоў, дзякуючы чаму ёсць прадказальнасць вынікаў работы, ва ўсякім разе, з 2002 года. Мы з'яўляемся адной з вядучых будаўнічых арганізацый рэспублікі, знаходзімся на перадавых пазіцыях у галіне. Напрыклад, па выніках работы за мінулы год займаем другое месца па міністэрстве па аб'ёмах выкананых работ. А прадукцыйнасць працы «Гроднапрамбуда» высокая нават па сусветных мерках.

Акцыянернае таварыства — шматпрофільная арганізацыя (гэта па-першае) з моцнай дапаможнай вытворчасцю (па-другое), і мы вельмі мала залежым ад знешніх фактараў: ад пастаўкі матэрыялаў, ад субпадрадных арганізацый. Нашы будаўнічыя ўпраўленні і іншыя вытворчыя падраздзяленні прыкладна на 95 працэнтаў выконваюць работы ўласнымі сіламі, што дазваляе скарачаць іх тэрміны. Бо калі працуюць розныя арганізацыі, то хапае ўсялякіх непаразуменняў, складана мабілізаваць рэзервы. А тут, у сваім калектыве, бачым ўласныя рэзервы і выкарыстоўваем іх.

Калі гаварыць крышку шырэй пра шматфункцыянальнасць, то «Гроднапрамбуд» пайшоў па такім шляху: на базе УВТК і завода ЖБК створаны ўласныя вытворчасці. Сёння дзейнічаюць магутнасці па выпуску вокнаў з ПВХ, па вырабе фарбаў і шпаклёвак, па выпуску дзвярэй з МДФ. Нядаўна створанае падраздзяленне «Спецбудмантаж» узяло на сябе выраб і мантаж усіх канструкцый з металу (фермы, калоны, фігурныя агароджы лесвіц, наружныя агароджы, у тым ліку для дарог, раздзяляльныя палосы). Гэта ў дадатак да таго, што працуе цэх металаканструкцый на заводзе ЖБК.

«Спецбудмантаж» займаецца таксама і выпускам пенаполістэролу, які нам патрэбен у вялікіх аб'ёмах.

Стварылі ўпраўленне «Спецэнерга», якое спецыялізуецца на электрамантажных работах. Сантэхніку манцыруем таксама самі. Геадэзію выконваем самі. Выпускаем нават сухія будаўнічыя сумесі. Упраўленне механізацыі акрамя асноўных сваіх абавязкаў вядзе яшчэ і будаўніча-мантажныя работы. Будзем атрымліваць ліцэнзію на мантаж ліфтаў і прамысловых трубаправодаў.

Задача такая: мы павінны ўсё ўмець і ўсё выконваць. Бо нельга раскідвацца аб'ёмамі, некаму іх аддаваць. Час дыктуе такую лінію паводзінаў. Яна правільная не толькі таму, што не патрэбна падстройвацца пад некага, але і таму, што атрымліваецца больш танна для заказчыка. Так што мы сапраўды шматпрофільная арганізацыя — ад будаўніцтва да гандлю. Чаму да гандлю? Маем свае прадпрыемствы грамадскага харчавання, аб'яднаныя ў рамках Гандлёвага дома, які цалкам сябе акупляе. Усё робіцца для таго, каб забяспечыць мабільнасць у рабоце і ўпэўненасць калектыву ў будучыні.

— Якаснай і аператыўнай працы дапамагае і ўласнае праектнае ўпраўленне?

— Сваю праектную арганізацыю стварылі, каб не было затрымак з забеспячэннем аб'ектаў праектна-каштарыснай дакументацыяй, перш за ўсё па развіцці ўласнай базы. Для нас развіццё інфраструктуры — задача першараднай важнасці. Праектная арганізацыя — самаакупная, рэнтабельнасць у яе даволі высокая. Яе спецыялісты распрацоўваюць сучасныя праектныя рашэнні, у якіх улічаны ўсе навінкі горадабудавання. Скажам, з'яўленне вокнаў ПВХ — справа цалкам станоўчая, але яна нарадзіла і нямала праблем. У прыватнасці, пры няўмелым імі карыстанні парушаецца мікраклімат жылля. Праекціроўшчыкам і будаўнікам давялося пайсці на стварэнне ў кожнай кватэры свайго вентыляцыйнага канала. Для эканоміі цеплавой энергіі разводка і ўлік яе таксама ажыццяўляюцца пакватэрна. Хто хоча і можа дазволіць сабе ўключыць больш цяпла — калі ласка, такая магчымасць ёсць. Як і наогул магчымасць забяспечыць у кватэры ўласны мікраклімат.

— Што прыкметнага за апошнія гады ўдалося пабудаваць?

— Прыкметнага шмат, узводзілі ці ўзводзім практычна ўсе буйныя аб'екты вобласці. Той жа спартыўны комплекс «Нёман» у Гродне і Лядовы палац на яго тэрыторыі. Дзве чаргі цэнтра аздараўлення «Азёрны» Нацыянальнага банка. Аб'екты аховы здароўя, жыллё. Рэканструкцыя шлюзаў Аўгустоўскага канала. Падыходы да Старога моста праз Нёман у Гродне, пасля рэканструкцыі моста і падыходаў адчувальна ўпарадкаваны рух у цэнтры горада. Парк Жылібера і Савецкая плошча, транспартная развязка па Будзённага і мемарыяльны комплекс воінам-памежнікам, на адкрыцці якога прысутнічаў кіраўнік дзяржавы.

Аб'ёмы работ пастаянна ўзрастаюць — кожны год прырост складае не менш за 20 працэнтаў. Не толькі таму, што расце колькасць заказаў, але і пашыраецца наша ўніверсальнасць: усё больш відаў работ выконваем самі. А таксама за кошт росту прадукцыйнасці працы. Нарошчваецца колькасць працаўнікоў і паляпшаецца арганізацыя працы, уводзім перадавыя метады кіравання вытворчасцю. Існуе штодзённая індывідуальная прыёмка выкананых работ. І што не менш важна — гэтак жа пастаянна адміністрацыя цікавіцца, колькі нашы работнікі зарабляюць. Чалавек павінен бачыць канчатковы вынік сваёй працы і ведаць, што ён заробіць і колькі атрымае. І патрэбна арганізаваць работу так, каб ён атрымліваў па сённяшніх мерках нармальна.

Прырост дасягаецца таксама за кошт паляпшэння дысцыпліны, скарачэння непрадукцыйных затрат (несвоечасова прывезлі раствор, напрыклад, іншыя матэрыялы). Вырашальнае значэнне адыгрывае інжынерная, нават інжынерна-эканамічная падрыхтоўка аб'ектаў. У канцы мінулага года на базе «Гроднапрамбуда» праведзена выязная калегія Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Беларусі па пытаннях інжынерна-эканамічнай падрыхтоўкі вытворчасці, на якой было адзначана, што ў «Гроднапрамбудзе» накоплены станоўчы вопыт.

— Якія аб'екты ўзводзіце сёлета?

— У першую чаргу варта сказаць пра ўнікальны аб'ект — Гродзенскую ГЭС на рацэ Нёман. Кошт будаўніча-мантажных работ — 166 мільярдаў рублёў! Аб'ект новы для беларускіх будаўнікоў, нетрадыцыйны. Праектаванне ажыццяўляе «БелНІПІэнергапрам» сумесна з ААТ «Укргідрапраект».

У абласным цэнтры акцыянернае таварыства працягвае працаваць на аб'ектах аховы здароўя — узводзіцца новы корпус дзіцячай абласной бальніцы, ідзе рэканструкцыя кардыялагічнага дыспансэра і Гродзенскай абласной клінічнай бальніцы.

На гэты год калектыву на 40 працэнтаў у параўнанні з мінулым павялічылі аб'ёмы ўзвядзення жылля. Сёння брыгады трэста працуюць на жылых дамах у мікрараёнах Вішнявец і Дзевятоўка. Робяць таксама дзіцячы садок з тэрмінам уводу 1 верасня. На такіх аб'ектах патрабуецца якасць, якасць і яшчэ раз якасць работ.

Улічваем, што на падыходзе, з другога паўгоддзя, новыя БНБ (будаўнічыя нормы і нарматывы Беларусі), і будзе даведзены іншы, больш жорсткі каэфіцыент цеплаправоднасці вонкавых сцен жылых памяшканняў, вокнаў, паддашкавых (чардачных) перакрыццяў, а значыць, і будматэрыялаў. І ўжо цяпер разам з заводамі будіндустрыі прымаюцца канструктыўныя і тэхналагічныя крокі для таго, каб атрымліваць канструкцыі і матэрыялы з павышаным каэфіцыентам супраціўляльнасці, што ў выніку дазволіць істотна зменшыць страты цяпла.

У рамках прэзідэнцкай праграмы ўзвядзення аграгарадкоў кожны год уводзім аб'екты ў вёсцы, найчасцей гэта школы, Палацы культуры, жыллё. Хоць і сучасныя жывёлагадоўчыя фермы — таксама. Летась нядрэнна папрацавалі брыгады аб'яднання на цэнтральных сядзібах буйных гаспадарак — у Мажэйкаве Лідскага раёна, у Луцкаўлянах і Квасаўцы Гродзенскага раёна, у Васілішках Шчучынскага раёна, Бераставіцкім раёне.

З улікам таго, што «Гроднапрамбуд» актыўна працуе на будаўніцтве жылля і ўзвядзенні аграгарадкоў, клапоцімся і пра будаўнічыя канструкцыі пад гэтыя аб'ёмы. У самым пачатку года наладзілі на сваім заводзе ЖБК выпуск пліт пакрыцця пад праграму сельскагаспадарчага будаўніцтва, а ў гэтым месяцы па-

вінны запусціць элементы «клюшачнікаў» — для ўзвядзення сельскагаспадарчых фермаў. Узводзіць сучасныя фермы з іх новымі тэхналогіямі не проста, праекціроўшчыкі ездзілі ў Эстонію, знаёміліся з тэхналогіяй, у Беларусі няма аналага.

На будоўлях не хапае плітаў пустотнага насцілу, таму асвоілі вытворчасць такой сур'ёзнай прадукцыі для каркасных будынкаў. І ўжо два аб'екты «Гроднапрамбуда» закрываюцца з уласнага завода. Выпускаем сценавыя трохслойныя панэлі, калоны — тое, што раней не выпускалі. Жыццё само дыктуе, што трэба рабіць, тут важна не адставаць.

Жыццё пастаянна ставіць задачы павышанай складанасці. І ў поўнай адпаведнасці з гэтай заканамернасцю спадзяёмся, што нам будзе даверана ўзвядзенне горада энергетыкаў на Беларускай атамнай станцыі. Трэст адмабілізуе свае сілы, пашле на аб'екты БАС лепшых сваіх прадстаўнікоў і ў чарговы раз прадэманструе зладжаную і высакаякасную работу. Тварам у грязь не ўдарылі нідзе, чатыры разы па выніках работы за папярэднія гады заносіліся на Рэспубліканскую Дошку гонару, не падвядзём і тут.

Перад аб'яднаннем ужо зараз пастаўлена задача па ўзвядзенні вытворчай базы з жылым гарадком будаўнікоў для работы на аб'ектах Беларускай атамнай станцыі. Плануецца, што на пляцоўцы будзе наладжана вытворчасць таварных бетонаў, жалезабетону, таварнай арматуры, закладных у дастатковых аб'ёмах, каб грувасткія, цяжкія канструкцыі і нагогул будаўнічыя матэрыялы не вазіць за 100 ці нават 200 кіламетраў. Плюс пляцоўка для рамонту будаўнічай і іншай тэхнікі і пляцоўка з функцыямі тэхналагічнай камплектацыі.

Рашэннем падобных буйных задач ужо даводзілася займацца. Гадоў 20-30 назад падраздзяленні трэста працавалі ў Ваўкавыску і Слоніме, і там ажыццяўлялася такая ж схема. А яшчэ раней — у Гродне, на будаўніцтве такіх гігантаў нафтахіміі, як «Азот» і «Хімвалакно». На «Азоце» чатыры месяцы бесперапынна, днём і ноччу, давалі бетон на гранвежу. Туды ішлі лепшыя матэрыялы, выкарыстоўвалася лепшае абсталяванне і працавалі лепшыя рабочыя — па 12 гадзін, без выхадных. Гэтак жа апантана будавалі ўвесь «Азот», у нейкай ступені гэта быў калектыўны подзвіг.

Патэнцыял «Гроднапрамбуда», калі нам будзе аказаны давер, дазволіць прыняць дастойны ўдзел ва ўзвядзенні найважнейшага для краіны і вельмі цікавага з прафесійнага пункту погляду аб'екта, будаўніцтва якога можа і павінна стаць агульнанацыянальнай задачай, нават агульнанацыянальнай ідэяй. Патрэбныя кадры, патрэбная тэхніка, навыкі — усё гэта ёсць, традыцыі засталіся, жаданне паслужыць краіне — таксама. Людзі настроены пазітыўна, стваральна.

— Згодзен, што калектыў ваш далёка не радавы. Чым усё ж можна растлумачыць яго паспяховасць? Ці толькі жалезнай дысцыплінай, удала падабранымі кадрамі?

— Кадрамі не раскідваемся, таму калектыў і стабільны, змены адбываюцца толькі ў адным кірунку: за апошнія пяцігоддзе вырас на 500 чалавек. У асноўным за кошт моладзі. Ва ўпраўленнях стала прывычным замацоўваць за навічкамі вопытных работнікаў, матэрыяльна заахвочваць настаўнікаў, і вучоба на працоўных месцах арганізавана нядрэнна. Калі прафесійнымі сакрэтамі дзеляцца такія асы будаўнічай справы, як заслужаны будаўнік Рэспублікі Беларусь брыгадзір маляроў Тэрэза Іосіфаўна ПАЛІШЧУК, то і вучні будуць старацца ўзяць ад настаўніка лепшае.

Бывае, вядома ж, і так, што некага патрэбна паправіць некалькі разоў, пакуль ён зразумее тонкасці кладкі, аддзелкі, мантажу. Гатовых майстроў на ўсе рукі ніхто не прышле, іх трэба рыхтаваць самім. Сёння на аб'ектах пераважаюць новыя тэхналогіі, і па просьбе вытворцаў профільныя ліцэі і каледжы рыхтуюць маладога чалавека адразу па некалькіх напрамках: ён і плітачнік, і маляр, і тынкоўшчык. (З улікам таго, што будаўнічыя брыгады зараз — комплексныя, яны здаюць аб'екты «пад ключ»). Штогод на вытворчую практыку прыходзяць па 40 чалавек. Кадравікі прыглядваюцца і забіраюць тых, хто найлепшым чынам сябе зарэкамендаваў.

Адным словам, цякучасць кадраў — 3 працэнты, для абласнога цэнтра з яго магчымасцямі працаўладкавання вельмі нядрэнная лічба, яна характарызуе стабільнасць калектыву.

Задачу па адборы, падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы кадраў аблягчае тое, што ў будаўнічых упраўленнях і іншых структурных падраздзяленнях падабраны дасведчаныя кіраўнікі. За плячыма яны маюць багаты вопыт работы, у тым ліку ўзвядзення сур'ёзных народнагаспадарчых аб'ектаў.

Скажам, начальнік БУ-221 Анатоль Міхайлавіч ВІЦЕНЧЫК закончыў з «чырвоным дыпломам» Брэсцкі інжынерна-будаўнічы інстытут і 25 гадоў таму прыйшоў у «Гроднапрамбуд» майстрам. Затым працаваў прарабам, галоўным інжынерам будупраўлення, пазней прыняў аддзелачнае ўпраўленне. Гэта канкрэтны прыклад кар'ернага росту чалавека ў нас. Кіраўніцкія кадры стараемся расціць свае, бо іх лепш ведае і давярае ім калектыў.

Начальнік БУ-210 Дзмітрый Іванавіч ЧЫЛЕК — прадстаўнік будаўнічай дынастыі, яго бацька доўгія гады з'яўляўся нязменным галоўным інжынерам трэста. А сын прыйшоў пасля інстытута, і таксама — майстар, прараб, галоўны інжынер, а сёння начальнік упраўлення.

Кіраўнік БУ-142 Яўген Пятровіч ШЫШКО — таксама пасля інстытута і традыцыйна прайшоў усе этапы. Гэта сведчыць аб тым, што ёсць пераемнасць у калектыве. У Яўгена Пятровіча родны брат галоўны інжынер БУ-211 — яшчэ адна дынастыя.

Трыццаць гадоў таму прыйшоў сюды выпускнік інстытута Павел Антонавіч ШЫДЛОЎСКІ, працаваў у лабараторыі, ёсць за плячыма і вопыт работы галоўным інжынерам. Калі адбылося зліццё двух трэстаўскіх заводаў жалезабетонных вырабаў, узначаліў аб'яднаны калектыў. Зараз на ЖБК пастаянна вядзецца аднаўленне асноўных фондаў і асартыменту. (Відаць, такога багатага асартыменту больш няма на аналагічных заводах Гродзенскай вобласці.) Гэта прафесіянал, які хварэе за справу. Не выпадкова яго выбралі старшынёй наглядальнага савета акцыянернага таварыства.

Важна, што калектыў трэста жыве і працуе мэтанакіравана. Поўная самааддача ёсць як у кіраўнікоў падраздзяленняў, так і ў многіх лінейных камандзіраў вытворчасці і радавых будаўнікоў. Брыгады падабраны такім чынам, што людзі разумеюць: сёння дзяржава знаходзіць сродкі для масавага прамысловага і жыллёвага будаўніцтва, хоць гэта не лёгка ў апошні час, і трэба іх поўнасцю асвойваць. Магчыма таму, нягледзячы на сітуацыю ў сусветнай эканоміцы, у акцыянерным таварыстве па выніках першага квартала няма падзення ніводнага паказчыка, дасягнуты амаль 30 працэнтаў росту аб'ёмаў у параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года.

Існуе нават свой патрыятызм. Многія прайшлі праз гады бяскормiцы, але засталіся вернымі «Гроднапрамбуду», і іх нельга не лічыць патрыётамі свайго калектыву. У 90-х гадах, калі ўсё развалвалася, людзей на працу патрэбна было збіраць па адным (у спісах значацца, а на працы няма). Збіралі на рынку, дзе яны гандлявалі. Многія так і не вярнуліся. Але для тых, хто вярнуўся, знайшлі работу і такім чынам захавалі касцяк калектыву. І калі праз некаторы час пайшла новая хваля — будаўнікі ў масавым парадку ад'язджалі ў Расію на заработкі, то нас гэта ўжо фактычна не закранула. І ніхто з кіраўнікоў падраздзяленняў не паддаўся на ўгаворы перайсці ў прыватныя структуры, не дазволіла пачуццё адказнасці. З таго часу мы толькі колькасна прыраслі і выраслі да 3000 чалавек. А чым большы калектыў, тым больш можна зрабіць, тым большая фондаддача і эканоміка працуе лепш.

Калі ўзяць нейкую абагульняльную лічбу, то за пяцігодку падвоены аб'ёмы работ, выкананых уласнымі сіламі. У людзей стабільная зарплата, стабільная праца. І канкурэнтаздольнасць «Гроднапрамбуда» ў параўнанні з іншымі будаўнічымі арганізацыямі краіны высокая. Існуе свой рабочы почырк, большасць аб'ектаў здаецца датэрмінова, астатнія — у тэрмін. Заказчыкі ведаюць пра такую, можна сказаць, традыцыю і аддаюць перавагу. Трэба было добра папрацаваць, добра папацець, каб дасягнуць такога іміджу і не баяцца канкурэнцыі з боку калег.

— Скажыце, за кошт чаго перш за ўсё дамагаецеся якасці ў такой праблемнай галіне, як будаўніцтва? За кошт ІСО ці не толькі?

— Безумоўна, павінна працаваць сістэма кіравання якасцю. Раней існавала комплексная сістэма кіравання якасцю — КСУКП, потым перайшлі на сістэму менеджменту кіравання якасцю на аснове міжнародных стандартаў ІСО 9000. Яна патрабуе пастаяннага паляпшэння ва ўсіх сферах — і ў эканоміцы, у вытворчасці, дысцыпліне, і, безумоўна, у самой якасці будаўніцтва. Сістэма на базе ІСО мае папераджальны характар. Не проста фіксуе факты — дзе што здарылася. Яна больш скіравана на папярэджанне, каб нідзе нічога не адбылося: ніякага недагляду, ніякага браку. Магчыма, на ўсе сто працэнтаў яна пакуль не раскрыла ў нас свае магчымасці, але тым не менш стала сапраўдным гарантам якасці працы. І на выязной калегіі міністэрства было адзначана, што найбольш набліжана да патрабаванняў СТБ ІСО 9001-2001 працуе менавіта калектыў «Гроднапрамбуда».

Штогод праходзіць знешні аўдыт, тым самым пацвярджаецца працаздольнасць сістэмы. У кожным вытворчым падраздзяленні ёсць інжынер па якасці, а ў структуры трэста — аддзел менеджменту якасці. Гэтую лінію курыруе галоўны інжынер, і на практыцы атрымліваецца даволі дзейсны ланцужок кіравання якасцю, які пастаянна паляпшаецца і ўдасканальваецца. Якасць работ, якія мы выконваем, з кожным годам узрастае. Сёння той узровень, на якім працавалі нейкіх дзесяць гадоў таму, ужо не ўспрымаецца, бо зараз у будаўнікоў магчымасці іншыя.

У мінулым годзе распрацавана сістэма кіравання аховай працы СТБ 18001-2005. Яна прадугледжвае, што парадак будзе наведзены ва ўсім — пачынаючы ад дакументаў і заканчваючы будаўнічымі пляцоўкамі. У ліку першых у будаўнічай галіне рэспублікі сістэма прайшла сертыфікацыю і пачынае дзейнічаць.

Наступным этапам стане распрацоўка сістэмы аховы прыроды ІСО 14001. Стаіць задача цеснай узаемаўвязкі ўсіх трох сістэм — менеджменту кіравання якасцю, аховы працы і тэхнікі бяспекі і аховы прыроды.

— Вы працуеце толькі ў Беларусі, толькі ў сваім рэгіёне? Ці вам трэба шукаць і аб'ёмы работ за мяжой, скажам, у Расіі?

— На сённяшні дзень пакуль не трэба. Тым не менш, існуе такі даведзены нам паказчык, як экспарт будаўнічых паслуг, і шукаем для сябе нейкія дадатковыя аб'ёмы. Спрабуем укараніцца на рынку Расіі, але гэта, шчыра кажучы, на ўсялякі выпадак. У калектыва ёсць ліцэнзія на аказанне будаўнічых паслуг на рынку Расіі, выдаюць яе расіяне з вялікімі цяжкасцямі, але мы такі дакумент атрымалі. Праўда, у будаўнічай галіне суседняй краіны існуе шмат складанасцяў, і перад тым, як туды пайсці, добра падумаем.

— Вы сказалі, што значны рэзерв — інжынерная падрыхтоўка аб'ектаў...

— І насычэнне іх высокапрадукцыйнымі механізмамі. У любой справе павінна быць сістэмная работа. Яна прадугледжвае цэлы комплекс тэхнічных мерапрыемстваў, у тым ліку замену абсталявання на больш высокапрадукцыйнае. Быў перыяд, калі па вядомых прычынах інвестыцыі ў абсталяванне адсутнічалі, гэтая праграма пачала па-сапраўднаму ажыццяўляцца прыкладна чатыры-пяць гадоў таму.

Вось прыклад: летась увялі новы раствора-бетонны вузел прадукцыйнасцю 80 кубоў таварнага бетону ў гадзіну. Даўкамплектавалі яго дзесяццю пяцікубовымі міксерамі, на гэты раз — беларускай вытворчасці. А каб падаваць бетон на патрэбныя ўзроўні, набылі магутную помпу. Вузел гэты бралі пад праграму будаўніцтва гідраэлектрастанцыі на Нёмане.

Ажыццявілі цэлы комплекс мерапрыемстваў па энергазберажэнні. Калі гаварыць пра апрацоўку металу, то толькі на ЖБК перапрацоўваюць 350-400 тон арматуры ў месяц і каля 200 тон металаканструкцый. Аднаму ЖБК з гэтай праграмай спраўляцца цяжка, таму ў трэсце створана ВБУ — вытворча-будаўнічае ўпраўленне, для яго набылі неабходнае абсталяванне і падзялілі выпуск канструкцый паміж гэтымі двума падраздзяленнямі.

Так што ў тэхнічным абнаўленні, у мадэрнізацыі абсталявання, набыцці сучасных станкоў і механізмаў ажыццяўляецца комплексны падыход, перш за ўсё па ключавых пазіцыях.

Мінулы год быў паказальным у сэнсе асваення сродкаў, укладзеных у асноўныя фонды. Закуплена вельмі многа новай тэхнікі: экскаватары, бульдозеры, бетоназмяшальнік, вежавыя краны, аўтатэхніка, тынкавальныя станцыі і гэтак далей. Паступова і мэтанакіравана сфарміравалі сваю матэрыяльную базу для таго, каб мець магчымасць яшчэ больш нарошчваць аб'ёмы работ. Размова можа ісці аб якасна новым скачку, рыўку наперад у аб'ёмах.

— Вышэй вы закранулі тэму выхавання калектыву. Як гэты працэс арганізаваны з улікам спецыфікі акцыянернага таварыства?

— Ёсць пэўныя складанасці ў правядзенні ідэалагічных і выхаваўчых мерапрыемстваў у сувязі з тым, што брыгады раскіданы па аб'ектах у горадзе і вобласці. Тым не менш, знаходзім магчымасці сустракацца з людзьмі і на аб'ектах, і ў падраздзяленнях. Формы работы розныя: дні інфармавання, на якіх працуюць інфармацыйна-прапагандысцкія групы; пастаянна аднаўляецца наглядная агітацыя. У фае галоўнага корпуса размешчана гісторыя прадпрыемства ў фотаздымках, тут жа — Дошка гонару, калектыў павінен ведаць сваіх герояў. Выстаўлены дыпломы і кубкі за працоўныя поспехі і перамогі ў спартыўных мерапрыемствах. Дзейнічае свой музей, і выпускнікі будаўнічага ліцэя вельмі часта першы свой працоўны ўрок атрымліваюць тут. І разумеюць, што прыйшлі ў перадавы калектыў са сваімі традыцыямі, так што адпаведным чынам настройваюцца.

У кожным падраздзяленні створаны камісіі па ўмацаванні грамадскай дысцыпліны, саветы прафілактыкі. Чалавека не пакідаем без увагі, заўсёды побач нехта ёсць, хто цікавіцца яго справамі і настроем, пры неабходнасці дапаможа і спытае.

Але каб з чалавека запатрабаваць, яму трэба і даць. У трэсце сёння велізарныя сродкі выдаткоўваюцца на стварэнне нармальных умоў працы. У мінулым годзе адноўлена гарачае харчаванне рабочых на аб'ектах. Ствараюцца нармальныя бытавыя ўмовы — на аб'ектах добраўпарадкаваныя бытоўкі, у якіх цёпла, можна папалудноваць, крышку адпачыць і працаваць далей. Гэта ўплывае на настрой рабочых і на прадукцыйнасць працы.

Лічым, што пытанні ідэалогіі, выхавання павінны быць максімальна набліжаны да праблем канкрэтнага чалавека. Паранейшаму застаецца запатрабаванай індывідуальная работа, гутарка сам-насам. Скажам, вызначаны дні прыёму па асабістых пытаннях — і ў трэсце, і ў будаўнічых упраўленнях. Людзі часцей за ўсё прыходзяць з нейкімі сваімі праблемамі, і стараемся іх вырашыць. Але такія сустрэчы многае даюць і кіраўніку, каб зразумець, чым жыве калектыў і што яго хвалюе. Большасць пытанняў тычыцца жылля, у акцыянерным таварыстве сем даволі добраўпарадкаваных інтэрнатаў, у якіх жывуць дзве з паловай тысячы членаў калектыву. Але людзі хочуць мець уласнае жыллё, і імкнемся ім дапамагаць (хутка такі дом будзем засяляць). Падчас такіх сустрэч людзі часта цікавяцца заработнай платай, і разам знаходзім паразуменне ў тым, што каб зарабіць, трэба працаваць. Даём свайму калектыву магчымасць і працаваць, і зарабляць.

У «Гроднапрамбудзе» ніколі не адмаўляліся ад працоўнага спаборніцтва, праводзіцца яно пад дэвізам «Кожнай брыгадзе свой рубеж». Гэта дзейсная форма ўплыву на людзей і вытворчы працэс. Пад увагу бяруцца не толькі колькасныя, але і якасныя паказчыкі, і працоўная дысцыпліна, і ахова працы, дынаміка змянення паказчыкаў. Пры падвядзенні вынікаў выплачваецца матэрыяльнае ўзнагароджанне, і гэта яшчэ адзін стымул. Так што, спадзяюся, новыя рубяжы ў нас наперадзе.

Рэдакцыя шчыра дзякуе за дапамогу ў падрыхтоўцы публікацыі галоўнаму інжынеру ААТ «Гроднапрамбуд» Валерыю Іванавічу ДЗЯДУКУ, намесніку генеральнага дырэктара Ігару Віктаравічу ЗАЙЧАНКУ, дырэктару завода ЖБК — старшыні наглядальнага савета Паўлу Антонавічу ШЫДЛОЎСКАМУ, начальніку БУ-221 Анатолю Міхайлавічу ВІЦЕНЧЫКУ.

Публікацыю падрыхтаваў Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.

Каб не ідэалізаваць агульную карціну, варта сказаць, што велізарнае значэнне ў якасці будаўніцтва мае выхаванне калектыву, пачынаючы ад нізавога звяна і заканчваючы кіраўнікамі. Ніводзін работнік — ні радавы, ні кіраўнік — не павінен праходзіць міма нейкага непарадку. Гаворка тут не толькі пра сітуацыю, калі сцяна пакладзена, дапусцім, крыва. Парадак павінен быць ва ўсім, пачынаючы ад складзіравання і заканчваючы эфектыўным выкарыстаннем працоўнага дня, машын і механізмаў, усіх асноўных сродкаў. Вось адкуль бярэцца якасць. Калі ва ўсім ёсць дысцыпліна і парадак, яны даюць аддачу. А калі спадзявацца на паўмеры, на тое, што чалавек сам здагадаецца, на гэтым далёка не паедзеш. Пастаянна трэба і нагадваць, і кантраляваць. Магчыма, гэта не ўсім падабаецца, але рэаліі такія, што кантраляваць варта.

— Якасць — гэта яшчэ і сучасныя будаўнічыя тэхналогіі і матэрыялы, ці не так?

— Яны прымяняюцца паўсюдна, у тым ліку айчынныя. Сёння беларускія матэрыялы па сваіх функцыянальных паказчыках канкуруюць з заходнімі, не саступаюць замежным аналагам. А ў шэрагу выпадкаў нават пераўзыходзяць іх. І той курс, які сёння рэспубліка ўзяла на імпартазамяшчэнне, дабратворна адбіваецца на эканоміцы будаўніцтва. Раней паўсюдна на важных аб'ектах клалі іспанскую і італьянскую плітку, цяпер паспяхова карыстаемся керамінаўскай. Задаволены яе якасцю і іншымі параметрамі і заказчык. Важна, што яна больш танная. Шырока выкарыстоўваюцца беларускія гіпсакардоны, падвясныя столі, што значна паскарае тэрміны аддзелачных работ, змяншае колькасць так званых «мокрых працэсаў» і станоўча ўплывае на цану аб'екта, на патанненне квадратнага метра.

Раней карысталіся попытам толькі нямецкія акрылавыя фарбы, а зараз выпуск высакаякасных фарбаў наладзілі ў сябе. Спецыялізаваная лабараторыя са сталіцы пацвердзіла, што фарбы, якія вырабляюцца ў акцыянерным таварыстве, не горшыя. Кампаненты для іх вытворчасці пастаўляе мінская фірма «Пралеска», а мы набылі лінію для змешвання, працуе спецыяльная тэхналагічная служба. І ўсё жыллё, якое будуем ці рэканструюем, фарбуем сваімі кампазіцыямі. Нараканні і рэкламацыі адсутнічаюць.

НА ЗДЫМКАХ:

1. Гродна з вышыні птушынага палёту выглядае зусім як горад-казка.

2. Гігант нафтахіміі ААТ «Гродна-Азот» узводзіў калектыў «Гроднапрамбуда».

3. За фізкультурна-аздараўленчы комплекс у «Азёрным» трэсту ўручаны дыплом лаўрэата ў намінацыі «Лепшы аб'ект года».

4. Цешаць вока шлюзы знакамітага Аўгустоўскага канала пасля рэканструкцыі.

5. Такой будзе Гродзенская ГЭС на Нёмане. Яе ўзвядзенне ідзе поўным ходам.

6. Акцыянернае таварыства мае непасрэднае дачыненне да павелічэння аб'ёмаў жыллёвага будаўніцтва ў краіне.

Здымкі з архіва ААТ «Гроднапрамбуд».

УНП 500036537.



ДУДАРЫ НА ПАНСКАЙ СЯДЗІБЕ

Што цікавага можа знайсці турыст паблізу сталіцы?

На працягу мінулага года Мінскую вобласць наведалі 15 тысяч замежных турыстаў. Гэта паводле афіцыйнай статыстыкі, а насамрэч, напэўна ж, гасцей прыехала значна больш. Сталічная вобласць пакуль не Швейцарыя (хоць па плошчы амаль такая ж — 40 тысяч кв. кіламетраў супраць 44 тыс.), але турыстычны патэнцыял таксама мае даволі значны. Прычым гасцям на выбар прапануецца шмат самых цікавых месцаў для адпачынку. У гэтым пераканаўся, калі разам з удзельнікамі выязнога пасяджэння міжведамаснага каардынацыйнага савета па турызме Мінскай вобласці правёў «рэвізію» магчымых варыянтаў, якія прапануюць турыстам.

У пошуках... цішыні

На Міншчыне зарэгістравана каля 150 аграсядзібаў. Агратурызму на месцах аказваюць дапамогу, выдзяляюцца крэдыты на вельмі выгадных умовах. Таму, як заўважае **начальнік упраўлення фізічнай культуры, спорту і турызму Мінскага аблвыканкама Алег КАЧАН,** у цэнтральным рэгіёне колькасць аграсядзібаў на працягу мінулага года практычна падвоілася і працягвае павялічвацца. Традыцыйна сярод лідараў тут былі Мінскі і Мядзельскі раёны. Апошнім часам да іх далучылася і Валожыншчына, дзе, дарэчы, за мінулы год аб'ём аказання турпаслуг павялічыўся больш чым у 4,4 раза! У чым жа сакрэт?

Напэўна, у разнастайнасці варыянтаў адпачынку. У раёне працуюць ужо 18 аграсядзібаў, якія адрозніваюцца ад іх калегаў з суседніх раёнаў. Хтосьці шукае вялікія кампаніі, а іншыя — глухмень і мінімум людзей. Для ўсіх знойдзецца свая сядзіба. Напрыклад, у «Міхалова» чакаюць менавіта «стомленых цывілізацыяй» турыстаў, якія, няхай хоць і на непрацяглы час, мараць збегчы ад асфальту, плыняў аўтамабіляў і мітусні. Валерый Чаховіч разам з жонкай у свой час даволі паспяхова займаліся бізнэсам у сталіцы — мелі ўласную наладжаную справу. Адначасова абуладкоўвалі сядзібу на Валожыншчыне. Не дачу, а менавіта ўтульны, дагледжаны падворак. І аднойчы менавіта сюды пераехалі з Мінска.

— Пакінулі дзецям свой бізнэс і пасяліліся тут, — узгадвае Валерый Чаховіч. — «Пераўтварыліся» ў пенсіянераў, аднак, мы людзі актыўныя, не можам доўга на месцы без справы сядзець. Таму і заняліся агратурызмам — з мінулага года пачалі прымаць гасцей.

Для турыстаў прапануецца асобны домік, дзе ёсць усё неабходнае, нават лазня з невялікім басейнам. Пры жаданні можна замовіць сабе смачныя стравы, якімі гаспадыня здзівіць нават самага «прасунутага» гурмана. Можна таксама прыгатаваць нешта самастойна: «традыцыйна» — на кухні, альбо больш па-турысцку — на вогнішчы, з дымком. Гаспадары сядзібы «Міхалова» ў найбліжэйшай перспектыве мяркуюць зрабіць у лесе, што непадалёку, сцяжынку з «прыроднымі трэнажорамі» — драўлянымі прыладамі для заняткаў спортам на свежым паветры. Чаховічы плануюць адначасова займацца і фермерствам — авечкагадоўляй. Гасцям будуць прапаноўваць свежае мяса, таксама турысты змогуць і самі далучыцца да вясковай працы. Думаю, для «стомленых цывілізацыяй» такая прапанова дакладна будзе да месца.

У «PARK» прыязджаюць і сталічныя жыхары.

Прыпынак на трасе

Валожынскі раён знаходзіцца на перакрыжаванні вялікіх магістраляў. Тут штодня праязджае вялікая колькасць транзітных пасажыраў. Ці здольны ім нешта прапанаваць прыдарожны сэрвіс? На думку **начальніка ўпраўлення фізічнай культуры, спорту і турызму Валожынскага райвыканкама Інгі МАЛАШКЕВІЧ,** варыянтаў, на жаль, цяпер не надта багата. Сярод «пунктаў» адзін з найбольш вядомых — комплекс «PARK». Прадпрыемства працуе з 1993 года.

— Пачыналі літаральна на пустым месцы, — кажа **дырэктар прыдарожнага аб'екта Рыгор БАЛЬДЗЮСАЎ.** — Адразу гэта было сумеснае прадпрыемства — знайшлі нямецкага інвестара, які дапамог набыць неабходнае абсталяванне. Зрабілі кавярню, якая з цягам часу пачала карыстацца папулярнасцю.

Каля старажытнага маёнтка можна зазірнуць у мінуўшчыну.

Цяпер гэта цэлы комплекс паблізу трасы: кавярня з дзвюма залямі, матэль на 13 месцаў, стаянка для вялікагрузных машын і зона адпачынку з лазняй. Асноўны кантынгент наведвальнікаў — транзітныя пасажыры, у першую чаргу дальнабойшчыкі. Перавозчыкі ўжо добра ведаюць гэты «пункт» і ахвотна тут спыняюцца. У выніку прадпрыемства мае стабільны прыбытак. Аднак не ўсё так проста: як заўважае Рыгор Бальдзюсаў, для таго, каб быць канкурэнтаздольнымі, даводзіцца выкарыстоўваць мінімальныя гандлёвыя націнкі. Цэны і сапраўды прыемна здзіўляюць, нездарма сюды нярэдка прыязджаюць нават жыхары сталіцы. Разнастайнае меню, стыльны інтэр'ер, прыемная музыка — што яшчэ трэба для добрага адпачынку?

Зараз у прыдарожным комплексе працуюць 26 чалавек. Гэта новыя працоўныя месцы, што для глыбінкі, пагадзіцеся, надзвычай важна. Як заўважае Рыгор Бальдзюсаў, да нядаўняга часу абыходзіліся без дзяржаўнай дапамогі. Але на такіх умовах, што вызначаны цяпер (пасля ўказа аб развіцці прыдарожнага сэрвісу), чаму б не скарыстацца магчымасцю? Напрыканцы мінулага года ўзялі льготны крэдыт. Поўнасцю адрамантавалі стаянку, што доўгі час проста не маглі зрабіць з-за недахопу грошай...

На «машыне часу»

Паслухалі цішыню на аграсядзібе, пасядзелі ў прыдарожнай кавярні, а што далей? Калі наведваеш Валожыншчыну, нельга абмінуць старажытны Івянец. Гэта я па сабе ведаю — ужо колькі разоў наведваў знакамітае мястэчка, аднак кожнага такога спаткання чакаеш з нецярплівасцю. Вабяць сапраўдныя цуды: у гарпасёлку два велічныя касцёлы — Архангела Міхаіла і Святога Аляксея. Першы пабудаваны ў пачатку XVIII, а другі — у пачатку XX стагоддзя. Абодва храмы пасля праведзенага інтэрнэт-галасавання ўвайшлі ў спіс сямі цудаў Міншчыны (складзены нават адметны турыстычны маршрут). У Івянцы працягваюць традыцыі рамёстваў, якія раней тут вельмі паспяхова развіваліся. Перш за ўсё ганчарства. Пры мясцовым музеі створаны некалькі майстэрняў (апроч ганчарства яшчэ ткацтва і кавальства), дзе турысты могуць не толькі ўсё пабачыць на свае вочы, а і паўдзельнічаць, што называецца, у «працэсе вытворчасці». Як заўважыў **дырэктар Івянецкага музея традыцыйнай культуры Алег РАМАНОЎСКІ,** гэта цікавы і карысны занятак, які ўсім наведвальнікам заўжды вельмі падабаецца.

Майстэрня мясцовых кавалёў знаходзіцца ў адным з памяшканняў на сядзібе апошняга гаспадара Івянца — пана Драгунцава. Яму належалі вялікія плошчы зямлі (каля 2,5 тысячы гектараў), у тым ліку і даволі вялікае мястэчка. Сядзібна-паркавы комплекс узведзены напрыканцы XIX — пачатку XX стагоддзя. Дом пана калісьці ўяўляў сабой даволі цікавую пабудову. Меў тры паверхі, прычым адзін з іх размяшчаўся ніжэй за ўзровень зямлі. Кажуць, што абаграваўся вялікі сядзібны дом з дапамогай толькі адной печкі. Як тлумачаць дасведчаныя месцічны, у сценах былі праробленыя спецыяльныя адтуліны, па якіх праходзіла цёплае паветра.

У Івянцы сустрэнеш і сапраўдных дудароў.

Панскі маёнтак выстаяў у цяжкія часы. Падчас першай сусветнай вайны тут размяшчаўся штаб. Вядома, што ў будынку пэўны час размяшчалася кантора дрэваапрацоўчага камбіната, нават жылі людзі. Пасля колькі гадоў дом Драгунцава стаяў пусты і пакрысе прыходзіў у заняпад. Пакуль у 2000-м тут не здарыўся пажар — агнём былі знішчаны ўсе драўляныя часткі, засталіся толькі цагляныя сцены. Зруйнаваны маёнтак сярод маладой лістоты выглядае не надта прывабна.

Аднак рупліўцы не губляюць надзеі на адраджэнне сядзібнага комплексу Драгунцава. І пэўныя крокі на гэтым нялёгкім шляху ўжо зроблены. У былой стайні, апроч кузні, зрабілі і майстэрню мастацкай апрацоўкі дрэва. Там, дзе ў апошняга гаспадара Івянца быў свіран, мяркуецца абуладкаваць аўтэнтычную карчму. Як заўважыў **старшыня Івянецкага пасялковага Савета Юрый ШАРЫЙ,** мясцовыя ўлады ўсяляк будуць спрыяць адраджэнню гістарычнай спадчыны. У тым ліку прыйдуць на дапамогу і прыватнікам, якія зацікавяцца такімі праектамі.

Ужо цяпер сядзібна-паркавы комплекс пана Драгунцава прыцягвае ўвагу турыстаў. Напрыклад, мне нават пашчасціла быццам бы ў «машыне часу» перанесціся ў далёкую мінуўшчыну. Гасцей пад гукі чароўнай музыкі сустракалі дудары. Пасля давялося ўбачыць сапраўдны паядынак на мячах. Захапляльнае відовішча, што і казаць! Усё гэта літаральна па часцінках аднаўляюць і, такім чынам, зберагаюць для нашчадкаў у фондзе «Краіна замкаў». Паказваюць айчынным турыстам і замежным гасцям.

«Галактычнае» падарожжа

Паляўнічы домік у Валожынскім лясгасе быў пабудаваны яшчэ ў пачатку 1990-х гадоў. Летась за кошт уласных сродкаў тут быў праведзены дыхтоўны рамонт, дабудаваны другі паверх, закуплена мэбля, уся неабходная бытавая тэхніка. Як заўважыў **інжынер па паляўнічай гаспадарцы Валожынскага лясгаса Павел САДОЎСКІ,** госці як належыць ацанілі прывабны варыянт — ахвотных камфортна адпачыць на прыродзе летась было шмат. Ды і цэны прымальныя: кошт пражывання на аднаго чалавека ў залежнасці ад сезона (з ацяпленнем ці без) складае 18,9—20,5 тысячы рублёў.

За групавы адпачынак выходзіць яшчэ менш. Пры жаданні можна замовіць экскурсію па велічнай Налібоцкай пушчы. Падчас такога падарожжа зусім рэальна ўбачыць дзікіх жывёл, у тым ліку і зуброў (якіх завезлі пэўны час таму і цяпер у пушчы іх больш за 60). У асноўным прыязджаюць паляўнічыя за добрымі трафеямі, летась тут пабывала многа расіян. На Каляды лясніцтва разам з турфірмамі ладзіла цікавую праграму, паглядзець на якую на працягу святаў прыехала каля 4 тысяч дзяцей і дарослых. Гэты праект думаюць працягваць і далей.

Варта завітаць і ў «Галактыку». Гэтая абласная спартыўна-аздараўленчая база размешчана за 30 кіламетраў ад Мінска — на беразе Іслачы, у сасновым бары. Тут арганізоўваюць сямейны, дзіцячы, карпаратыўны і студэнцкі адпачынак. Размясціцца можна як у камфартабельных нумарах, так і ў палатачным летніку. Більярд, трэнажоры, дыскатэкі, смачнае харчаванне — так што бавіць вольны час — адно задавальненне. Тут праводзяцца турслёты, можна ладзіць і спаборніцтвы па спартыўным арыентаванні. Такім чынам, варыянтаў для адпачынку нават паблізу сталіцы можна адшукаць шмат. Галоўнае — жаданне...

Мікалай ЛІТВІНАЎ.
Валожынскі раён.

Прамая лінія

АДКРЫЦЬ САСУД

На пытанні чытачоў адказаў загадчык аддзялення сасудзістай хірургіі Мінскай абласной клінічнай бальніцы Павел АЎДЗЕЙ.

(Працяг. Пачатак у нумары за 5 мая.)

☎ — Стоўбцы, Аркадзь Антонавіч. Мне 60 гадоў. Перанёс інсульт, ёсць звужэнне сасудаў ног. У шпіталі паставілі дыягназ — аблітэрыруючы атэрасклероз. Каардынацыя дрэнная... Прайду 200 метраў, і ногі пачынаюць балець... Гэта ў мяне ад інсульту ці ад ног?

— Звярніцеся ў нашу абласную бальніцу.

— Я там быў, у неўралогіі.

— А ў сасудзістага хірурга былі?

— Не быў.

— Неабходна трапіць менавіта да гэтага спецыяліста. Вазьміце па месцы жыхарства накіраванне ў абласную кансультатыўную паліклініку. Спецыяліст вырашыць, якое лячэнне вам патрэбна. Таму што калі ў вас ёсць звужэнне артэрый або іх закупорка, спатрэбіцца аператыўнае ўмяшанне.

☎ — Капыльскі раён, Ніна Васільеўна. 55 гадоў. Гіпертанія. Ціск 160/120, 180/140. З пачатку года рэгулярна ўжываю эналапрыл. З'явіўся сухі кашаль, які не паддаецца лячэнню. Потым — камяк і сухасць у горле. Прымяняла прагравanні, піла таблеткі. Ёсць хранічны фарынгіт і хранічны танзіліт. Ці можа названыя сімптомы справакаваць эналапрыл?

— Трэба зноў звярнуцца да таго ўрача, які прызначыў лячэнне. Па-другое, азнаёмцеся з пабочным дзеяннем эналапрылу. Патрэцяе, варта мець на ўвазе, што любыя лекі могуць не падыходзіць, даваць алергічную рэакцыю. Да таго ж, прэпараты адрозніваюцца па эфектыўнасці.

☎ — Мінск, Мікалай Мікалаевіч. 57 гадоў. Пастаянна прымаю танакан, індап, эналапрыл. Быў галаўны боль. На левай назе — коксартроз, выдалены вены з-за тромбафлебіту. Нага ўвесь час халодная. Ставяць яшчэ хваробу Паркінсона, дрыжыць левая рука. Як абследавацца і лячыцца?

— Звярніцеся, калі ласка, да сасудзістага хірурга, які або пацвердзіць, або выключыць падазрэнні. На платнай аснове трапіць на кансультацыю можна і ў нашай паліклініцы Мінскай абласной бальніцы.

☎ — Лёзненскі раён, Лідзія Пракопаўна. 77 гадоў. Атэрасклероз сасудаў галаўнога мозга. Артроз каленных і тазасцегнавых суставаў. Пабольваюць плечы. Прымаю хандразамін, вінпацэцін, пірацэтам, кавентон. Мне працягваць гэта лячэнне ці, можа, ёсць больш новыя прэпараты?

— Безумоўна, трэба ўлічваць узрост і незваротнасць тых працэсаў, што адбыліся ў арганізме. З іншага боку, удасканаленнем лячэння павінны займацца неўролагі і рэўматолагі. Калі гаварыць пра сустаў, то па паказаннях можна рабіць і яго замену.

☎ — Слаўгарадскі раён, Юлія Уладзіміраўна. 50 гадоў. У мяне пастаянна звініць у левым вуху. З чым гэта можа быць звязана? Ціск 190/100, п'ю амладзіпін. Бывае, крыху затарможвае, вядзе галаву, асабліва цяпер, па вясне...

— Нельга выключаць сувязь з пазваночнымі соннымі артэрыямі... Трэба рабіць ультрагукавое даследаванне, каб выключыць атэрасклероз ці іншую паталогію, звязаную з тым жа пазваночнікам. А далей варта ісці на прыём да сасудзістага хірурга.

☎ — Мінск, Галіна Уладзіміраўна. Мужу 71 год. Інвалід II групы па атэрасклерозе сасудаў ног. У маі 2008 года перанёс інфаркт мозга. У лютым яго прыхапіла, левая рука знерухомела. Трапіў у шпіталь, але выпісалі ў тым жа стане, што ён і паступіў. Сказалі: атэрасклероз сонных артэрыі, артроз прадплечча левай ру-

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

кі. У паліклініцы калолі дыклафенак, пірацэтам. Але рука яму баліць. Сам не можа нават зашпіліцца. Прымае кардыямагніл, фезам. Пастаянна адчувае слабасць, санлівасць. Як нам быць? Ці можна трапіць на кансультацыю?

— Хутчэй за ўсё, у вашага мужа атэрасклероз соннай артэрыі. Неабходна зрабіць ультрагукавое даследаванне. Калі там будзе выяўлена звужэнне, варта ісці на кансультацыю да сасудзістага хірурга ў Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр «Кардыялогія». Калі спецыяліст палічыць неабходным, будзе прызначана аперацыя. Цяпер жа важна папярэдзіць паўторны інсульт. Ад чаго ён бывае? Халестэрынавыя бляшкі звужаюць прасвет сасуда. На гэтай няроўнай паверхні ўтвараюцца тромбікі, якія ў любы момант адрываюцца патокам крыві і трапляюць з кроўю ў іншы вузкі сасуд або адбываецца поўная закупорка сасуда бляшкай. Гэта ёсць ішэмічны інсульт. Згаданыя халестэрынавыя бляшкі можна выдаліць хірургічным шляхам. І лепш за ўсё, калі гэта зроблена да сасудзістай катастрофы... Бляшкі добра бачныя на ангіяграме або ўльтрагукавым даследаванні. Даследуюцца, вядома ж, не ўсе сасуды, а тыя ўчасткі, якія найбольш «падабаюцца» бляшкам — сонныя артэрыі. Там мы іх шукаем і выдаляем або праводзім стэнтаванне. Аператыўнае ўмяшанне паляпшае харчаванне ў сасудах, паскарае рэабілітацыю. Аднаўленне кровазвароту — магчымасць не дапусціць першы ці наступныя інсульты.

☎ — Мінск, Аляксандр Георгіевіч. 49 гадоў. Ёсць шыйны астэахандроз. Ціск — 70/110. Маці памерла ад інсульту, і таму хачу спытаць, дзе і якія абследаванні сасудаў галаўнога мозга мне можна прайсці?

— Звярніцеся, калі ласка, да неўролага, які накіруе вас на ўльтрагукавое даследаванне сасудаў шыі. Калі будуць выяўлены пэўныя змяненні, вас накіруюць да сасудзістага хірурга.

☎ — Навагрудак, Мікалай, 44 гады. Непакояць каленныя суставы. Скажыце, дзе ў Мінску можна абследавацца?

— Напачатку вам неабходна звярнуцца ў рэўматалагічнае аддзяленне Гродзенскай абласной бальніцы. Рэўматолаг паставіць вам дыягназ, прызначыць адпаведнае лячэнне. На платнай аснове можна звярнуцца да згаданага спецыяліста і ў нашу кансультатыўную паліклініку Мінскай абласной бальніцы.

☎ — Крычаў, Ганна Іванаўна, 55 гадоў. Вельмі турбуюць болі ў левай назе. Асабліва баляць трэці і чацвёрты пальцы. Апошнім часам з'явіліся сутаргі ў паху. Ёсць праблемы з пазваночнікам. Лячэнне не дапамагае. Як быць?

— Хутчэй за ўсё, прычына болю — у пазваночніку. Але для таго, каб больш дакладна высвятліць паходжанне болю, я парэкамендаваў бы звярнуцца да сасудзістага хірурга. Такія спецыялісты ёсць у абласных бальніцах. Бяры рыце ў хірурга накіраванне ў Магілёўскую абласную бальніцу і прыязджайце на кансультацыю.

☎ — Капыльскі раён, Ганна Васільеўна. Маёй маці 82 гады. У яе сінеюць пальцы рук і ног, часта кружыцца галава. Чым тут можна дапамагчы?

— У вашай маці, хутчэй за ўсё, унутрымазгавы атэрасклероз. З узростам развіваецца атэрасклероз усіх сасудаў, у тым ліку і сасудаў галаўнога мозга. Лячэннем гэтай паталогіі займаюцца неўролагі. Але лячэнне будзе толькі дапаможнае, яно прынясе пэўную палёгку, але, на жаль, зусім вылечыць гэту хваробу немагчыма.

☎ — Аляксандр, Чачэрск. 68 гадоў. Інвалід II групы. Восем месяцаў таму перанёс інсульт, быў паралізаваны. Цяпер спрабую аднаўляцца, але асаблівых зрухаў няма, ногі апухлі, болі ў спіне і галаве, пастаянна хіліць на сон. Куды звяртацца, каб мне дапамаглі?

— Магчыма, прычынай інсульту было звужэнне сонных артэрый. Таму я рэкамендую вам прайсці ўльтрагукавое даследаванне сонных артэрый. Калі яго вынікі пакажуць, што ёсць звужэнне, сасудзістыя хірургі зробяць аперацыю, пачысцяць гэтыя артэрыі. Трэба, каб вас накіравалі ў Гомельскую абласную бальніцу на кансультацыю.

☎ — Бабруйск, Юрый Васільевіч. Сёлета жонка прайшла абследаванне сонных артэрый, выяўлена іх звужэнне на 66 працэнтаў. Як лячыцца, ці існуюць немедыкаментозныя метады?

— Пры такім высокім працэнце звужэння існуюць хірургічныя метады, пры якіх выдаляюць бляшкі, чысцяць артэрыі. Аперацыя даволі складаная, але яе паспяхова робяць у Магілёве.

☎ — Алена Іванаўна, Лідскі раён, 60 гадоў. У мяне атэрасклераты кардыяскероз, артэрыяльная гіпертэнзія. Баляць галава, ногі. Скажыце, дзе можна праверыць стан сасудаў і як не дапусціць інсульту?

— Спачатку прайдзіце абследаванне па месцы жыхарства. Лячэннем атэрасклерозу займаецца ваш участковы тэрапеўт, які павінен прызначыць кансерватыўнае лячэнне. Калі ж нешта будзе незразумела, трэба ўзяць накіраванне ў Гродзенскую абласную бальніцу, дзе ёсць сасудзістае аддзяленне. Першае, што там зробяць — гэта ўльтрагукавое даследаванне сасудаў, шыі ў тым ліку. Калі выявіцца, што ёсць звужэнне і бляшкі ў сонных ці пазваночных артэрыях, то ваш далейшы лёс будзе вырашаць сасудзісты хірург. Менавіта каб не дапусціць інсульту і робіцца даследаванне шыі.

☎ — Маладзечанскі раён, Наталля. Бацьку 47 гадоў, перанёс гемарагічны інсульт. Яго прааперыравалі ў Мінскай абласной бальніцы. Левая палова была паралізавана. Цяпер нага аднаўляецца, рука — горш. Ці магчыма яму трапіць на рэабілітацыю ў Аксакаўшчыну?

— З гэтым пытаннем трэба звярнацца да рэабілітолагаў. У кожным раёне ёсць такія спецыялісты, і яны накіроўваюць хворага на рэабілітацыю, у тым ліку і ў Аксакаўшчыну.

☎ — Мая Іванаўна, Чашніцкі раён. 54 гады. Пастаянна і вельмі моцна баліць галава, ніякія лекі не дапамагаюць. Як быць?

— Вам трэба прайсці агляд у неўролага ў Віцебску і зрабіць ультрагукавое даследаванне сасудаў шыі. Пасля гэтага будзе вырашацца пытанне далейшых кансультацый. У Віцебскай абласной бальніцы ёсць цудоўныя ўмовы для абследавання. Бярыце туды накіраванне.

Святлана БАРЫСЕНКА, Вольга ШАЎКО.
(Працяг будзе.)

Радавыя Перамогі: пытальнік

У АРХІЎ ВЕТЭРАНУ ЎСЁ АДНО ДАВЯДЗЕЦЦА ЗВЯРТАЦЦА...

На пачатку чэрвеня 1944 года бацька быў мабілізаваны ў Чырвоную Армію. З гэтага часу і па люты 1945 года ваяваў у складзе 3-й мінамётнай роты 346-га стралковага палка 63-й дывізіі (5-й арміі) 3-га Беларускага фронту. Браў удзел у вызваленні Прусіі. На пачатку 1945 года быў узнагароджаны ордэнам Славы III ступені. Але ў сувязі з раненнем 18 лютага ўзнагарода не была ўручана. Пасля заканчэння вайны бацька са шпіталя паехаў дадому. У тым жа 1945 годзе сюды прыйшла папера на ўручэнне ордэна, аднак бацька не паехаў яго атрымліваць... Далей было доўгае сумленнае жыццё, заканчэнне Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута з дыпломам з адзнакай, праца галоўным аграномам у эксперыментальных базах.

За гэты час бацька ніколі не звяртаўся па пасведчанне ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны, хоць я яму колькі разоў прапаноўваў. Цяпер ён захварэў і захацелася яму таго пасведчання. Схадзіў я ў ваенкамат. (А захавалася толькі адзнака ў ваенным білеце, што ён удзельнічаў у баявых дзеяннях.) Там сказалі, што гэтага недастаткова, што трэба пісаць запыты ў архіў Міністэрства абароны і Дзяржаўны архіў Расіі. А адказы ідуць у сярэднім два гады. Можа, рэдакцыя магла б узяцца за гэтую справу, каб паскорыць працэс? Каб бацьку далі пасведчанне ўдзельніка вайны, а яшчэ б было цудоўна — і каб ордэн уручылі?..

Аляксандр Іосіфавіч МАРЦУЛЬ,
в. Рэзы Шчучынскага раёна.

Практычна кожны з апошніх гадоў з набліжэннем Свята Перамогі і дня вызвалення Беларусі рэдакцыя атрымлівае падобныя лісты. І прыкра, што іх становіцца ўсё менш...

З іншага боку, і тут таксама цікава, дапамагчы ў такіх сітуацыях ветэранам цяпер надзвычай цяжка: прайшло столькі гадоў... Хоць бываюць і шчаслівыя выключэнні, ды і архівы яшчэ, нягледзячы на доўгую пошукавую і даследчую работу, напэўна, хаваюць шмат таямніц.

Адзінае, удзельнікі Вялікай Айчыннай не могуць доўга чакаць...

А ў архіў у расійскім Падольску ветэрану ўсё адно, калі ён хоча атрымаць пасведчанне ўдзельніка вайны, гэтак жа як і адшукаць пацвярджэнне наконт узнагароджання ордэнам (на першым этапе важна менавіта гэта) давядзецца звяртацца. Прычым асабіста, так што, на жаль, рэдакцыя тут дапамагчы не зможа пры ўсім жаданні. Гэта нам у чарговы раз пацвердзілі супрацоўнікі «ўзнагароднага» аддзела галоўнага ўпраўлення кадраў Міністэрства абароны краіны.

Адзнакі ў ваенным білеце сапраўды недастаткова. Патрэбна архіўная даведка аб праходжанні службы падчас вайны ў складзе дзейнай арміі.

У запыце трэба паведаміць як мага больш інфармацыі пра сябе: перыяды праходжання службы ў вайсковых часцях, іх нумары і інш. Можна будзе даслаць і ксеракопію таго ж ваеннага білета. «Звяздзе» ўдакладнілі, што апошнім часам адказы з Падольска пачалі прыходзіць хутчэй — недзе праз паўгода. Вядома ж, калі патрэбныя звесткі ў архіве маюцца або іх пошук не абцяжараны. Скажам, ён можа весціся па спісах узнагароджаных у алфавітным парадку, дзе маюцца прозвішчы і імёны, месцы жыхарства. Такім чынам можна адшукаць сведчанне таго, што канкрэтны чалавек быў узнагароджаны, але сама ўзнагарода яму не была ўручана. Пасля пацвярджэння гэтага факта можна будзе распачынаць пошукі і самога ордэна, зразумела, калі ён захаваўся ў архівах...

Сяргей РАСОЛЬКА.

Доктар адкажа

Дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:

5 мая — галоўны ўрач Мінскага гарадскога кардыялагічнага дыспансэра Васіль Леанідавіч АЛЯШКЕВІЧ.

6 мая — галоўны ўрач Мінскага гарадскога эндакрыналагічнага дыспансэра Ірына Канстанцінаўна БІЛАДЗІД.

7 мая — галоўны ўрач Мінскага гарадскога анкалагічнага дыспансэра Зігмунд Эдуардавіч ГЕДРЭВІЧ.

8 мая — галоўны ўрач 3-й дзіцячай паліклінікі г. Мінска Наталля Анатольеўна КЛІМОВІЧ.

Мексіканскіх турыстаў у Беларусі мала

Беларускія турфірмы практычна не афармляюць пуцёўкі ў Мексіку, ды і мексіканскіх турыстаў у нашай краіне кот наплакаў.

Як паведамілі ў дэпартаменце турызму Міністэрства спорту і турызму Беларусі, толькі 17 мексіканскіх турыстаў пабывалі ў Беларусі ў 2007 годзе і 9 — у 2008-м. У сваю чаргу, па пуцёўках беларускіх турыстычных фірмаў Мексіку за апошнія два гады наведалі толькі 17 беларускіх турыстаў (у 2007-м — 12, у 2008 — 5). Варта ўдакладніць, што ў беларусаў ёсць магчымасць набыць турыстычную пуцёўку ў Маскве ў расійскіх тураператараў.

«Мінск—Навіны».

ПРЫЁМНЫ ЧАС УРАЧА ПРЫЗНАЧАНЫ ТОЛЬКІ ДЛЯ ПАЦЫЕНТАЎ

Упарадкаваць наведванне арганізацый аховы здароўя прадстаўнікамі фармацэўтычных фірмаў вырашыла Міністэрства аховы здароўя — адпаведны ліст за подпісам міністра аховы здароўя Васіля Жарко атрымалі начальнікі ўпраўленняў аховы здароўя аблвыканкамаў, старшыня Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама і кіраўнікі рэспубліканскіх арганізацый аховы здароўя.

Цяпер усе наведванні работнікамі фармацэўтычных фірмаў медыцынскіх устаноў і распаўсюджванне імі рэкламных матэрыялаў могуць ажыццяўляцца толькі па ўзгадненні з яго кіраўніком. А для таго, каб урачы ўсё ж такі атрымлівалі карысную інфармацыю аб новых лекавых сродках, прапануецца задзейнічаць для гэтага вытворчыя нарады, канферэнцыі і «пяціхвілінкі». Галоўнае, каб прамоўтары не адцягвалі ўвагі ўрача ад пацыентаў.

У Міністэрстве аховы здароўя і раней не хавалі сваёй заклапочанасці не заўсёды этычным прасоўваннем сваёй прадукцыі замежнымі кампаніямі, якая выяўлялася ў прамым ці ўскосным стымуляванні ўрачоў і фармацэўтычнымі работнікаў, каб тыя пры прызначэнні і выдачы рэкамендацый захоўвалі інтарэсы толькі пэўных вытворцаў. Але ў такой «звышактыўнасці» фармацэўтычных кампаній быў і яшчэ адзін малапрыемны бок: пацыенты пачалі скардзіцца ў міністэрства, што візіты прадстаўнікоў фарміндустрыі адбіраюць ва ўрача той час, які медыцынскі работнік павінен быў выдзяліць для стасункаў з пацыентамі. Не сакрэт, што ўрачы пярвічнага звяна і так літаральна задыхаюцца ад нагрузак. Таму для пацыентаў увядзенне абмежавальных мераў на наведванне фармацэўтычнымі прадстаўнікамі ўрачоў падчас прыёмных гадзін адназначна пойдзе на карысць. Але многія медыкі негатыўна паставіліся да ўвядзення забароны, хоць бы таму, што інфармацыю аб усіх навінках у галіне фармакалогіі яны атрымлівалі раней менавіта ад фармвытворцаў. З-за сваёй загружанасці радавыя ўрачы не маюць часу, каб чытаць спецыялізаваную літаратуру, між іншым, фармакалагічная галіна імклівa развіваецца. Цяпер ім застаецца спадзявацца на службу клінічных фармаколагаў, якая пачала стварацца ў Беларусі.

Дарэчы, у Польшчы ўвядзенне аналагічнай забароны прывяло да таго, што скаргі пачалі пісаць самі ўрачы, спрабуючы адстаяць свае правы на атрыманне карыснай інфармацыі, не выходзячы з уласнага кабінета...

Надзея НІКАЛАЕВА.

ГОДОВОЙ БАЛАНС за 2008 год

ОАО «СЛАВЯНСКИЙ СОЮЗ»

г. Орша, ул. Замковая, д. 11, к. 1

	Актив	млн руб.		Пассив	млн руб.
1.	Основные средства	2	1.	Уставный фонд	26
2.	Запасы и затраты	23	2.	Добавочный фонд	1233
3.	Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам	3	3.	Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	-140
4.	Дебиторская задолженность	6	4.	Краткосрочные кредиты и займы	141
5.	Финансовые вложения	1230			
6.	Денежные средства	41	5.	Кредиторская задолженность	45
	Баланс	**1305**		**Баланс**	**1305**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2008 год

Наименование показателей	млн руб.
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку)	293
Себестоимость реализации товаров, продукции, работ, услуг	306
Прибыль (убыток) от реализации	-13
Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы)	17
Операционные расходы	17
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов	-
Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы)	7
Внереализационные расходы	13
Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов	-6
Прибыль (убыток) за отчетный период	-19
Налоги и сборы, производимые из прибыли	-
Расходы и платежи из прибыли	1
Прибыль (убыток) к распределению	-20

* Количество акционеров: всего — 82, в том числе юридических лиц — 2, физических лиц — 80.

УНП 300257402

УВЕДОМЛЕНИЕ АКЦИОНЕРОВ

На основании решения Общего собрания акционеров от 29 апреля 2009 года о реорганизации ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло» уведомляет акционеров о возникновении у них права требовать от Общества выкупа принадлежащих им акций в связи с реорганизацией Общества.

Письменное требование акционера о выкупе принадлежащих ему акций должно быть предъявлено не позднее 30 дней с даты опубликования настоящего объявления. Такие требования принимаются от акционеров, которые не принимали участие в общем собрании, на котором было принято решение о реорганизации Общества.

Выкуп акций Общества осуществляется в период с 10 июня по 10 июля 2009 года.

Цена выкупа акций утверждена общим собранием акционеров и составляет 9586 рублей. Оплата акций производится денежными средствами.

Акции, выкупленные по требованию акционеров, подлежат аннулированию в соответствии с законодательством о ценных бумагах.

Наблюдательный Совет ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло».

УНП 100010116

Жывая зямля

НЯБЕСНЫЯ ПАТРУЛІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Камандзір самалёта АН-2 пілот Сяргей БАРАНАЎ — удзельнік манеўраў па ліквідацыі гарачых кропак.

Самалёт АН-2 МНС «Беллесавія» здольны выліць на ляту 2 тоны вады на месца ўзгарання.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Пажарныя-дэсантнікі дэманструюць хуткі спуск з борта верталёта на месца ляснога пажару.

Пажарныя МНС ліквідуюць небяспеку.

ЛЯСЫ КРАІНЫ ПАД ПАГРОЗАЙ ПАЖАРАЎ

Цёплае надвор'е і працяглая адсутнасць дажджоў, а таксама масавы веснавы выезд грамадзян на адпачынак на прыроду паставілі лясы пад пагрозу пажараў. Па стане на 29 красавіка ў лясным фондзе ўжо зафіксаваныя 574 лясныя пажары, у выніку якіх пацярпела больш за 1 тысячу гектараў лесу. Прычым, 813 гектараў былі пашкоджаны агнём за апошнія выхадныя дні — 25-28 красавіка. Асноўная прычына пажараў — парушэнне патрабаванняў пажарнай бяспекі ў лясах. Пасля адпачынку людзі пакідаюць непатушаныя вогнішчы, у многіх выпадках агонь перакідваецца на лес з палеткаў ці дачных участкаў, на якіх выпальвалі сухую расліннасць.

Найбольшая колькасць выпадкаў узгарання ў лясах адбылася ў паўднёвых абласцях краіны, дзе ўсталявалася больш спякотнае і сухое надвор'е. У прыватнасці, толькі ў Гомельскай вобласці за выхадныя дні полымя прайшлося па 660 гектарах лесу.

Дзяржаўная лясная ахова Мінлясгаса працуе ва ўзмоцненым кругласутачным рэжыме. Задзейнічаны ўсе пажарныя разлікі і спецыяльная супрацьпажарная тэхніка, што ёсць у лясніцтвах. Да тушэння пажараў прыцягваюцца сілы МНС. Каб папярэдзіць узнікненне лясных пажараў, арганізацыі Міністэрства лясной гаспадаркі выходзяць з хадайніцтвамі ў мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы аб прыняцці імі рашэнняў аб забароне знаходжання грамадзян у лясах у перыяд высокай пажарнай небяспекі.

Адначасова варта нагадаць, што парушэнне патрабаванняў пажарнай бяспекі ў лясах ці на тарфяніках, што пацягнулі знішчэнне ці пашкоджанне лесу або тарфянікаў, цягне накладанне штрафу ў памеры ад 875 тысяч да 1 750 тысяч рублёў. А за распальванне вогнішчаў у забароненых месцах можна атрымаць папярэджанне ці штраф у памеры да 420 тысяч рублёў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.24	20.50	15.26
Віцебск —	5.08	20.45	15.37
Магілёў —	5.14	20.40	15.26
Гомель —	5.16	20.31	15.15
Брэст —	5.40	21.04	15.24
Гродна —	5.46	20.59	15.13

Месяц

Поўня.
Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Аляксандры, Анатоля, Георгія.*
К. *Паўліны, Антона, Арцёма, Георгія, Эдуарда.*

Фота Наталлі НІКАЛАЙЧУК

НАДВОР'Е на заўтра



СКАНВОРД + СУДОКУ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.



Адтуліна ў лёдзе для лоўлі рыбы (на фота А. Клешчука — браслаўскі рыбак).

1		7	5					
5		8	3	7			6	4
						9		
	3	6						9
		9	4		5	8		
7						6	4	
		4						
9	7			2	6	4		1
					4	2		6

СУДОКУ. У квадраце з 9 на 9 клетак трэба размясціць лічбы ад 1 да 9 уключна такім чынам, каб у кожным гарызантальным радку, кожным вертыкальным слупку, а таксама ў кожным малым квадраціку 3 на 3 клеткі, абмежаваным тлустай лініяй, кожная лічба сустракалася толькі адзін раз, без паўтораў.

ПАРАДА ПАЧАТКОЎЦАМ. **Спачатку паглядзіце на рады, слупкі і блокі 3х3 з найбольш запоўненымі квадратамі. Лягчэй рашыць там, дзе выбар лічбаў меншы.**

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (23 красавіка). Па гарызанталі: Залева. Здача. Ранг. Кобза. Сок. Урна. Адрас. Іван. Сколак. Лякала. Ані. Мулінэ. Палуда. Лато. Рух. Асот. Дэкада. Кумір. Зурна. Тор. Лоцман. Амаці. Зуб. Галета. Яда. Грыльяж. Задатак. **Па вертыкалі:** Валынка. Амерыка. Бакал. Лама. Івасі. Арлан. Торт. Эрот. Сак. Зраза. Вадарод. Муляж. Акра. Абед. Чан. Таз. Яга. Гуслі. Даліна. БАТЭ. Аніка. Куц. Авантура. Алі. Дудка. Вена. Даха. Наждак.

Сканворд (25 красавіка). Па гарызанталі: Дранікі. Анёл. Спас. Цынік. Мел. Атам. Акорд. Рала. Прыбой. Кракет. Сакэ. Раскат. Сутана. Ірга. Вал. Марс. Барана. Шашлык. «Яма». Бал. Тайфун. Атара. Гар. Самалі. Апак. Кабінет. Галушкі. **Па вертыкалі:** Блінцы. Пранішнікаў. Нарыс. Імша. Карал. Кобра. Грыб. Траска. Май. Лага. Адсек. Тамат. Іон. Плоў. Арап. Ёта. Лаг. Фол. Садко. Батаніка. Мука. Тарас. Рой. Макарава. Лек. Нанду. Гватэмала. Нізамі.

Сканворд (30 красавіка). (25 красавіка). Па гарызанталі: Феерверк. Флякі. Шпак. Смага. «Ака». Арап. Талаш. Перу. Ракетка. Прараб. Кабо. Цэнзар. Калчан. Скат. Ані. Тора. Сподак. Званар. Філе. Туш. Каскад. Апука. Фін. Дантэс. Сыр. Гваздзік. Арктыка. **Па вертыкалі:** Дэманстрацыя. Завея. Аркан. Стан. Закон. Астра. Арат. Ратару. Ата. Шафа. Валошка. Пінск. Паля. Унты. Каа. Эра. Ксі. Кашпо. Секанс. Карп. Апак. Отс. Опера. Чад. Раб. Анапа. Суботнік. Дакука.

POST factum

«Матч згоды і прымірэння» завяршыўся пяццю выдаленнямі

Матч футбольнага чэмпіянату бразільскага штата Рыу-Грандэ-ду-Сул паміж клубамі «Жувентудэ» і «Кашыяш», які адбываўся пад знакам прымірэння варагуючых фанацкіх груповак камандаў, завяршыўся... пяццю выдаленнямі.

Як паведамляе тэлеканал Eurosport, перад матчам дзвюх камандаў горада Кашыяш у імя згоды і прымірэння быў арганізаваны адмысловы «сяброўскі сняданак» з удзелам лідараў фан-рухаў, прадстаўнікоў мясцовай паліцыі і кіраўніцтва клубаў.

Першы тайм матча прайшоў без істотных здарэнняў. Усё самае цікавае пачалося пасля перапынку. Адкрыў рахунак чырвоным карткам галоўны трэнер «Жувентудэ» Жылмар Ізер, які на пачатку тайма вырашыў аспрэчыць судзейскае рашэнне ў асабістай гутарцы з рэферы, для гэтай мэты накіраваўшыся на поле.

Гэтая выхадка да крайнасці абурыла яго візаві — трэнера супернікаў Аргеля Фукса, які свае эмоцыі прыняўся выліваць на рэзервовага арбітра. Фукс таксама ўбачыў перад сабой чырвонае святло, ад чаго раззлаваўся яшчэ больш. Настаўніка «Кашыяша» давялося выводзіць са стадыёна пры дапамозе паліцыі. Дзеля гэтай працэдуры гульня была прыпынена на шэсць хвілін. Пасля аднаўлення матчу жарсці не аціхлі. «Жувентудэ» завяршыў сустрэчу ўдзевяцёх — кампанію не ў меру гарачым трэнерам склалі Алекс Мараіш і галкіпер Рэнан. «Кашыяш» пасля фінальнага свістка, у сваю чаргу, недалічыўся аднаго гульца, выправаджанага з поля за ўдар суперніка.

Ну а сама гульня завяршылася перамогай «Кашыяша», які ў другім тайме яшчэ і паспеў правесці два галы.

Расійскія маракі адбілі напад самалійскіх піратаў з вадамётаў

Расійскія маракі без усялякай падтрымкі адбілі напад самалійскіх піратаў. Напад на танкер з расійскімі маракамі, які ішоў пад сцягам Маршалавых астравоў, адбыўся ў Адэнскім заліве яшчэ 19 красавіка, аднак пра тое, што экіпаж танкера складаўся з расіян, стала вядома толькі на днях.



Маракі з Находкі пераганялі новы танкер Handytankers Magic з Кітая ў Еўропу. У небяспечнай зоне побач з Самалі маракі заўважылі судна пад чорным сцягам і паспелі падрыхтавацца да сустрэчы няпрошаных гасцей. Экіпажу судна з дапамогай воданапорных сістэм пажаратушэння ўдалося адбіць напад піратаў, пасля чаго танкер даў самы поўны ход і пачаў манеўраваць. Праз некаторы час піраты адмовіліся ад пераследу. Зараз судна рухаецца да пункта прызначэння. Ніхто з членаў яго экіпажа не пацярпеў.

Хто сказаў, што зморшчыны — гэта добра?

Станоўчы адказ далі брытанскія медыкі. Яны высветлілі, што зморшчынкі, прычына пастаянных засмучэнняў жанчын, абараняюць іх самі ад раку скуры.

Адкрыццё вучонымі гэтага факта адбылося выпадкова. Падчас шматлікіх аперацый па выдаленні раку скуры — карцыёмы — медыкі звярнулі ўвагу на тое, што практычна ўсе апэрыраваныя жанчыны мелі гладкую скуру на твары, без зморшчынкаў.

Даследчыкам давялося вывучыць вялізную колькасць гісторый хваробаў пацыентак, узрост якіх у асноўным складаў 70 гадоў, каб зразумець, што калі ступень пакрыцця скуры твару і іншых частак цела заморшчынамі вялікая, то такія жанчыны ў два разы радзей захворваюць на рак скуры, чым тыя, хто мае скуру гладкую і прыгожую. Чым гэта выклікана, сёння, на жаль, медыкі зразумець пакуль не могуць.

Зямлянам пагражае «ідэальная сонечная» бура

Сур'ёзная тэхнагенная катастрофа можа адбыцца ў верасні 2012 года. Да такой высновы прыйшоў навуковы калектыў з амерыканскай Нацыянальнай акадэміі навук, якія вывучаюць «паводзіны» Сонца.

Паводле іх меркавання, піша газета «Дейлі мэйл», у верасні 2012 года на Зямлю можа абрушыцца так званая «ідэальная сонечная» электрамагнітная бура. Паток іанізаваных часціц з сонечнай кароны, які ўзнікае ў выніку гіганцкіх ядзерных выбухаў на нашым свяціле, пастаянна атакуе Зямлю. Аднак атмасфера і магнітнае поле нашай планеты ў большасці выпадкаў эфектыўна абараняюць яе. Але на максімуме сваёй актыўнасці Сонца здольнае «прарываць» натуральныя ахоўныя сродкі Зямлі. У выніку можа быць паралізаваная электраэнергетычная сістэма на планеце, знішчана камп'ютарная тэхніка, адбудуцца аварыі на асноўных аб'ектах жыццядзейнасці. Як інфармуе ITAR-ТАСС, услед за «ідэальнай сонечнай» бурай наступіць працяглы эканамічны крызіс, наступствы якога цяжка прадбачыць.

Вучоныя растлумачылі цягу да любімага кубка

Брытанскія вучоныя выявілі прычыну, па якой людзі імкнуцца выкарыстоўваць для ранішняй кавы або гарбаты адзін і той жа кубак. Прыхільнасць да пэўнай пасудзіны тлумачыцца ўнутраным запатрабаваннем у захаванні звыклага рытуалу.

Чай і кава ўтрымліваюць кафеін, які выклікае прывыканне, і чалавек, які «залежыць» ад гэтых напояў, не толькі не ўяўляе пачатак новага дня без іх, але і падсвядома імкнецца замацаваць сам спосаб іх прыёму. Так выпрацоўваецца вызначаны рытуал, захаванне якога з'яўляецца неабходным для атрымання поўнага задавальнення ад такога «злоўжывання».

Як лічыць псіхолаг Том Стэфард, ужыванне, скажам, наркотыкаў і ўзнікненне пэўнага для гэтага рытуалу цесна звязана адно з адным. Таму гарбата або кава, выпітыя з любімага кубка, падаюцца людзям смачнейшымі. Ідэю вучонага пацвярджае даследаванне, падчас якога высветлілася, што 65 працэнтаў брытанцаў выкарыстоўваюць для ранішняга напою адзін і той жа кубак.

Макіяж карысны для пажылых жанчын

Як высветлілі французскія вучоныя, рэгулярнае нанясенне касметыкі выконвае функцыю комплексу практыкаванняў для паляпшэння кардынацыі рухаў і канцэнтрацыі ўвагі, што асабліва важна для пажылых жанчын.

Паводле вынікаў даследавання жанчын ва ўзросце 65-85 гадоў, прадстаўленага на Сусветным кангрэсе геранталогіі ў Парыжы, тыя жанчыны, якія наносілі макіяж штодня, вызначаліся лепшай каардынацыяй рухаў, лягчэй захоўвалі раўнавагу і радзей падалі. А тым дамам, якія карысталіся касметыкай толькі зрэдку, захоўваць раўнавагу ўдавалася больш цяжка, паведамляе газета The Guardian.

Французскія вучоныя адзначаюць важнасць «касметычнай гімнастыкі» для пажылых жанчын, для якіх выпадковае падзенне можа прывесці да траўмаў, небяспечных для жыцця. Так, пералом шыйкі сцягна ў людзей пасля 65 гадоў у 20 працэнтах выпадкаў прыводзіць да смерці на працягу года.

У даследаванні вучоных з універсітэта Святога Эцьена ў Францыі ўзялі ўдзел 200 жанчын ва ўзросце ад 65 да 85 гадоў.

6 мая

Дзве даты

1904 год — 105 гадоў таму нарадзіўся выдатны беларускі паэт Паўлюк Трус, якога невыпадкова называюць «паэтам беларусізацыі» — у такі час ён жыў і тварыў. З'яўляўся сябрам літаратурнага аб'яднання «Маладняк», пры жыцці выйшлі толькі два яго зборнікі — «Вершы», «Ветры буйныя». Кнігі выбраных твораў неаднаразова перавыдаваліся ў Беларусі ў 30—80-х гадах. Памёр у 1929 годзе ад тыфу.

1758 год — нарадзіўся Максімільян Рабесп'ер, французскі адвакат, лідар і ахвяра Вялікай Французскай рэвалюцыі.

Цытата дня:

«Усе нашы скаргі наконт таго, чаго мы не маем, бываюць ад недахопу ўдзячнасці за тое, што ў нас ёсць».

Даніель Дэфо (1660—1731), англійскі пісьменнік.

ЮРАЙ ВЯСНОВЫ, ЮР'Е-ЯГОР'Е, ЮРАЙ, ЯГОРЫ, ГЕОРГІ

Свет і сузор'е Чалавека

Калі вада ў рацэ прыбывае да Юр'евага дня, то лета будзе спякотнае, з рэдкімі дажджамі.
Ягорый з цяплом — Мікола (22 мая) з кормам.
Ягорый з вадой (расой) — Мікола з травой.

Святы Георгій Перамаганосец у хрысціянскім свеце ўшаноўваецца як ахоўнік земляробства і жывёлагадоўлі. У дахрысціянскія часы папярэднікам Георгія (Юрая, Ягорыя) ва ўсходніх славян быў бог Ярыла. Некалі яго звалі «Цар Лесу» і прыносілі ахвяраванні, каб ён захаваў хатнюю жывёлу ад ваўкоў. Сяляне верылі, што святы Ягорый, нябачны для людзей, раніцай едзе ў поле на сваім белым кані і пасвіць статак, ахоўвае яго ад драпежных звяроў, над якімі ён таксама валадарыць: «Усе звяры, уся жывёла ў Ягорыя пад рукой», «Без Юр'ева загаду і шэры сыты не будзе».

- Пасля зімы на Ягорыя жывёлу першы раз гналі на поле.
- Лічылася, што той, хто ў дзень святога Ягорыя першым паспее выгнаць жывёлу ў поле, той увесь год будзе з малаком.
- Юрый — свята пастухоў. Іх частавалі ў полі яечняй, адорвалі палотнамі, адзеннем і грашыма. Часам іх аблівалі халоднай вадой, каб пастух не спаў летам, а пільна даглядаў жывёлу.
- У першы дзень выпасу жывёлы пастух павінен быў абысці ўвесь статак тройчы па сонцы, прытрымлівацца ўвесь дзень посту і не браць з сабой нож і плётку.
- У народнай культуры існавала няпісанае правіла: ні адзін пастух не возьме новую карову ў статак пасля Юрая, інакш увесь статак будзе пакутаваць ад нападаў ваўкоў.
- Сачылі за тым, каб у гэты дзень ніхто нічога не знёс з двара, нічога не пазычалі і не аддавалі. Лічылася, што любая рэч, узятая ў гэты дзень, пры пэўных рытуальных дзеяннях «перацягне дабрабыт» (г.зн. прыбытак, малако і г.д.) у сваю гаспадарку.
- У гэты дзень наведвалі палеткі. Аглядаць азімыя прыходзілі з караваем, клалі яго на зямлю, і калі ён хаваўся ў жыце, то ўраджай абяцаў быць добрым.
- У гэты дзень раніцай трэба было абавязкова пакачацца па траве, бо «Юр'ева раса ад сурокаў, ад сямі немачаў». Такія дзеянні прадказвалі здароўе на ўвесь год: «быць здаровым, як Юр'ева раса».
- 6 мая — дзень, калі адкупляюцца ад няшчасцяў і хваробаў. Таму нельга што-небудзь падымаць на дарозе ці скрыжаванні дарог.
- Калі дзяўчына доўгі час не магла выйсці замуж, на Юрая трэба было абавязкова адчыніць усе замкі і запоры.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

У гэты цудоўны вясновы дзень сардэчна віншуем **Ігара Мікалаевіча АСІНСКАГА** з Мінска **з юбілеем**.
Хай шчасце і радасць, моцнае здароўе і цудоўны настрой будуць спадарожнікамі твайго жыцця.

Тых гадоў шкада, вядома,
Што пакінуў за спіной,
Але ты зацуглі стому,
Трызні новаю вясной.

Не давайся ты адчаю
Як туга ні набяжыць,
Мы табе дабра жадаем
І жадаем доўга жыць!

Родныя.

Усміхнёмся!

— У вас піражкі свежыя?
— Свежыя, свежыя, яны ў нас даўно свежыя!

☺

Учора ўначы да Дар'і Данцовай і Таццяны Усцінавай з'явіліся здані Агаты Крысці і Артура Конан-Дойля. Бесцялесныя істоты доўга і нецэнзурна лаяліся.

☺

Сёння кашулю праса-ваў... З'явілася непераадольнае жаданне ажаніцца.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.444 Індэкс 63850. Зак. № 2385. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12